ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Выдаецца з 1932 г.
№ 4 (2583)
28 студзеня 1972 г.
ПЯТНІЦА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ НА ШАСНАЦЦАЦІ СТАРОНКАХ

Цана 8 кап.

У ЦЭНТРАЛЬНЫМ КАМІТЭЦЕ КПСС

АБ ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЙ КРЫТЫЦЫ

ЦК КПСС прыняў пастанову «Аб літаратурна-мастацкай крытыцы». У ёй адзначаецца, што партыйныя камітэты, установы культуры, творчыя саюзы, органы друку накіроўваюць актыўныя намаганні на рэалізацыю ўказанняў XXIV з'езда КПСС аб павышэнні ўзроўню літаратурна-мастацкай крытыкі. Задачы крытыкі абмеркаваны на з'ездах, пленумах, сходах мастацкай інтэлігенцыі. Больш пачало публікавацца змястоўных артыкулаў, прасякнутых клопатамі аб далейшым развіцці мастацтва сацыялістычнага рэалізму.

Разам з тым у пастанове ЦК КПСС указваецца, што стан крытыкі пакуль не адпавядае ў поўнай меры патрабаванням, якія вызначаюцца ўзрастаючай роллю мастацкай культуры ў камуністычным будаўніцтве. Недастаткова глыбока аналізуюцца працэсы развіцця савецкай літаратуры і мастацтва, узаемаўзбагачэння і збліжэння культур сацыялістычных нацый. Многія артыкулы, агляды, рэцэнзіі маюць павярхоўны характар, вызначаюцца невысокім філасофскім і эстэтычным узроўнем, сведчаць аб няўменні суадносіць з'явы мастацтва з жыццём. Да гэтага часу ў крытыцы праяўляюцца прымірэнцкія адносіны да ідэйнага і мастацкага браку, суб'ектывізм, прыяцельскія і групавыя прыхільнасці. Часам публікуюцца і такія матэрыялы, у якіх даецца няправільны малюнак гісторыі савецкага і дарэвалюцыйнага мастацтва, прадузята ацэньваюцца асобныя мастакі і творы. Крытыка ўсё яшчэ недастаткова актыўная і паслядоўная ва ўсталяванні рэвалюцыйных, гуманістычных ідэалаў мастацтва сацыялістычнага рэалізму, у выкрыцці рэакцыйнай сутнасці буржуазнай «масавай культуры» і дэкадэнцкіх плыняў, у барацьбе з рознага роду немарксісцкімі поглядамі на літаратуру і мастацтва, рэвізіянісцкімі эстэтычнымі канцэпцыямі.

Партыйныя камітэты, міністэрствы і ведамствы, творчыя саюзы яшчэ не забяспечваюць належнага кантролю за крытыка-бібліяграфічнай дзейнасцю падведамных органаў друку, выдавецтваў, адпаведных рэдакцый тэлебачання і радыё, слаба выкарыстоўваюць сродкі масавай інфармацыі для мэтанакіраванага ідэйна-эстэтычнага выхавання працоўных, для прапаганды лепшых дасягненняў шматнацыянальнага савецкага мастацтва.

Рэдакцыі шэрагу газет і часопісаў не заўсёды патрабавальныя да ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню крытычных артыкулаў. Істотныя недахопы ёсць у практыцы рэцэнзавання. Публікуемыя рэцэнзіі нярэдка маюць аднабаковы характар, змяшчаюць неабгрунтаваныя кампліменты, зводзяцца да беглага пераказу зместу твора, не даюць уяўлення аб яго рэальным значэнні і каштоўнасці.

Многія кнігі, спектаклі, фільмы, мастацкія выстаўкі, музычныя творы, канцэртныя праграмы наогул застаюцца па-за полем зроку крытыкі. Слаба прыцягваюцца да работы ў друку вядучыя спецыялісты ў галіне марксісцка-ленінскай эстэтыкі, тэорыі і гісторыі мастацтва, майстры савецкай культуры; рэдакцыі не ўдзяляюць дастатковай увагі жанравай разнастайнасці і даходлівасці крытычных матэрыялаў.

У пастанове ЦК КПСС указваецца, што кіруючыя органы творчых саюзаў рэдка арганізуюць калектыўныя абмеркаванні наспеўшых праблем мастацкай творчасці, марудна перабудоўваюць работу камісій і саветаў па крытыцы. Не праяўляюцца штодзённыя клопаты аб ідэйным выхаванні і прафесійнай падрыхтоўцы крытыкаў, аб стварэнні ў асяроддзі работнікаў літаратуры і мастацтва абстаноўкі высокай патрабавальнасці, правільных адносін да выступленняў крытыкі.

Недахопы літаратурна-мастацкай крытыкі, адзначаецца ў пастанове, у многім абумоўлены недахопам кваліфікаваных кадраў. Між тым ва універсітэтах і гуманітарных ВНУ не створаны неабходныя ўмовы для спецыялізацыі студэнтаў і аспірантаў у галіне крытыкі, нездавальняюча пастаўлена гэта работа і ў навучальных установах літаратуры і мастацтва. На развіцці крытыкі адмоўна адбіваюцца сур'ёзныя недахопы ў пастаноўцы навукова-даследчай работы, ведамасная раз'яднанасць навуковых і творчых кадраў, адсутнасць належнай каардынацыі ў дзейнасці навуковых устаноў.

Цэнтральны Камітэт КПСС звярнуў увагу ЦК кампартый саюзных рэспублік, крайкомаў і абкомаў КПСС, міністэрстваў і ведамстваў, творчых саюзаў, кіраўнікоў органаў друку, выдавецтваў, тэлебачання і радыё на неабходнасць павышэння ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню літаратурна-мастацкай крытыкі, яе актыўнасці і прынцыповасці ў правядзенні лініі партыі ў галіне мастацкай творчасці.

Абавязак крытыкі,— падкрэсліваецца ў пастанове,— глыбока аналізаваць з'явы, тэндэнцыі і заканамернасці сучаснага мастацкага працэсу, усямерна садзейнічаць умацаванню ленінскіх прынцыпаў партыйнасці і народнасці, змагацца за высокі ідэйна-эстэтычны ўзровень савецкага мастацтва, паслядоўна выступаць супраць буржуазнай ідэалогіі. Літаратурна-мастацкая крытыка заклікана садзейнічаць расшырэнню ідэйнага кругагляду мастака і ўдасканаленню яго майстэрства. Развіваючы традыцыі марксісцка-ленінскай эстэтыкі, савецкая літаратурна-мастацкая крытыка павінна спалучаць дакладнасць ідэйных вцэнак, глыбіню сацыяльнага аналізу з эстэтычнай патрабавальнасцю, клапатлівымі адносінамі да таленту, да плённых творчых пошукаў.

Адпаведным міністэрствам і ведамствам, творчым саюзам прапанавана распрацаваць і ажыццявіць меры па паляпшэнні крытыка-бібліяграфічнай дзейнасці падведамных часопісаў, газет, выдавецтваў, рэдакцый тэлебачання і радыё; умацаваць рэдкалегіі, выдавецкія саветы, рэдакцыі кваліфікаванымі, палітычна сталымі кадрамі, забяспечыць стварэнне няштатнага актыву з ліку аўтарытэтных крытыкаў; прадугледзець формы заахвочвання лепшых работ у галіне літаратурна-мастацкай крытыкі, літаратуразнаўства і мастацтвазнаўства.

ЦК КПСС рэкамендаваў творчым саюзам штодзённа клапаціцца аб ідэйна-тэарэтычным і прафесійным узроўні літаратурна-мастацкай крытыкі, павышаць яе ролю ў вырашэнні задач камуністычнага будаўніцтва, у фарміраванні грамадскай думкі ў барацьбе з чужымі поглядамі і канцэпцыямі. Творчыя саюзы, гаворыцца ў пастанове, павінны быць ініцыятарамі і арганізатарамі абмеркавання актуальных пытанняў мастацкай творчасці, асобных твораў літаратуры і мастацтва, уносіць свой уклад у распрацоўку тэарэтычных праблем сацыялістычнага рэалізму. Трэба палепшыць дзейнасць камісій і саветаў па крытыцы.

Акадэміі навук СССР, міністэрствам, ведамствам прапанавана накіраваць увагу падведамных ім інстытутаў на глыбокае вывучэнне праблем тэорыі і метадалогіі літаратурна-мастацкай крытыкі, актывізаваць намаганні вучоных у даследаванні сучаснага мастацкага працэсу, узаемадзеяння культур краін сацыялістычнай садружнасці. У пастанове ЦК КПСС даюцца рэкамендацыі па паляпшэнні падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне гісторыі і тэорыі літаратуры, кіно, тэатра, музыкі, выяўленчага мастацтва. Маецца на ўвазе прадугледзець у навучальных планах універсітэтаў, педагагічных інстытутаў і спецыяльных вышэйшых навучальных устаноў неабходныя магчымасці для факультатыўнай спецыялізацыі студэнтаў і аспірантаў па праблемах літаратурна-мастацкай крытыкі. Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС даручана палепшыць і расшырыць падрыхтоўку на базе акадэміі кваліфікаваных спецыялістаў у галіне тэорыі літаратуры і мастацтва і літаратурна-мастацкай крытыкі.

З мэтай далейшага паляпшэння крытыка-бібліяграфічнай справы і прапаганды мастацкай літаратуры прызнана мэтазгодным стварыць масавы літаратурна-крытычны і бібліяграфічны часопіс.

Важнай задачай партыйных камітэтаў, гаворыцца ў пастанове ЦК КПСС, з'яўляецца ўзмацненне дапамогі міністэрствам і ведамствам, творчым саюзам, органам друку, тэлебачання і радыё ў справе выхавання, падбору і расстаноўкі кадраў крытыкаў, умацаванне сувязі крытыкаў з практыкай камуністычнага будаўніцтва, удасканальванне іх марксісцка-ленінскай тэарэтычнай падрыхтоўкі.

У НУМАРЫ ЧЫТАЙЦЕ:

МАСТАК. ЯГО ПРЫЗВАННЕ, ЯГО АБАВЯЗАК — Стар. 2

СЁННЯ І ЗАЎТРА БЕЛАРУСКАЙ СТАЛІЦЫ
Гарадскі Савет раіцца з творчай інтэлігенцыяй. — Стар. 2—3

УСПОМНІМ БЫЛЫЯ ПАХОДЫ...
Пісьменнік расказвае пра сустрэчу з аднапалчанамі. — Стар. 4—5

На паэтычнай паверцы — вершы Міколы ФЕДЗЮКОВІЧА — Стар. 4—5

ЧАС І АДВЕЧНАЯ ТЭМА
Роздум над старонкамі рамана «Непрыкаяны маладзік». — Стар. 6—7

БЕЗ РЭЖЫСЁРСКАЙ АКРЫЛЕНАСЦІ
Спектакль «Мяшчане» на брэсцкай сцэне. — Стар. 8

СЯРОД КНІГ — Стар. 12—13

ЛЕНІНГРАДСКІ ПАЭТ У МІНСКУ — Стар. 14

Урывак з кнігі польскай пісьменніцы — Стар. 15

СЭРЦАМ СЛУХАЦЬ ЧАС

КАНКРЭТНЫЯ творчыя планы ў мастакоў Савецкай Беларусі на 1972 год—вялікія і адказныя. У хуткім часе ў Маскве яны будуць трымаць творчую справаздачу перад усім савецкім народам разам са сваімі калегамі з Украіны і Малдавіі. Гэтая вялікая зональная выстаўка будзе сур'ёзным творчым экзаменам беларускага атрада савецкага выяўленчага мастацтва, які ўпэўнена набірае новыя сілы ў высакародным служэнні радзіме, народу, партыі.

У гэты год паўвекавога юбілею Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік адбудзецца таксама рэспубліканская выстаўка творчасці маладых мастакоў, якая пакажа рост маладога атраду выяўленчага мастацтва рэспублікі.

«Беларусь сацыялістычная» — так будзе называцца вялікая рэспубліканская мастацкая выстаўка, якая разгорнецца ў Мінску пад канец гэтага года. Аб творчай праграме яе красамоўна сведчыць сама назва.

Рыхтуючыся да гэтых выставак, мастакі нашай рэспублікі ясна ўсведамляюць адказнасць задач, што стаяць перад імі,—у высока ідэйных, дасканалых па майстэрстве творах палымяна і пераканана несці ў народ высокія маральныя і грамадзянскія ідэалы.

Зусім зразумела, якая вялікая адказнасць кладзецца сёння на нашы выставачныя камітэты і на кожнага мастака, што будзе прапанаваць творы на іх разгляд.

24 З'ЕЗД КПСС акрэсліў праграму дзейнасці творчых саюзаў. У дакументах з'езда падкрэслена, што творчыя саюзы закліканы штодзённа праяўляць увагу да творчых праблем развіцця мастацтва, павышэння ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню і прафесіянальнага майстэрства членаў саюзаў, выхавання высокай адказнасці ў дзеячоў мастацтва за сваю працу перад грамадствам.

Духам гэтых патрабаванняў прасякнута пастанова ЦК КПСС «Аб літаратурна-мастацкай крытыцы», якая, зразумела ж, самым непасрэдным чынам датычыць і крытычнага цэху ў выяўленчым мастацтве.

Вернасць прынцыпам партыйнасці і народнасці савецкага мастацтва, мастацтва сацыялістычнага рэалізму, уважлівая, чулая падтрымка сапраўды наватарскага, сапраўды таленавітага—вось на якой аснове пераадольваюцца ў творчасці праявы шэрасці, эпігонства, руціны і вядзецца непрымірымая барацьба з чужымі рэалістычнаму мастацтву поглядамі і тэндэнцыямі.

Адказнасць савецкага мастака перад эпохай, у якую ён жыве, вызначаецца праграмнай задачай Камуністычнай партыі—выхоўваць новага, усебакова развітага, духоўна багатага, маральна чыстага і фізічна дасканалага чалавека. Каб быць на ўзроўні такой высакароднай задачы, каб мець магчымасць яе выканаць, савецкаму мастаку патрэбна высокая ідэйная загартоўка, здольнасць чула слухаць сэрцам наш час, актыўна розумам і сэрцам успрымаць вядучыя тэндэнцыі грамадскага развіцця ў нашай краіне і ва ўсім свеце.

Не варта забываць, што сацыяльная інфантыльнасць больш за ўсё спрыяе ўплыву суб'ектывісцкай эстэтыкі, якая фальсіфіцыруе або, па крайняй меры, моцна абмяжоўвае адказнасць мастака перад мастацтвам і грамадствам.

ЖЫВАЯ ПРАКТЫКА нашага выяўленчага мастацтва ставіць нямала творчых праблем, якія патрабуюць свайго неадкладнага асэнсавання, правільнага тэарэтычнага вырашэння, каб на аснове яго выпрацоўваліся пэўныя практычныя рэкамендацыі.

І сёння абсалютна ясна, што для таго, каб асэнсоўваць практычны вопыт выяўленчага мастацтва Савецкай Беларусі, неабходна сапраўдная творчая актыўнасць не адных толькі крытыкаў і мастацтвазнаўцаў, але і саміх мастакоў.

Сучасная савецкая эстэтыка, якая няспынна развіваецца і ўдасканальваецца, мае немалыя набыткі. На аснове марксісцка-ленінскага дыялектычнага метаду даследуюцца складанейшыя праблемы творчага працэсу. Робяцца вывады, якія маюць самае непасрэднае дачыненне да штодзённай творчай практыкі.

Так, напрыклад, асэнсоўваючы працэс далучэння шырокіх народных мас да высокай мастацкай культуры, савецкая эстэтыка падкрэслівае, што гэты працэс не звязаны ў прынцыпе з якімі-небудзь эстэтычнымі стратамі ў развіцці мастацтва, тым больш з наўмысным або вымушаным спрашчэннем яго зместу і формы. Іменна ў працэсе свайго развіцця, а не часовага адступлення ад актыўных пошукаў яно, мастацтва, ідзе, як падкрэсліваў У. І. Ленін, найглыбейшымі каранямі ў самую тоўшчу шырокіх працоўных мас, робіцца зразумелым для гэтых мас і любімым імі.

І яшчэ прыклад. Асэнсоўваючы багацце і разнастайнасць сацыялістычнага рэалізму, савецкая эстэтыка прыходзіць да вываду, што нельга, не рызыкуючы ўпасці ў аднабаковасць, зводзіць мастацкі рэалізм ні да суровых рэмбрандаўскіх фарбаў, ні да рафаэлеўскіх спосабаў пераўтварэння, паэтычнасць якіх агульнапрызнана. Прырода мастацкага рэалізму невымерна шырэй, багацей, шматгранней творчых магчымасцей любога вялікага мастака. Сапраўдны мастак заўсёды арыгінальны ў практычным прымяненні творчага метаду. Але гэта зусім не азначае, быццам існуе столькі ж метадаў, колькі мастакоў, якія метад прымянялі.

Наколькі важна глыбока разабрацца ў гэтых і многіх іншых пытаннях, сведчыць, у прыватнасці, сучасная пропаведзь рэалізму без берагоў некаторымі эстэтыкамі, якія адышлі ад сацыялізма. У гэтай пропаведзі крыецца, па сутнасці, адмоўнае стаўленне да праграмнасці, партыйнасці, ідэйна-эстэтычнай акрэсленасці сацыялістычнага рэалізму. Гэтая пропаведзь пэўным чынам суадносіцца з апалогіяй мадэрнізму, з мадэрнісцкімі прэтэнзіямі на абсалютную свабоду творчасці—адваротным бокам анархічнай вольнасці, суб'ектывісцкага самавольства.

ТОЛЬКІ УСЕБАКОВА ўзброены глыбокім разуменнем марксісцка-ленінскай эстэтыкі мастак здольны правільна ставіць перад сабою і правільна вырашаць складаныя праблемы наватарскага пошуку. Толькі на трывалай аснове марксісцка-ленінскай эстэтыкі здольны ён актыўна супрацьстаяць рэцыдывам як фармалізму, так і натуралізму. І не толькі супрацьстаяць, але і пераходзіць у актыўнае наступленне.

І ўсё гэта—не адцягненыя тэарэтычныя высновы. Усё гэта звязана трывала з нашай бягучай практыкай.

Заўважаючы бясспрэчныя, відавочныя поспехі выяўленчага мастацтва нашай рэспублікі, яго актыўны выхад на ўсесаюзную (і не толькі на ўсесаюзную!) арэну, мы не можам у той жа час не быць самакрытычнымі і не трывожыцца з прычыны пэўных недахопаў у яго развіцці.

Перад намі многа складаных праблем, звязаных з далейшым развіццём станковай карціны, з далейшым развіццём сінтэзу мастацтваў, з шэрагам пытанняў, якія патрабуюць свайго тэарэтычнага і практычнага вырашэння ў манументальным мастацтве. Ды ці толькі гэта! Хіба можа не трывожыць факт, што, бывае, і ў нашай творчай моладзі, якая выходзіць на шлях самастойнай творчасці, сустракаецца той самы сацыяльны інфантылізм—іх творам нярэдка нестае сацыяльна значнага зараду.

У асэнсаванні вопыту нашага выяўленчага мастацтва ў нас не так ужо багата дасягненняў. Неабходна знайсці формы каардынацыі дзейнасці па крытычным і мастацтвазнаўчым асэнсаванні створанага нашымі мастакамі паміж адпаведным інстытутам Акадэміі навук БССР, секцыяй крытыкі Саюза мастакоў БССР, нашымі друкаванымі органамі, якія ў той ці іншай меры займаюцца асвятленнем праблем беларускага савецкага выяўленчага мастацтва. Неабходна таксама — паўторым!—арганізаваць справу так, каб у абмеркаванні надзённых праблем мастацтва прымалі актыўны ўдзел яго творцы. Каб на аснове творчага абмену думкамі рабіліся практычна карысныя высновы.

Можна не сумнявацца, што мастакі Савецкай Беларусі актывізуюцца творча ў год паўвекавога юбілею СССР і адзначаць яго новымі здабыткамі. Хочацца толькі, каб гэтых здабыткаў было як мага больш.

РАСКАЗ пра сустрэчу творчых работнікаў сталіцы з першым сакратаром Мінскага гаркома КПБ В. Шарапавым і старшынёй выканкома Мінскага гарадскога Савета М. Кавалёвым мы пачнём з каментарыя да нашага фотаздымка. Хоць на планшэце, які тут паказаны, і ёсць дэталь сённяшняга Мінска, усё роўна здагадацца, дзе гэта, вельмі цяжка. Ва ўсякім разе ніхто з прысутных не падазраваў, што на планшэце — заўтрашняя Нямігa.

Яшчэ жывыя ў памяці спрэчкі (пра іх нагадаў В. Шарапаў)—рэканструяваць Нямігу, ці пакінуць старой? «Няміга — гэта гісторыя Мінска. Зніщым яе — забудземся, які быў ранейшы Мінск»,— даказвалі адны. «Старая Няміга не мае ніякай архітэктурнай каштоўнасці і выпадае з агульнага архітэктурнага ансамбля новага Мінска»,— пярэчылі другія.

Не будзем далей паглыбляцца ў сутнасць спрэчкі. Тым больш, што зараз яна беспрадметная — старой Нямігі ўжо няма. Заўважым толькі, што прыхільнікі новай Нямігі — архітэктары, планіроўшчыкі, мастакі, на нашу думку, зрабілі ўсё, каб даказаць сваю слушнасць. Калі іх задума будзе здзейснена (а сумняваецца ў гэтым няма падстаў), дык гэта будзе вуліца — цуд. З вышынямі, на рэдкасць прыгожымі дамамі, магазінамі, з нейкімі нябачанымі дагэтуль тратуарамі, якія падымуцца на ўзровень другога паверха.

А цяпер пра астатняе. За некалькі гадзін удзельнікі сустрэчы зрабілі вельмі цікавае падарожжа ў Мінск 1975 года, падарожжа з такім дасведчаным гідам, як Міхаіл Васілевіч Кавалёў.

Мінск 75-га. Вось ужо і Мінск 75-га... Можна дацягнуцца рукой. А толькі ж, здаецца, быў Мінск 45-га, 55-га, 65-га... Дзіўна зроблены чалавек. Не можа ён жыць без мары і ўсё ж, пакуль не пабачыць на свае вочы, не памацае ўласнымі рукамі, недзе ў душы варушыцца недавер. Маўляў, мары марамі, а жыццё... Мы ж ведаем, што сённяшні Мінск не трызніўся ў самых светлых снах тых пасляваенных гадоў, а ўсё роўна сёння слухаеш, якой будзе сталіца праз якія 3—4 тады, і зноў усё гэта не ўкладваецца ў галаве.

Памяркуйце самі. За гэтае пяцігоддзе ў Мінску будзе пабудавана каля 5 мільёнаў метраў жылой плошчы—гэта 100 тысяч кватэр. Каля 400 тысяч чалавек стануць навасельцамі. Насельніцтва двух сённяшніх Магілёваў!

Плануецца завяршыць комплексную забудову жылых раёнаў Зялёны Луг, Усход, Ракаўская шаша, Курасоўшчына, Харкаўская, Серабранка, вуліца Чкалава. Будзе завершана забудова важных гарадскіх магістраляў, якія фарміруюць сталічны цэнтр і ўезды ў горад на асноўных напрамках.

Прадугледжваецца інтэнсіўная рэканструкцыя раёна, абмежаванай Паркавай магістраллю, вуліцамі Няміга, Рэспубліканская, Апанскага і першым гарадскім кальцом, якое зараз праектуецца. Уздоўж вуліцы Танкавай пачнецца будаўніцтва буйнога жылога вышыннага комплексу, будзе працягвацца рэканструкцыя вуліц Пулізхава, Захарава, раёна вуліц Веры Харужай, Максіма Горкага і Маякоўскага... Усё і нераліччыць цяжка.

Ну, а якасць? Многіх з прысутных—а народ тут сабраўся ўніклівы, зацікаўлены, які ўсё прымае блізка да сэрца,—цікавіла, **што гэта будуць за дамы, якія гэта будуць кватэры?**

— Мы любім вельмі свой горад, — сказаў народны артыст рэспублікі Сцяпан Сцяпанавіч Бірыла,— і радуемся, калі нашы госці хвалюць яго. Але з песні слова не выкінеш. Не заўсёды ў нас будуюць хораша. Некалі ў нас быў аб'яўлены паход супраць архітэктурных празмернасцей. Відаць была ў гэтым патрэба. Але будаўнікі кінуліся ў другую крайнасць. Зараз многія дамы, асабліва ў мікрараёнах, падобныя, як блізняткі. Нават пафарбаваны аднолькава—у асноўным шэрыя. А я чуў, што ў многіх рэспубліках зараз ўжываецца каляровая тынкоўка, якая не баіцца ні сонца, ні дажджу.

Міхаіл Васілевіч Кавалёў растлумачыў, што асноўны аб'ём жыллёвага будаўніцтва будзе весціся па новых тыпавых праектах з палепшанымі канструктыўнымі і планіровачнымі рашэннямі. У

ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЯ КРЫТЫКА І СУЧАСНАСЦЬ

Важнейшыя задачы літаратурна-мастацкай крытыкі абмяркоўвае пленум праўлення Саюза пісьменнікаў СССР, які пачаў работу 26 студзеня ў Цэнтральным Доме літаратараў. У прэзідыуме—кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, сакратар ЦК КПСС П. Н. Дземічаў, загадчык аддзела культуры ЦК КПСС В. Ф. Шаура, старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў СССР Герой Сацыялістычнай Працы К. А. Федзін, сакратары праўлення, дзеячы культуры.

Адкрыў пленум першы сакратар праўлення СП СССР Г. М. Маркаў.

З дакладам «Літаратурна-мастацкая крытыка і сучаснасць» выступіў сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР В. М. Озераў. Задачы, што стаяць перад дзеячамі літаратуры і мастацтва, сказаў ён, вынікаюць з грандыёзнай праграмы будаўніцтва камунізма, якую распрацаваў XXIV з'езд КПСС.

Праграмныя палажэнні XXIV з'езда КПСС працягвае і развівае толькі што апублікаваная пастанова ЦК КПСС «Аб літаратурна-мастацкай крытыцы». Значэнне гэтага дакумента, глыбокага і натхняючага, цяжка пераацаніць. Мы з радасцю і гордасцю зноў пераконваемся, адзначыў дакладчык, што партыя ставіць пытанні развіцця літаратурна-мастацкай крытыкі ў лік першарадна важных спраў ідэйна-палітычнага жыцця грамадства. У пастанове шырока і маштабна вызначаны задачы, што паўстаюць перад крытыкай, глыбока раскрыта яе роля ў будаўніцтве камуністычнай культуры. У святле гэтай пастановы ўдзельнікі пленума і павінны абмеркаваць свае высокія і адказныя задачы.

Дапамагаць партыі ў выкананні намечанай XXIV з'ездам велічнай праграмы — значыць адстойваць, усталёўваць мовай мастацтва, прапагандаваць канструктыўны курс партыі і стваральныя справы савецкіх людзей.

В. М. Озераў падрабязна спыніўся на праблемах развіцця літаратурнай тэорыі. Падрыхтоўка да 50-годдзя ўтварэння СССР—падзеі велізарнай гістарычнай важнасці—абавязвае крытыку і тэорыю ўсё больш паглыблена вывучаць агульнасаюзны літаратурны працэс.

Выпраўляючы недахопы, перабудоўваючы сваю работу, праўленню Саюза пісьменнікаў СССР, усім пісьменніцкім арганізацыям краіны трэба будзе сканцэнтраваць увагу на канструктыўных справах, сказаў у заключэнне В. М. Озераў. Наш абавязак не на словах, а практычна забяспечыць сур'ёзнае павышэнне актыўнасці і прынцыповасці крытыкі ў правядзенні партыйнай лініі.

Затым пачаліся спрэчкі.

ТАСС.

ЧАРГОВАЕ пасяджэнне прэзідыума праўлення СП БССР было прысвечана галоўным чынам, абмеркаванню пытання аб рабоце рэдакцыі часопіса «Полымя».

Справаздачу зрабіў галоўны рэдактар часопіса Павел Кавалёў. Ён адзначыў, што мінулы год быў для «Полымя» ўраджайным па мастацкую прозу. Чытач прыхільна сустрэў такія творы, як раман Алеся Асіпенкі «Непрыкаяны маладзік», аповесці Віктара Карамазава «Пагоншік», Аляксея Кулакоўскага «Дзе каму жыць», кінаповесць Івана Шамякіна «Эшалон у Германію» і дакументальную аповесць Алеся Якімовіча «Кастусь Каліноўскі»; цікава была прадстаўлена проза маладых. З драматургічных твораў варта адзначыць змешчаную на старонках часопіса камедыю Міколы Матукоўскага «Амністыя».

Сярод паэтычных твораў, якія, на думку П. Кавалёва, упрыгожылі часопіс, былі паэмы Аркадзя Куляшова «Далёка да акіяна» і Алега Лойкі «З твайго паверха», а таксама вершы Максіма Танка, Петруся Броўкі, Аляксея Пысіна, Аляксея Русецкага, Янкі Сіпакова і іншых.

Звярнуў увагу дакладчык на шэраг перакладных твораў, якія друкаваліся ў часопісе, назваў лепшыя нарысы, публіцыстычныя матэрыялы, крытычныя і літаратуразнаўчыя артыкулы.

Гаворачы пра характар і накіраванасць творчых пошукаў часопіса ў 1972 годзе, П. Кавалёў сказаў, што рэдакцыя адвядзе на сваіх старонках

ПАДАРОЖЖА Ў МІНСК 75-га

СУСТРЭЧА ТВОРЧЫХ РАБОТНІКАЎ СТАЛІЦЫ Ў МІНСКІМ ГАРАДСКІМ САВЕЦЕ

асноўным гэта будуць вышынныя забудовы. Першыя такія дамы выраслі ўжо ў мікрараёне Усход, Ракаўская шаша і інш.

Горад з мільённым насельніцтвам (днямі нарадзіўся мільённы жыхар Мінска)—вельмі складаны арганізм. І размова, натуральна, закранула розныя аспекты развіцця сталіцы.

Скажам, камунальная гаспадарка. На развіццё камунальнай гаспадаркі і добраўпарадкаванне горада выдаткавана амаль трэць усіх капіталаўкладанняў.

Што сюды ўваходзіць? Скажам, водазабеспячэнне. Цяжка знайсці ў краіне горад, дзе б была такая смачная пітная вада як у Мінску. Мы п'ём артэзіянскую ваду. На колькі яе хопіць? Пытанне гэтае не раз узнімалася грамадскасцю. Выказвалася трывога, што запасы падземных крыніц хутка меншаюць, бо ваду гэтую «п'юць» і прадпрыемствы.

М. Кавалёў унёс яснасць у гэтае пытанне. К канцу пяцігодкі магутнасць водазабораў павялічыцца да 232 тысяч кубаметраў у суткі. Касмічныя лічбы не заўсёды асязальныя. Канкрэтна гэта будзе выглядаць так. Калі зараз на кожнага жыхара даводзіцца 193 літры вады ў суткі, дык у 1975 годзе будзе 223 літры.

— Але ўсё роўна,—адзначыў Міхаіл Васілевіч, — пытанне эканоміі вады з парадку дня не здымаецца.

І што не вельмі радуе — забяспечыць попыт мінчан на пітную ваду толькі за кошт падземных крыніц, гаворыць ён, не ўдасца.

Яшчэ адна праблема жыцця кожнага гараджаніна — транспарт. Калі М. Кавалёў вымаўляе гэтае слова, у многіх з прысутных вырываецца цяжкі ўздых.

Але, чакайце, давайце, паслухаем, што скажа наш мэр. Ну, што ж, лічбы важкія. К канцу пяцігодкі колькасць транспарту ўзрасце на 41 працэнт. Транспартны парк Мінска павялічыцца на 280 тралейбусаў, 800 аўтобусаў, 1.300 таксі. Калі зараз у суткі перавозіцца 1,1 мільёна пасажыраў, дык у 1975 годзе—1,6 мільёна. Працягласць тралейбусных ліній павялічыцца на 61 кіламетр.

Нам успомнілася даўняя гутарка з міністрам аўтамабільнага транспарту рэспублікі А. Андрэевым, у час якой ён скардзіўся, што работнікаў транспарту часам лаюць без падставы. У Мінску, напрыклад, амаль увесь пасажырскі транспарт рухаецца па Ленінскім праспекце. Машыны вымушаны ісці ледзь не ўпрытык. Усё гэта тармозіць рух.

Міністр, вядома, меў рацыю. Так атрымалася, што тыя, хто праектаваў пасляваенны Мінск на самай першай стадыі, не ўлічыў бурнага росту горада ў бліжэйшыя 10—15 гадоў. Вось і атрымалася, што амаль адзіная транспартная магістраль сталіцы—Ленінскі праспект.

Цяпер даводзіцца шукаць выйсце. Якое яно? М. Кавалёў расказвае, што за пяцігодку будзе завершана будаўніцтва заходняга і ўсходняга дублёраў Ленінскага праспекта (першага па вуліцах Няміга і Савецкіх пагранічнікаў з пуцеправодам праз чыгунку па вуліцы Розы Люксембург і другога па вуліцах Ульянаўскай—Металістаў). А ўсяго будзе пабудавана 36 кіламетраў магістральных вуліц, некалькі пуцеправодаў, мастоў, пешаходных пераходаў.

Ну, што ж, трэба спадзявацца, што праблема транспарту будзе вырашана. Хаця... З адной праблемы вырастае другая. Уявіце сабе тысячы аўтобусаў, таксі, асабістых і службовых легкавушак, грузавых машын, якія з раніцы да вечара лётаюць па горадзе і... атручваюць паветра. Чым, таварышы, будзем дыхаць?

Размова пераходзіць у іншую плоскасць. Гаворка заходзіць аб ахове акаляючага асяроддзя. Пра нашу Свіслач, дзе не кожны рызыкне і нагу памачыць, пра радыятарны і асфальтавы заводы, ад якіх няма жыцця навакольным жыхарам,—ім даводзіцца дыхаць смуродам, пра вялізную звалку ля аўтазавода...

— Ці не час ужо забараніць у Мінску будаўніцтва прамысловых прадпрыемстваў?—пытаецца Іван Пятровіч Шамякін.

М. Кавалёў адказвае яму, што ў далейшым у сталіцы намечана будаваць толькі прадпрыемствы, звязаныя з абслугай насельніцтва. Скажам, мясакамбінат, завод шампанскіх він і г. д.



— Такая будзе Няміга заўтра,—гаворыць М. Кавалёў.

Фота Ул. КРУКА.

Што датычыцца Свіслачы, то, маўляў, нічога тут дзіўнага няма. Сцёк вады тут складае 3 кубаметры ў секунду, а скід у раку сцёкавых вод—4 кубаметры ў секунду. Не спраўляецца з ачысткай сцёкавых вод і станцыя аэрацыі, дзе праводзіцца пакуль што механічная ачыстка вады і толькі з гэтага году пройдуць на ачыстку біялагічную. Вялікія надзеі ўскладаюцца на Вілейска—Мінскую водную сістэму, якая дазволіць, так сказаць, аздаравіць Свіслач, павялічыць яе ёмістасць ледзь не ў пяць разоў.

Лёгкія горада—яго зялёнае ўбранне—парні, скверы, сады, насаджэнні на вуліцах. У гэтай пяцігодцы мяркуецца пашырыць і добраўпарадкаваць усе сталічныя паркі, вялікія работы па добраўпарадкаванні будуць праведзены ў зонах масавага адпачынку на рэках Вяча, Пціч.

І ўсё ж некаторыя з выступаючых — народная артыстка рэспублікі Ганна Браніславаўна Абуховіч, Сцяпан Сцяпанавіч Бірыла, кінаапаратар студыі «Беларусьфільм» Ф. Осіпаў—наракалі на тое, што ў горадзе дрэнна ахоўваюцца і даглядаюцца насаджэнні.

— Няма ў нас у гэтай справе сапраўднай культуры,—сказала Г. Абуховіч.—Ці то не хапае спрактыкаваных садоўнікаў, толькі дрэвы на многіх вуліцах па многа гадоў не абразаюцца, растуць як у лесе.

Ф. Осіпаў заўважае, што ў нас нямала яшчэ выпадкаў варварскіх адносін да зялёнага ўбору сталіцы, асабліва сярод падлеткаў. Хто падлічыў, колькі маладых дрэўцаў паламана, колькі газонаў вытаптана. Відаць, мы мала займаемся выхаваннем падлеткаў, не ведаем, чым запоўніць іх вольны час...

Міхаіл Васілевіч сказаў, што гэтыя пытанні хвалююць і гарадскія ўлады. Утрыманне зялёных насаджэнняў будзе аддадзена пад кантроль і адказнасць раённых камунгасаў. М. Кавалёў выказаў меркаванне, што трэба мець асобныя арганізацыі па эксплуатацыі зялёных насаджэнняў і іх вырошчванні замест таго, каб усёй гэтай справай займаўся адзін трэст зялёнага будаўніцтва, як зараз.

Вялікая размова на сустрэчы зайшла пра культуру горада, пра яго мастацкае афармленне, манументальную прапаганду, архітэктуру малых форм.

За гэту пяцігодку ў Мінску прыбавіцца некалькі буйных кінатэатраў—на Харкаўскай вуліцы на 800 месц, на вуліцы Багдана Хмяльніцкага на 1.400 месц, у Чыжоўцы—на 800 месц, такі ж у Зялёным Лузе.

У горадзе будуць пабудаваны дзве буйныя музычныя школы, музычнае вучылішча, Дом літаратараў, новае памяшканне тэатра імя Янкі Купалы, некалькі палацаў культуры.

— І што нас вельмі радуе,—сказаў М. Кавалёў,—у гэтым годзе ў Мінску будуць устаноўлены скульптурныя помнікі песнярам беларускага народа Янку Купалу і Якубу Коласу, дзевяностагоддзе якіх будзе святкаваць рэспубліка.

— А Максіму Багдановічу?—спытаў Алесь Бачыла.—Наш выдатны паэт Максім Багдановіч, дарэчы, мінчанін, хіба не заслужыў помніка? Трэба было даўно падумаць і пра стварэнне літаратурнага ці мемарыяльнага музея ў доме, дзе ён жыў.

Пра скульптурнае ўпрыгожванне горада гаварыў С. Бірыла, які заўважыў, што многія скульптуры, якія ўстаноўлены ў парках, скверах, на вуліцах горада, невысокай мастацкай якасці, што Саюзу мастакоў рэспублікі трэба было ўзяць кантроль над гэтай справай у свае рукі.

Пра тое, што ў горадзе дрэнна прадумана тэатральная рэклама, якую мосцяць абы дзе, гаварыў дырэктар тэатра оперы і балета М. Шаўчук. Дырэктар філармоніі Г. Загародні ўзняў пытанне аб будаўніцтве ў Мінску яшчэ адной канцэртнай залы і зялёнага тэатра.

У канцы сустрэчы выступіў першы сакратар Мінскага гаркома КПБ Васіль Іванавіч Шаранаў, які расказаў пра эканоміку сталіцы, пра рубяжы, якія ўзяты ў гэтай пяцігодцы мінчанамі.

М. ЗАМСКІ.

ШЫРЭЙ АДЛЮСТРОЎВАЦЬ СУЧАСНАСЦЬ

значнае месца матэрыялам, якія прысвечаны 50-годдзю ўтварэння СССР, будзе дбайна захоўваць і развіваць тыя літаратурныя традыцыі, што склаліся ў часопісе «Полымя» за 50 год існавання, шырока разгорне прапаганду рашэнняў XXIV з'езда КПСС.

Коратка спыніўся дакладчык і на арганізацыйных пытаннях, адзначыўшы некаторыя недахопы ў рабоце рэдакцыі.

З садакладам выступіў намеснік старшыні праўлення СП БССР А. Грачанікаў. Ён падсумаваў творчыя здабыткі часопіса за мінулы год, параўнаў іх з тым, што друкавалася ў гэтым выданні ў 1970 годзе, і знайшоў, што «па значнасці празаічных твораў, па іх грамадскім гучанні, ідэйна-мастацкіх якасцях больш пашанцавала часопісу ў 1970 годзе».

Многа месца адвёў у прамове А. Грачанікаў паэзіі на старонках «Полымя». Нават няпоўны пералік імён тых паэтаў, што змясцілі свае творы ў часопісе, сведчыць, што беларуская паэзія інтэнсіўна развіваецца, асвойвае новыя паэтычныя аблогі, пашырае зону ўздзеяння на чытача.

Актыўна выступаюць на старонках выдання крытыкі—Бугаёў, Каваленка, Юрэвіч, Арочка, Калеснік, Шкраба, Александровіч, Андраюк, Бярозкін. Але, на жаль, і ў іх выступленнях не заўсёды заўважаецца праблемны падыход да аналізу сучаснага стану беларускай паэзіі, а таксама прозы. У той жа час многія рэцэнзіі на новыя кнігі пісьменнікаў носяць у часопісе «інтымны», кампліментарны характар, у іх не робіцца нават спробы закрануць важнейшыя праблемы творчасці.

Адзначаючы шэраг станоўчых момантаў у рабоце рэдакцыі часопіса «Полымя», А. Грачанікаў заўважыў, што аддзел навукі яшчэ пакуль не знайшоў свайго аблічча.

У абмеркаванні работы часопіса «Полымя» прынялі ўдзел старшыня праўлення СП БССР Максім Танк, першы намеснік старшыні праўлення Іван Шамякін, пісьменнікі Максім Лужанін, Анатоль Вярцінскі, Дзмітрый Бугаёў, Алесь Сачанка, Аляксей Русецкі, Язэп Семяжон і іншыя. Былі зроблены карысныя заўвагі і прапановы. У прыватнасці, А. Вярцінскі быў супраць новай рубрыкі часопіса «Літаратура ў школе». На яго думку, спецыяльна для настаўнікаў змяшчаць артыкулы не мэтазгодна, бо ўсё, што друкуецца ў «Полымі», гэта і для настаўнікаў. Гэтую заўвагу падтрымалі М. Лужанін, Я. Семяжон, які слушна прапанаваў друкаваць у «Полымі» аглядныя артыкулы, прысвечаныя беларускай прозе і паэзіі. Супрацоўнікі рэдакцыі І. Пташнікаў і Б. Сачанка гаварылі пра пэўныя цяжкасці ў рабоце аддзела літаратуры, выказалі меркаванне, што не варта змяшчаць многа перакладных твораў на старонках «Полымя», неабходна ўлічваць іх якасць, ашчадней адносіцца да рабочай плошчы часопіса. Да гэтай думкі далучыўся і Аляксей Русецкі.

І. Шамякін падкрэсліў важнасць абмеркавання часопіса «Полымя», бо яно праходзіць у знамянальны час—пасля XXIV з'езда КПСС, калі працоўныя краіны натхнёна ажыццяўляюць гістарычныя рашэнні партыі. Гэта абавязвае і часопіс удумліва і глыбока аналізаваць на сваіх старонках тыя важнейшыя працэсы, што адбываюцца сёння ў жыцці ўсяго нашага грамадства, больш актыўна праводзіць лінію партыі ў літаратуры, больш гаварыць аб тых надзённых пытаннях і праблемах, якімі жыве наш народ.

І. Шамякін звярнуў увагу на той факт, што баявы жанр публіцыстыкі ў часопісе яшчэ не на належным узроўні. Гэта датычыцца і некаторых іншых рэспубліканскіх выданняў. Цяжка назваць сёння хоць адзін вельмі цікавы публіцыстычны артыкул, які б хацелася чытаць і перачытваць: і па філасофіі, і па эканоміцы, і па міжнародным жыцці.

І. Шамякін не бачыць нічога дрэннага ў тым, што рэдакцыя атрымлівае ў апошні час вельмі многа празаічных твораў, хай нават і нераўнацэнных па якасці: гэта ж дае магчымасць выбіраць найлепшыя для друку. Што ж датычыць перакладаў у часопісе, то трэба змяшчаць толькі арыгінальнае і новае з твораў літаратараў братніх рэспублік і краін сацыялізма.

М. Танк, падсумоўваючы гаворку пра часопіс «Полымя», падкрэсліў карысць тых заўваг і прапаноў, якія былі зроблены пісьменнікамі ў час абмеркавання. Часопіс мае багатыя літаратурныя традыцыі, заслужыў сабе добрае імя, але ў яго ёсць немалыя магчымасці яшчэ больш умацаваць свой аўтарытэт у чытача. Пажадана, каб, накіроўваючы пэўныя намаганні на паляпшэнне аддзелаў прозы і паэзіі, рэдакцыя не забывала пра раздзел публіцыстыкі, друкавала больш артыкулаў па выкрыцці рэакцыйнай сутнасці сучаснага імперыялізму.

Абмеркаванне часопіса «Полымя» на пасяджэнні прэзідыума СП БССР паказала, што рэдакцыі трэба ўважліва адбіраць творы для публікацыі, старанна рэдагаваць іх і трымаць арыенціроўку на стварэнне шматпланавых сучасных твораў аб рабочым класе і працоўных вёскі, больш актыўна праводзіць лінію партыі ў літаратурна-мастацкай крытыцы.

ГЕРОЙ — РАБОЧЫ ЧАЛАВЕК

На гэтым тыдні ў Горкім праходзіць другі Усесаюзны фестываль фільмаў, прысвечаных рабочаму класу.

«Беларусьфільм» прадставіў на фестываль дакументальныя фільмы «Мы — сіняблузнікі» (аўтар сцэнарыя Г. Колас, рэжысёр і аператар І. Пікман) і «Трактар учора, сёння, заўтра» (аўтар сцэнарыя і рэжысёр Ч. Цяўлоўскі, аператар Г. Лейбман).

ПАРТЫЙНЫ СХОД КАМПАЗІТАРАЎ

Адбыўся партыйны сход Саюза кампазітараў БССР. З дакладам аб творчых выніках мінулага года выступіў старшыня праўлення Рыгор Раманавіч Шырма. Ён адзначыў, што ў актыве кампазітараў рэспублікі з'явілася шмат новых музычных твораў. Няблага папрацавалі музыказнаўцы. Было праведзена нямала цікавых сустрэч кампазітараў са слухачамі. Разам з тым, дакладчык выказаў пэўную трывогу за жанр камерна-вакальнай і песеннай музыкі, які яшчэ слаба распрацоўваецца беларускімі кампазітарамі.

І. Лучанок, Б. Смольскі, Ю. Семяняка, А. Ракава, Г. Вагнер, К. Сцепанцэвіч, якія выступілі ў спрэчках, расказалі пра свае творчыя планы, выказалі шэраг прапаноў, накіраваных на паляпшэнне работы Саюза кампазітараў.

Д. НІКАЛАЕЎ.

ДЭВІЗ «ЖЫЦЦЁ — НАЙЦІКАВЕЙШАЯ КНІГА»

Міністэрства асветы БССР, Дзяржаўны камітэт Савета Міністраў БССР па друку і выдавецтва «Народная асвета» падвялі вынікі рэспубліканскага конкурсу на лепшыя падручнікі па беларускай літаратуры для 8 і 9—10 класаў школ Беларусі.

Першую прэмію журы конкурсу прысудзіла крытыку Р. Шкрабе за рукапіс пад дэвізам «Жыццё — найцікавейшая кніга».

Калегія Міністэрства асветы БССР рэкамендавала выдавецтву «Народная асвета» падрыхтаваць рукапіс да выдання ў якасці вучэбнага дапаможніка па беларускай савецкай літаратуры для 9—10 класаў на 1973-74 навучальны год.

ТВОРЧЫ ВЕЧАР А. КАРПАВА

У Саюзе кінематаграфістаў БССР адбыўся вечар, прысвечаны 50-годдзю з дня нараджэння і 30-годдзю творчай дзейнасці рэжысёра студыі «Беларусьфільм», заслужанага дзеяча мастацтваў Казахскай ССР Аляксандра Карпава.

Нядаўна на «Беларусьфільме» Аляксандр Карпаў скончыў шматсерыйны тэлевізійны фільм «Белая зямля» і прыступіў да работы (сумесна з славацкімі кінематаграфістамі) над мастацкай кінакарцінай «Капітан Ян» — пра Героя Савецкага Саюза і нацыянальнага героя Чэхаславакіі Яна Налёпку.

Пятро ПРЫХОДЗЬКА

РЭПАРТАЖ З БЫЛОГА ПОЛЯ БОЮ

ПАЭМА ПРАЦЯГВАЕЦЦА

ВЕСКА Дзеражычы стаіць непадалёку ад Лоева, на правым беразе Дняпра. Бераг высокі і круты. Адсюль добра бачны суседнія вёскі, не толькі беларускія, але і ўкраінскія. Бо якраз у гэтым месцы, па Дняпры, праходзіць граніца паміж братнімі рэспублікамі. З правага боку раскінулася вёска Бывалькі — центр калгаса «Ленінскі шлях», крыху ніжэй па Дняпры — вёска Глушэц, а за Дняпром, у даліне, украінскае сяло Любечы. Гэта — Чарнігаўшчына.

Нас тут ужо чакалі. На беразе сабралася многа людзей — старых і маладых. Дзяўчаты ў нацыянальных беларускіх касцюмах паднеслі нам хлеб-соль, букеты жывых кветак.

Дарункі беларускай зямлі прыняў баявы генерал Барыс Аляксандравіч Барынаў, які прыехаў з Масквы. Ён камандаваў стралковай дывізіяй, якая восенню 1943 года адной з першых фарсіравала Дняпр, ступіла на беларускую зямлю і вызваліла ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў многія прыбярэжныя вёскі, у тым ліку Дзеражычы.

Праз 27 гадоў тут сабраліся ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, баявыя сябры генерала Барынава — былы начальнік штаба дывізіі, палкоўнік запасу Міхаіл Якаўлевіч Вайсберг, начальнік штаба асобнага артылерыйскага палка, палкоўнік Уладзімір Дзмітравіч Лукаеў, былы камандзір сапёрнага ўзвода, Герой Савецкага Саюза Аляксандр Іванавіч Парыгін, былы камандзір дывізійнай роты разведкі Павел Кузьміч Ежак са сваёй франтавой сяброўкай Марыяй Андрэеўнай Ежак. Яны прыехалі з Пскоўскай вобласці, з горада Вялікія Лукі, куды закінуў іх лёс пасля баявых паходаў.

Гасцей сабралася многа. Тут і генералы, і афіцеры, і радавыя. І ніхто з іх не называў сябе «былым», кожны лічыў сябе і сёння салдатам.

Як толькі выйшлі на бераг Дняпра, Павел Кузьміч Ежак дастаў з партфеля карту і разгарнуў яе.

— Вось ён,— паказаў Павел Кузьміч алоўкам на карце.

— Хто? — спыталі таварышы.

— Бачыце, вунь там, за Дняпром, чарнеецца ў хмызняках? — Ежак кінуў позірк туды, на левы бераг Дняпра, дзе сярод балота віднелася вёсачка

— Гэты ж Змей! Пасёлак Змей. Дзіўная назва, праўда? А мая рота гэты пасёлак запомніла на ўвесь век...

Ежак пачаў расказваць пра сваіх разведчыкаў, якія першыя падышлі да Дняпра цёмнай асенняй ноччу ў сорак трэцім годзе і першыя ступілі на беларускую зямлю.

Ніколі не забыць той ночы. Разведчыкі і сапёры пераправіліся ціха, без адзінага шолаху. За імі — перадавыя часці. Адным з першых пераправіўся батальён капітана Меньшуна, у ім быў і я — сакратар дывізійнай газеты «Призыв Родины».

Прыгадваю, як капітан Ежак стаяў тады на гэтым самым месцы, тады яшчэ зусім малады афіцэр. У руках яго быў скураны камандзірскі планшэт. З картай, на якой была пазначана лінія абароны немцаў.

У тую ноч без перапынку курсіравалі праз Днепр пантоны, лодкі, самаробныя плыты — усё, што магло плаваць. Пад пякельным агнём сапёры батальёна пераправілі тысячы байцоў.

Пераправіўшыся на правы бераг Дняпра разам з батальёнам капітана Меньшуна, я быў у яго баявых парадках, побач з камбатам, у адным акопе. Камбат сам ляжаў за кулямётам і адбіваў контратаку ворага. Я ляжаў побач і пасоўваў кулямётную стужку, замяняючы другі нумар баявога разліку. За ноч было адбіта некалькі контратак фашыстаў.

А праз тыдзень-два, калі я ўжо быў у рэдакцыі газеты і пісаў нататкі пра баявыя подзвігі байцоў пры фарсіраванні Дняпра, да нас прыйшла радасная вестка. За адвагу і мужнасць, праяўленыя ў баях за Днепр, 36-ці байцам, сержантам і афіцэрам нашай дэвізіі было прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза. Дзесяткі, сотні воінаў былі ўзнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі. Радасць не мінула і мяне. Я быў ўзнагароджан баявым ордэнам.

І вось мы зноў разам стаім на беразе Дняпра, на высокай крутым, там, дзе грымелі баі больш чвэрці стагоддзя назад. Многіх няма сярод нас. Адны загінулі ў жорсткіх бітвах, другія памерлі пасля вайны.

Што ж нас сюды прывяло, у гэту прыдняпроўскую беларускую вёску Дзеражычы, з самых розных, далёкіх і блізкіх куткоў нашай неабсяжнай Радзімы: з Масквы і Астрахані, з Данецка і Ташкента, з Рыгі і Вялікіх Лук, з Мінска і Харкава? Нас, трыццаць пяць чалавек, былых воінаў адной дывізіі, запрасілі сюда на адкрыццё помніка нашым аднапалчанам, вось гэтыя шчырыя, простыя, сардэчныя людзі.

У першых радах стаяць дзеці з кветкамі ў руках. Гэта вучні Дзеражыцкай сярэдняй школы на чале з дырэктарам Ганнай Акімаўнай Арцёменка.

Углядаючыся ў твары гасцей, Ганна Акімаўна пазнае амаль усіх нас. Гэтыя твары яна бачыла не раз на фотаздымках у школьным музеі баявой славы. Чырвоныя следапыты Дзеражыцкай сярэдняй школы многае зрабілі, каб увекавечыць памяць герояў — воінаў Савецкай Арміі, якія восенню і зімой 1943 года першыя фарсіравалі Днепр у гэтым раёне, потым вызвалялі Лоеў, Калінкавічы, Мазыр, Брагін і іншыя гарады і сёлы беларускага Палесся.

Калі першы сакратар Лоеўскага райкома партыі Сяргей Паўлавіч Бабыр пачынаў мітынг, прысвечаны адкрыццю помніка воінам 61-й арміі, перад трыбунай з'явілася мора кветак — залёных, белых, чырвоных, сініх — мноства шматкаляровых жывых вянкоў. Іх прынеслі сюды бацькі і дзеці, малыя і старыя, каб пакласці на мармуровыя пліты з імёнамі тых, хто не вярнуўся з вайны.

Пасля мітынгу мы ўскладаем на магілу вянкі, чытаем:

Герой Савецкага Саюза гвардыі старшы лейтэнант Міхайлаў Мікалай Іванавіч.

Герой Савецкага Саюза гвардыі радавы Самсонаў Барыс Васілевіч.

Герой Савецкага Саюза гвардыі радавы Папоў Фёдар Кузьміч.

Герой Савецкага Саюза і гэтак далей...

Сем Герояў Савецкага Саюза ў адной брацкай магіле! А колькі тут безымянных воінаў, невядомых салдат.

Калі я падышоў да мармуровай пліты, на якой залатымі літарамі напісаны імёны герояў, погляд мой спыніўся яшчэ на адным імені — Георгія Васілевіча Майсурадзе, Героя Савецкага Саюза — падвога 519-га стралковага палка. Гэта імя мне асабліва помніцца. Радавы Майсурадзе служыў у нашай дывізіі. Гэта пра яго гераізм у баях за вызваленне вёскі Глушэц на правым беразе Дняпра 9 кастрычніка 1943 года я напісаў баладу. Потым гэта балада перарасла ў паэму. Паэма некалькі разоў друкавалася ў газетах, у зборніках. Тут, у Дзеражычах я заўважыў яе першапачатковы варыянт пад шклом у музеі баявой славы. Яго прыслаў сюды хтосьці з маіх баявых сяброў перад тым, як я сам падарыў музею кнігу.

Доўга ніхто не ведаў, што герой

Паэтычная паверка

Мікола ФЕДЗЮКОВІЧ

З ЦЫКЛА «ЖАНЧЫНЫ»

•

Быў май, жаночы голас плакаў
і, як па промні, плыў у даль —
У даль, дзе ззяе мора макаў
пад небам чыстым, бы
крышталь,
Я чуў, як плакала жанчына.

Уздоўж вайны, усцяж Зямлі
яна штогод ідзе да сына —
туды, дзе макі расцвілі...

Кіёк, а за плячыма — клунак.
Брыдзе матуля ў белы свет.
Як бежанцы — натоўпы думак,
яна за імі — след у след.

Пагляд ад спёкі заімглёны,
спіна стамлёная смыліць...
Адно ёй сонца — над зямлёю,
другое сонца — у зямлі.

НА КУРСКІМ ВАКЗАЛЕ Ў МАСКВЕ

І радасць
і трывога апаноўваюць,
як толькі на перон прыйду...
Але ж:
«А што,
калі ты думаеш па-новаму?
А што —
калі па-новаму жывеш?..»
Ад зыркага святла плашчом
затулены,
гляджу туды,
дзе ўсход запалавеў...
Такі ж,
як я,—
узрушана-сутулены
спыняецца паблізу чалавек,
Яму,
відаць
гарчэй цыгаркі горкае
чакаць
і непакоіцца вось так...
— Сюды прыходзіць
з Горкага?
— Так, з Горкага.
— У восем роўна?
— Што?
— У восем?..
— Так!
...І радасць
і трывога
апаўноўваюць,
калі з другога боку ты ідзеш...
А што,
калі ты думаеш
па-новаму?
А што —
калі па-новаму жывеш?..

РАМАНС

Прыйшла — і развярэдзіла
ўспаміны,
кранула запаветную струну,
сыграла вальс пакінутай
краіны,
глядзела доўга-доўга на сцяну.

Але сцяна маўклівасці ляжала
паміж двух, развенчаных
двух...
...Загаварыла ўрэшце. Колькі
жалю
было ў высокім голасе тваім!

Ды што мне знаць, хто праў,
хто вінаваты...
Ці ж не сама ты красавіцкім
днём
пакінула маю святліцу-хату,
пайшла ў чужы і непрытульны
дом?

І клясціся не трэба, што
кахала...
Ці ж не сама ты позняю
вясной

не загінуў. Пасля вайны радавы Майсурадзе, якому пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, жыў на сваёй радзіме ў Грузіі, у вёсцы Кведзі Онскага раёна. Да 1966 года ён працаваў брыгадзірам у калгасе. У яго нарадзіўся сын Зураб, а ў Зураба свой сын — Георгі Майсурадзе ўжо быў дзедам, калі яго адшукалі і паведамілі, што ён — Герой Савецкага Саюза. Ён нават сам пра гэта не ведаў. Зо цяжка параненага яго сябры вынеслі з поля бою і ён аказаўся ў глыбокім тыле. Больш года лячыўся ў шпіталі. Усе лічылі, што ён загінуў, калі кінуўся на амбразуру варожага дзота. Але цудам ён застаўся ў жывых. Так і жыў у невядомасці, пакуль дзеці з Дзержыч не адшукалі яго.

Неўзабаве яму была ўручана Залатая Зорка Героя. Але да гэтага дня, да дня нашай сустрэчы, ён не дажыў. Летам 1968 года памёр ад старых салдацкіх ран. І мне хочацца працягнуць паэму пра свайго героя, свайго баявога сябра.

Вечарам, пасля мітынгу і наведвання музея баявой славы, праўленне калгаса «Ленінскі шлях» наладзіла нам шчыры, сардэчны прыём. Старшыня калгаса Віктар Паўлавіч Дземідзенка расказаў аб сваёй сельскагаспадарчай арцелі. Першы год дзевятай пяцігодкі яна закончыла паспяхова, дабіўшыся высокіх ураджаяў, выканала план па здачы дзяржаве збожжа і тэхнічных культур, мяса і малака. Кожная сям'я ў калгасе забяспечана ўсім неабходным. На цэнтральнай сядзібе сельгасарцелі, у вёсцы Бывалькі, як і ў іншых, пабудаваны сталовая, памяшканне сельсавета, новыя дамы для калгаснікаў. На будучы год немечана будаўніцтва новай школы.

Ад імя ўсіх прысутных генерал Барынаў падзякаваў абласному камітэту партыі, райкому, раявыканкому, праўленню калгаса, настаўнікам і школьнікам вёскі Дзержычы за ўсе тыя клопаты, якія яны праявілі і праяўляюць аб нашых героях — героях далёкай, даўно адгрымеўшай бітвы.

І тут хтосьці прыгадаў нашу песню, як і пра тых, каго няма з намі.

Соловьи-соловушки
Поют нам до зори,
Соловьи-соловушки
Поют тому, кто смел.
Мы пройдем сквозь воды,
Сквозь дожди, огни.
Только жаль, что рано
Генерал наш поседел.

Песню падхапілі ўсе.

Я паглядзеў на свайго генерала, галава якога зусім пасівела, і ўспомніў, што гэтая песня была напісана ў нас, у рэдакцыі дывізійнай газеты, дзе я працаваў адказным сакратаром. Ёсць у гэтым і мая доля.

Пра кожнага з прысутных у гэтай жа зале можна было б скласці франтавую песню, якую мы самі склалі пра свайго генерала і спявалі нярэдка ў перапынках паміж баямі

ПЕСЕНЬ І ДУМ УЛАДАР

УРАЧЫСТЫ ВЕЧАР, ПРЫСВЕЧАНЫ ВАСЬМІДЗЕСЯЦІГОДДЗЮ Р. Р. ШЫРМЫ

Народнага артыста СССР Р. Шырму віншуюць кампазітар І. Лучанок, музычны кіраўнік народнага хору БССР К. Паплаўскі, заслужаны дзеяч культуры БССР А. Русак, народны артыст СССР Г. Цітовіч, заслужаны артыст БССР У. Кавальчук і заслужаны артыст Казахскай ССР Хв. Буйневіч.

Фота Ул. КРУКА.

ЯГО ІМЯ ведаюць у самых далёкіх кутках нашай рэспублікі. Як любяць і шануюць у нас песню, так любяць і паважаюць чалавека, які сваё жыццё прысвяціў песні. Збіраў яе, запісваў, апрацоўваў, нястомна прапагандаваў лепшыя ўзоры песеннага фальклору

Вучоны, кампазітар, пісьменнік, старшыня праўлення Саюза кампазітараў БССР, актыўны грамадскі дзеяч, чалавек вялікага сэрца — такім мы ведаем нашага дарагога дзядзьку Рыгора.

24 студзеня глядзельная зала Беларускай дзяржаўнай філармоніі была перапоўнена. Прадстаўнікі грамадскасці сталіцы, шматлікія госці з братніх рэспублік прыйшлі на ўрачысты вечар, прысвечаны 80-годдзю з дня нараджэння і 60-годдзю творчай дзейнасці песняра беларускага народа Рыгора Раманавіча Шырмы.

У прэзідыуме — кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КП Беларусі П. М. Машэраў, Старшыня Савета Міністраў БССР Ц. Я. Кісялёў, сакратар ЦК КПБ А. Т. Кузьмін, намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР І. Ф. Клімаў, намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Н. Л. Сняжкова, загадчык аддзела культуры ЦК КПБ С. В. Марцэлеў, першы сакратар ЦК ЛКСМБ У. І. Падрэз, госці з братніх рэспублік, прадстаўнікі грамадскасці Мінска.

Вечар адкрыў намеснік старшыні праўлення Саюза кампазітараў БССР, заслужаны дзеяч мастацтваў рэспублікі Ю. Семяняка.

Аб жыцці і творчым шляху Рыгора Раманавіча Шырмы расказаў народны артыст БССР прафесар А. Багатыроў.

Слова атрымлівае сакратар ЦК КПБ А. Т. Кузьмін. Ад імя ЦК Кампартыі Беларусі, Прэзідыума Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў БССР ён цёпла і сардэчна віншуе Рыгора Раманавіча Шырму, жадае юбіляру моцнага здароўя, новых вялікіх творчых поспехаў.

Звяртаючыся да юбіляра, А. Т. Кузьмін гаворыць:

— Рабочыя і калгаснікі, інтэлігенцыя, моладзь, увесь наш народ высока цэняць і бязмежна любяць Вас, вернага сына Камуністычнай партыі, выдатнага музыканта і літаратара, вучонага-даследчыка, буйнага грамадскага дзеяча...

Сваёй самаадданай, сапраўды тытанічнай працай Вы зрабілі здабыткам працоўных чароўнае, непаўторнае хараство беларускай песеннай творчасці і гэтым унеслі найвялікшы ўклад у развіццё беларускай савецкай сацыялістычнай культуры.

Акадэмічная харавая капэла БССР, стваральнікам, мудрым выхавацелем і кіраўніком якой Вы былі многія гады, з'яўляецца гордасцю нашага народа, яна стала адным з лепшых мастацкіх калектываў краіны. Выпеставаная Вамі, яна служыць цяпер эталонам для шматлікіх харавых калектываў, з'яўляючыся прыкладам віртуознага майстэрства і мастацкай дасканаласці.

Як нястомны збіральнік і папулярызатар песень народа, як аўтар шматлікіх артыкулаў у цэнтральнай і рэспубліканскай прэсе па праблемных пытаннях развіцця музычнага мастацтва, Вы дапамаглі мільёнам і мільёнам людзей у нашай краіне і за рубяжом пазнаць багацце духоўнага свету беларускага народа ў яго ўзаемасувязях з культурай рускага, украінскага і іншых братніх народаў.

Пад бурныя апладысменты А. Т. Кузьмін уручае юбіляру Ганаровую грамату Вярхоўнага Савета БССР, якой Рыгор Раманавіч Шырма ўзнагароджаны за заслугі ў развіцці савецкага музычнага мастацтва і ў сувязі з 80-годдзем з дня нараджэння.

Юбіляра цёпла віталі сакратар праўлення Саюза кампазітараў СССР П. Савінцаў, міністр культуры БССР Ю. Міхневіч, першы намеснік старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў БССР І. Шамякін, заслужаны дзеяч мастацтваў Украінскай ССР Ю. Мейтус, сакратар Беларускага савета прафсаюзаў М. Дубкова, народны артыст Літоўскай ССР прафесар К. Кавяцкас, намеснік старшыні Мінскага гарвыканкома М. Жукоўскі, адказны сакратар Саюза кампазітараў Арменіі Ю. Казаран, старшыня праўлення Беларускага тэатральнага аб'яднання народная артыстка СССР Л. Александроўская, першы сакратар ЦК ЛКСМБ У. Падрэз, рэктар Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі народны артыст БССР У. Алоўнікаў, першы сакратар Быхаўскага райкома партыі Д. Комар, старшыня праўлення Саюза мастакоў БССР заслужаны дзеяч мастацтваў рэспублікі В. Грамыка, мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага народнага хору БССР народны артыст СССР Г. Цітовіч, воіны Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі, дырэктар Беларускай дзяржаўнай філармоніі Г. Загародні, дырэктар Рэспубліканскага дома народнай творчасці Г. Талчынская, выхаванцы спецыяльнай сярэдняй музычнай школы пры Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, прадстаўнікі творчых калектываў Мінска.

У адрас юбіляра паступіла больш дзвюхсот віншаванняў. На вечары зачытваюцца прывітальныя адрасы, тэлеграмы.

Са словам у адказ выступіў юбіляр. Рыгор Раманавіч шчыра падзякаваў за цёплыя, сардэчныя віншаванні і добрыя пажаданні. Словы глыбокай падзякі сказаў ён Камуністычнай партыі Беларусі, ураду рэспублікі за высокую ацэнку яго працы.

Вечар закончыўся вялікім канцэртам, у якім прынялі ўдзел Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР, Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла БССР, выпеставаная Рыгорам Шырмам, майстры мастацтва сталіцы. Выконваліся творы беларускіх кампазітараў, народныя песні, запісаныя юбілярам. Бурна вітала глядзельная зала артыстаў капэлы за цудоўнае выкананне «Салавейкі» Чайкоўскага і песні А. Багатырова «Люблю наш край» (словы К. Буйло). У гэты час капэлай дырыжыраваў Рыгор Раманавіч Шырма. З вялікім натхненнем і ўздымам выканалі спевакі праслаўленага калектыву «Многія лета» ў гонар нашага дарагога юбіляра.

у кожным стрэчным голасе
шукала
другі матыў, але — не мой,
не мой!

●

Прыйшоў не папракаць, не
наракаць:
так лёгка разлюбіла,
знелюбіла
і ранкам галубіным, як на
крылах,
прачнулася ў другога на руках.

Прыйшоў не дамагацца,
не маліць...
Няхай, няхай, не знаючы
падману,
Як год назад — звініць
струна ў тумане,
як тысячу гадоў — душа
смыліць...

Не, не, я не прыйшоў, каб даць
зарок,
што ўсё-усё мінулае забуду
і што рыдаць, нібы дзікун,
не буду
адзін сярод маўклівых
незнарок...

Прыйшоў не развянчаць,
не абвянчаць.
Пачуцці забінтую — быццам
раны...
Пачаў я позна, скончыў гэтак
рана,
Таму на вуснах — роспачы
пячаць.

●

Ля нашае хаты,
у садзе рабінавым,
вецер асеннюю песню
развучвае...
Глянь,
паважаная,
што нарабілі мы:
гордасць на гордасць —
рукі разлучаны.
Хто вінаваты:
любоў мая ціхая,
ці рэўнасць,
да вострага промня падобная?

. . . . . .

Толькі чуваць,
як адлучана цінькае,
бы птушаня,
наша мара
пад вокнамі.

Цяпер яна крылцамі ў шыбіну
стукае,
Цяпер яна плача...
Раней так не плакала!
Хто яе бачыць?
Хто яе слухае?..
Гордасць на гордасць —
як перад плахаю.

●

Прасветлена-ліловыя аблокі
і зелянява-сіняя вада
сустрэліся... І — як акінуць
вокам —
памчалі ўдалеч... Краю не
відаць.

Такая рань,
такая рунь буяла!
Такое красаванне тут было!..
Вясковы двор
з вярбой і вераб'ямі
здаваўся мне надзорным
караблём.

Ізноў я тут... Ізноў рука
узлятае...
Але — не падтрымаеш ты яе...
Адно, што Прыпяць
гулка-залатая,
як і раней, у левы бераг б'е.

●

Па шэрай,
вострай,
вечаровай пожні,
па травах,
што ў чаканні акалелі,
вярнуся я ў спогад твой
апошні —
схілю калені...
Не прыніжэнне — позняе
прашэнне:
прабач мае памылкі, супакой...
Маё вяртанне —
не, не паражэнне,
а толькі перамога над сабой.

●

Падхопіць, загайдае плынь
ракі...
І ўбачу я тваё аблічча новае,—
дзе пад сузор'ем Белае Рукі
струменіцца сяйво
маладзіковае.
У калыханні белакронных дрэў,
У гуках і дыханні ночы белае
адчуем мы, што свет
памаладзеў,
што зніклі ўсе пачуцці
агрубелыя...

Віктар КАВАЛЕНКА

СУПРАЦЬ НЕПРЫКАЯНАСЦІ

Прысвячаецца Л.

УЧЫСТАЙ, яскрава выражанай звычайнасці ёсць нейкая асаблівая цікавасць. Хоць бы таму, што звычайнасць—з'ява масавая. Больш таго, самае звычайнае, някідкае ў жыцці, бывае, уражвае і захоплівае гэтак жа, як і нябачаная краса.

Гаварыць так — не азначае ганьбіць прыгажосць, чалавечую індывідуальнасць, хоць у французаў была нейкая падстава—праўда, жартоўна—сказаць: «Le beau c'est le laid» («Прыгожае—заўсёды агіднае»).

Аднак не будзем удавацца ў тонкасці французскіх выслоўяў, у якіх, безумоўна, шмат хараства і чароўнасці нават калі яны парадаксальныя. Важна падкрэсліць адно: звычайнае цікавіць незвычайна таму, што яно звычайнае.

І, магчыма, якраз гэтым перш за ўсё прывабліваюць героі рамана А. Асіпенкі «Непрыкаяны маладзік». Прываблліваюць і змушаюць думаць над іх лёсам, бо звычайнае—заўсёды распаўсюджанае, грамадскае.

Але спачатку невялікае літаратуразнаўчае адступленне.

ЛЕГКА прыкмеціць, што апошнімі гадамі ў беларускай прозе проста наўздзіў умацавалася побытавая плынь. Умацавалася як быццам «незаконна», бо наша крытыка ніколі не была вельмі прыхільнай да побыту ў літаратуры, а шмат хто з пісьменнікаў нібы саромеўся яго. К. Чорнага, як вядома, часта папракалі некалі за празмерную быццам бы ўвагу да стыхіі прыземленай штодзённасці ў яго творах. Адзін час лічылася, што побыт і ідэал—рэчы несумяшчальныя. Абвінавачванне ў бытавізме і прыземленасці надоўга стала самым абыходкавым месцам у крытычных выступленнях. Прычым, рэдка наглядалася жаданне разабрацца ў эстэтычных функцыях побытавай стылявой сістэмы, разгледзець, як увасабляецца ў ёй грамадскі ідэал. Бытавізм — гэта дрэнна. І кропка.

Не адносілася з поўным даверам да побытавай плыні і сучасная беларуская крытыка. Прынамсі з'яўленне першых апавяданняў В. Адамчыка з іх глыбокай сэнсавай канцэпцыяй штодзённага вобліку жыцця ўспрымаліся спачатку як нешта нечаканае. Проза У. Дамашэвіча, дзе звычайнае жыццё звычайных людзей паказваецца яшчэ «аголеней», без усякага паэтычнага ўпрыгожвання, азадачвала сяго-таго з крытыкаў яшчэ больш. Некаторыя апавяданні Б. Сачанкі, М. Стральцова крытыкаваліся з пазіцый ледзь не поўнага непрыняцця побыту як жыццёвай сферы мастацкай зацікаўленасці. Асабліва насуплівалася крытыка тады, калі побыт атрымліваў жанравае самастойнае мастацкае асэнсаванне.

Беларуская проза мае багатыя традыцыі ў адлюстраванні побытавай сферы народнага жыцця, таму яна, гэтая сфера, заўсёды складала важны сацыяльны элемент зместу мастацкай літаратуры нават тады, калі яе эстэтычнае значэнне недаацэньвалася. Яна выразна праглядвалася ў творах А. Кулакоўскага, І. Шамякіна, А. Асіпенкі, але менавіта толькі праглядвалася. Прычым побытавыя малюнкі вельмі часта знарок суправаджаліся або перабіваліся «паэтычнымі» адступленнямі, залішне эксплуатаваўся з гэтай мэтай пейзаж як сродак лірычнага аздаблення жыццёвай штодзённічыны. А. Асіпенка нават у загалоўку кнігі «Подых кветак і працы» (1960) не абыходзіўся, як гэта бачна, без кветак, без падкрэсленага лірычнага элементу. Сучасная проза больш вольная ўжо ад неабавязковых і прыгнятальных лірычных «дадаткаў», хоць яшчэ сустракаюцца творы, дзе побытавыя замалёўкі суправаджаюцца пейзажным натопам, у якім літаральна топяцца героі і чытач. Гэта развіццё далёка не лепшых традыцый у адлюстраванні народнага жыцця, ад якіх паступова адыходзяць многія нашы празаікі, нават калі нейзажныя малюнкі выпісаны тонка і бліскуча. Варта падзівіцца дакладнаму адчуванню ўнутранай літаратурнай неабходнасці ў творчасці Ч. Айтматава, які ўмее пейзажную дэталь ператварыць у сацыяльную метафару і сімвал.

Сённяшняя літаратура нібы нанава адчула, што ўвага да штодзённічыны чалавечага жыцця абяцае пашырэнне меры сацыяльнага аналізу, здольна адкрыць у просценькай, прыватнай сітуацыі значнасць сацыяльнай падзеі і драмы. Аднак побыт глыбока раскрываецца ў сваім сацыяльным значэнні тады, калі пісьменнік не задавальняецца павярхоўным маральным апісальніцтвам, калі ён адкрывае ў побыце ўнутраную тэму.

Новы раман А. Асіпенкі «Непрыкаяны маладзік» вельмі адчувальна звязаны з тэндэнцыяй адлюстроўваць тыповасць грамадскага існавання чалавека праз звычайныя распаўсюджаныя моманты яго душэўнага жыцця. Побыт змяняе сваю ролю: з апісальнага фону да дзеяння, з прадмета статычнага адлюстравання становіцца воблікам самога жыцця, сацыялагічным стылем думання аўтара.

І ўсё ж... Раман «Непрыкаяны маладзік» будзіць нейкае супярэчлівае адчуванне ва ўсім, што тычыцца побытавай лініі. Вядома ж, у творы няма даўнейшага «подыху кветак», тонкі арамат якога павінен быў надаць высакароднасці звычайным учынкам герояў, іх сціплай, не заўсёды гераічнай працы. Аднак ці паверыў пісьменнік да канца ў сацыяльную выразнасць і глыбіню штодзённых чалавечых спраў? Унутрана, мабыць, паверыў, бо жыццё герояў у яго побытавых абрысах раскрываецца натуральна, поўна і паслядоўна. Але чаму сюжэт рамана так ускладнёны шматлікімі і мала звязанымі з асноўным дзеяннем эпічнымі разваротамі, у якія трапляюць праца вучоных-механізатараў, геолагаў-нафтавікоў, медыцынскіх працаўнікоў, турботы калгаснага кіраўніцтва, школьныя справы? Праўда, усё гэта паказана праўдзіва, цікава, пераканальна і часта ў падзвычай надзённым грамадскім асвятленні. Асабліва дакладна ахарактарызаваны як сацыяльны тып Рысакоў, які, кіруючы буйным навукова-даследчым інстытутам, зусім не зацікаўлены сапраўдным развіццём навукі, а спекулюючы на вялікай гаспадарчай патрэбе ў рацыянальных навуковых адкрыццях, клапоціцца толькі пра ўласную кар'еру і гэтым губіць справу. Прамой жа, адкрытай сувязі з галоўнай ідэяй шчодрыя, падрабязныя замалёўкі прафесійных інтарэсаў людзей, здаецца, не маюць. Яны, як правіла, каларытныя самі па сабе, багатыя на канкрэтныя жыццёвыя нагляданні, але развіццё іх зместу лакальнае. Вось чаму можа здацца, што яны з'явіліся ў творы на ролю колішніх «кветак», каб ускосна зняць магчымыя падазрэнні некаторых крытыкаў у побытавай вузкасці задумы, у сацыяльнай ізаляванасці аўтарскага погляду на сучаснасць. Між тым, тыя падзеі, якія склалі асноўную сюжэтную канву рамана—гісторыя ўзаемаадносін Веры Паўлаўны з Жарнасекам,—ніякага дадатковага знешняга «апраўдання» ў сваёй грамадскай значнасці не вымагаюць, бо самі па сабе маюць выразны сацыяльны сэнс.

ШТО ЗА ЧАЛАВЕК галоўная гераіня — Вера Паўлаўна? Спачатку — звычайная жанчына. Нічым не выдатная, сціплая. Такіх, як яна, шмат. Яны без асаблівых прэтэнзій праходзяць праз жыццё, цеплячы сваімі штодзённымі сардэчнымі турботамі свет, больш даючы яму, чым беручы ад яго. Мала цікавячыся абстрактнай філасофіяй жыцця, такія жанчыны цудоўна ведаюць яго практычна, становяцца сапраўднымі прафесарамі побыту. Яны прыгожыя гэтай сваёй звычайнасцю.

Вось і ў Веры Паўлаўны склаўся якраз падобны лад жыцця. Хоць яна настаўніца, інтэлігентка, але думкі яе пра свет нязначныя, незапамінальныя, пазбаўленыя якіх-небудзь адзнак напружанай працы уласнай душы. Яна калі і гаворыць што «са значэннем», то гэта не яе нараканне, а паспешліва вычытанае або злоўленае ад іншых. Характэрная адна яе размова з Жарнасекам:

«— Непадзельнае каханне было заўсёды,—напомніла Вера Паўлаўна.—У сусветнай літаратуры...—пачала яна і адчула, што гаворыць з ім, як з вучнем:—Даруйце, я здаецца, пачынаю чытаць вам лекцыю».

Але ці такі гэта ўжо вялікі мінус для жанчыны, у якой хапае штодзённых клопатаў пра сям'ю, што яна не вялікі філосаф і мысліцель? Ёй зусім даволі тых жыццёвых інтарэсаў, якія ў яе ёсць. Наогул яна задаволена ўсім і сабою, сваёй доляй таксама. Малая дачка, якая выклікае радасную адданасць і хваляванне, муж, які займае віднае грамадскае становішча, што надае вагі ёй самой як ва ўласных вачах, так і сярод людзей, урэшце—праца ў школе, якая робіць яе жыццё, калі не займальным, то ва ўсякім выпадку не сумным. Сапраўды, ці гэтага мала?—

І ўсё ішло б, напэўна, гладка ў жыцці Веры Паўлаўны, калі б, паехаўшы ў адведкі да сястры, яна не сустрэлася з Жарнасекам. З гэтага і пачынаецца раман.

У гераіні каханне? Як сказаць... Калі каханне, то нейкае асаблівае. Памяркуйце самі. Выходзіць, Вера Паўлаўна, яшчэ не пазнаёміўшыся з Жарнасекам, была настроена на каханне з ім. «...Яна не зводзіла вачэй з чалавека, да якога яны падыходзілі. Гэта было не зусім прыстойна. Вера Паўлаўна разумела, што яе позірк залішне доўга затрымаўся на незнаёмым, але яна чамусьці не магла адвесці вачэй і зноў зазлавала на сябе». Тут каханне, як гэта відаць, не з першага позірку, а нават... да першага позірку.

Дзіўна таксама, што зараджэнне закаханасці неяк вельмі ж мала змяняе душу Веры Паўлаўны, яно надзвычай беднае на перажыванні, на драматычныя ўсплёскі пачуцця. Так, так!—ніякага шчырага сардэчнага парывання, якое падняло б гераіню да новага прыгожага і багацейшага духоўнага існавання, не наглядаецца. Амаль уся душэўная «гаспадарка» застаецца непарушанай. Успомнім, што азначала каханне для Кацярыны Астроўскага, Анны Карэнінай Талстога.

Дык дзе ж прычына таго, што Вера Паўлаўна так прагне кахання, калі яно ёй як быццам непатрэбна, калі яна як чалавек не здольная нават пасапраўднаму перажываць гэтае пачуццё?

АЛЕ Ж ПАВІННА быць нейкая жыццёвая логіка ў паводзінах чалавека.

Магчыма, Вера Паўлаўна ў такой ступені расчаравалася ў вартасцях свайго мужа Сяргея Сяргеевіча і гэтак узненавідзела яго, што гатова кінуцца на шыю кожнаму і ў спешцы прыняць звычайную прыхільнасць за вялікае пачуццё. Не. Адносіны яе да мужа звычайныя. Праўда, Сяргей Сяргеевіч трохі сухаваты па характары, любіць часам паказаць саліднасць і самавітасць, трохі кансерватыўны ў поглядах. Але ўсё гэта ў меру для яго ўзросту. Вера Паўлаўна зусім не пакутвала ад дрэнных замашак мужа, яна іх і не заўважала, бо да яе ён ставіўся заўсёды ўважліва, паслужліва і далікатна, з ледзь прыхаванай ласкавасцю і пяшчотай. Сваю высокую пасаду ён займае заслужана, бо чалавек ён разумны і дзелавы. Па абавязку службы ім зроблена шмат карыснага. Нездарма яго не любіць і пабойваецца кар'ерыст Рысакоў. Сваім становішчам, якое забяспечыў Веры Паўлаўне муж, яна нават ганарыцца. І раптам!..

Але «раптам» нічога не здараецца, калі глядзець на свет вачыма строгага рэаліста. Павінна ж быць нейкая важная прычына, чаму Вера Паўлаўна, не ведаючы добра, кахае яна Жарнасека ці не, ідзе на хуткае збліжэнне з ім. Яшчэ ні разу не бачыла—пакахала ўжо. А сустрэўшыся з ім, забываецца пра ўсё на свеце, забываецца нават, што едзе да хворай і няшчаснай сястры. «З таго часу, як паехалі лесам, Веру Паўлаўну не пакідала пачуццё замілаванасці. Усё на свеце: і хатнія турботы, і школа, і гэты клопат з Галяй, можа самы непрыемны, — усё адступілася кудысьці далёка, а ў душы астаўся дзіўны спакой». Вось так. Сустрэўся Жарнасек — і ўсё імгненна перамянілася. Як быццам і не дзіва. Пры першым поглядзе на Жарнасека «яе ўразіў яго твар, абветраны, сухаваты, але такі адухоўлены, што па ім, здавалася, можна было чытаць думкі». Але ці гэтага дастаткова, каб пакахаць? Хіба не вядома, што думкі па выразу твару чытаюцца найбольш у людзей маларазвітых, наіўных, а такпадстаў услых ганіць каханую Жарнасека, а калі ён прыйшоў, то, вядома ж, у яго цёмна-карых вачах (колер, які збіў з тропу не адну прыгажуню ў раманах) бачыць пакуту, схаваную горыч і расчараванне. А ў думках гаворыць да яго: «Я хацела б памагчы вам і не ведаю як». Пакуль што не будзем вельмі шкадаваць Веру Паўлаўну за бездапаможнасць. Яна здагадлівая. Вось чуе яна праз перагародку, як Жарнасек жаліцца свайму сябру, што яго каханая дала яму ад варот паварот. І што ж? «Ёй захацелася падняцца з ложка і сказаць некалькі тых адзіных слоў, якімі жанчыны умеюць суцешыць мужчын». Здагадалася! Каментары, як кажуць, лішнія.

Які ж вывад з усяго гэтага? Вера Паўлаўна падкая на новыя знаёмствы з мужчынамі? Як быццам—не. Успомнім, як ёй, калі яна ехала ў цягніку, не спадабаўся «нейкі спартсмен, які бесцырымонна змераў яе нахабным позіркам». Не спадабаўся—гэта праўда. Але ўсё ж такі... Калі нельга было не заўважаць спартсмена—ехалі ў адным купэ,—то позірк яго ўжо можна было і не прымкмеціць, калі б Вера Паўлаўна была раўнадушная да таго, як на яе глядзяць мужчыны.

ТАКІМ ЧЫНАМ, Вера Паўлаўна дома і ў адлучцы—нібы дзве розныя жанчыны. Да паездкі—увасабленне сціпласці, душэўнай ураўнаважанасці, заклапочанасці сям'ёй, а за домам—мала прыхаваная напорыстасць у новых знаёмствах, даволі бесцырымоннае навязванне ўласнай персоны, хуткае, пасюраннае выспяванне сардэчных прывязанасцей. Пры такой палярнай супярэчнасці паводзін недзе чалавек фальшывы: дома ці ў дарозе. Раз у адлучцы Вера Паўлаўна мела магчымасць быць сама сабой, значыць, — яна няшчырая дома.

Але ж у дамашнім жыцці гераіні ўсё прыстойна. У яе душы не было нават слабага адчування нейкай незадаволенасці ці ўсведамлення свайго фальшывага становішча. Ну і што ж? Гэта яшчэ ніякі не доказ. Матлю ж здарыцца так, што ўпершыню варухнулася ў душы неўсвядомленая незадаволенасць якраз у дарозе, за парогам дома. А дзе прычына?

У тым то і справа, што прычыны як быццам няма. Прынамсі, гераіня яе не бачыць і не адчувае. Аднак яна ёсць незалежна ад гэтага, бо інакш не перамяніліся б паводзіны Веры Паўлаўны.

Хутчэй за ўсё гераіня рамана А. Асіпенкі і няздатная ўсвядоміць глыбіню этычныя матывы сваіх паводзін. Усё ў яе атрымліваецца стыхійна, але гэтая стыхійнасць уаўная. За ёй—пэўнае аб'ектыўнае становішча гераіні.

Хоць яна і задаволена ўсім, нешта гняло Веру Паўлаўну ў папярэднім жыцці, калі яна так ахвотна накінулася на новыя знаёмствы. Відаць, ёй было сумна. Але гэта не той сум, які ўзнікае ад неахвоты ці немагчымасці

заняцца справай. Вера Паўлаўна якраз занята шмат—сям'ёй, працай у школе, клопатамі пра шчасце сястры. Але гэты занятак, аказваецца, не вычэрпвае ўсёй яе энергіі, не захапляе ўсю істоту. Ён у нейкай меры «казённы», дзяжурны, робіцца па абавязку, не захоплівае гераіню як асобу, чалавечую індывідуальнасць. Адсюль сум.

Сум ад суму розніцца. Ёсць сум, які ідзе з глыбінь чалавечай душы, і яго не ўняць дзелавой мітуслівасцю, колькасцю грамадскіх нагрузак і акуратным наведваннем арганізаваных мясцкомам вечароў адпачынку. Каб такі сум не ўзнікаў, патрэбна духоўная зрошчанасць чалавека з яго заняткам.

А. Асіпенка паказвае ў сваім рамане, што далёка не ўсім людзям пашанцавала дабіцца падобнай зрошчанасці, якая дае вышэйшую асалоду жыцця. Ёсць і такія, як Вера Паўлаўна, хто не здатны на духоўную аддачу сябе свайму часу. Яны ад гэтага пакутуюць і нечага шукаюць, не заўсёды ўмеючы знайсці той шлях, які выведзе іх да мэты.

Пісьменнік уводзіць у ідэйна-мастацкую сістэму свайго рамана вобраз «непрыкаянага маладзіка». Непрыкаянасць як стан чалавека— гэта трагедыя. Перажываючы сваю ўнутраную аддаленасць, душэўную адчужанасць ад свету, «непрыкаяныя» людзі блукаюць па жыцці, множачы свае і чужыя драмы. «Непрыкаянасць» у той ці іншай меры закранае шмат якіх герояў рамана А. Асіпенкі.

Было дарогу цяжка збудаваць,
Наладзіць рух на ёй цяпер—складаней.
(А. Грачанікаў, «Матацыклісты»).

Цьмянае адчуванне незадаволенасці сваім жыццём пабуджае Веру Паўлаўну фарсіраваць сваё пачуццё блізкасці да Жарнасека. Гэтае пачуццё яна прымае за каханне.

АЛЕ ЦІ МОЖА быць каханне каханнем, калі яно павінна быць яшчэ нечым, акрамя самога сябе? Для Веры Паўлаўны каханне—перш за ўсё сродак пазбавіцца халоднасці сваіх адносін да жыцця, непрыкаянасці. Таму ў яе каханні надзвычай мала цеплыні пачуцця, сардэчнай шчырасці, непасрэднасці і зашмат разумовых абходаў і прыёмаў, якія здаюцца разлічанымі. Каханне ад гэтага выглядае штучным, выдуманым.

Вось Вера Паўлаўна едзе з адведкаў дамоў разам з Жарнасекам у адным вагоне. Размаўляюць пра каханне. Момант адказны. Ад яго будзе залежаць, кім яны раз'едуцца: найбліжэйшымі людзьмі ці проста добрымі знаёмымі. Вера Паўлаўна непрыхавана какетнічае, хоць і бачыць, што Жарнасек яшчэ перажывае ў душы разрыў з былой каханай. Удумаемся ў сэнс паводзін гераіні. «Дзіўна: Веры Паўлаўне ва ўсёй гэтай размове было важна не тое, пра што гаварылася, а як гаварылася—усе тыя адценні ў голасе, нешта да канца не выказанае, тое, што не магло быць выказана, што адчуваецца сэрцам, а не розумам. Яна ўсё смялей пазірала на Жарнасека, ужо дрэнна бачачы яго твар». Тут, як кажуць, усё ясна.

Вечарам Жарнасек запрашае яе ў вагон-рэстаран. Яна ідзе. «Але ж я не п'ю... Амаль,—сказала Вера Паўлаўна, пазіраючы на Жарнасека з той мілай усмешкай, якая павінна была сказаць яму: «Я выпіваю толькі таму, што мне прыемна быць з вамі». А далей ужо зусім не прыкрыта: «Ой, я зусім п'яная,—і нечакана махнула рукой.—Наліце... Мусіць, я сёння нап'юся. І не судзіце строга. Вы знаеце, мне здаецца, што я вырвалася з вельмі душнага пакоя на прастор—мне так хораша!»

Калі яны вярталіся назад і пераходзілі тамбур, «Жарнасеку здалося, што Вера Паўлаўна пахіснулася, вось-вось упадзе, і ён, не памятаючы, як абняў яе». Што ж атрымалася далей? «Божа, навошта,—спалохана і, як Жарнасеку здалося, злосна сказала яна». І, нарэшце, сцэна ў купэ:

«— Даруйце мне...—прашаптаў ён, не ведаючы, што сказаць. Вера Паўлаўна, здалося, не пачула яго слоў.

— А цяпер паслухайце, што я мушу вам сказаць. Мы не павінны больш бачыцца. Ні адной хвіліны. Вы пойдзеце да правадніцы і папросіце, каб яна перавяла мяне ў другое купэ. Я вас вельмі прашу.

Жарнасек памалу, як падбіты, выходзіў з купэ.

Ёй здалося, што доўга-доўга нікога не было. Потым зайшла правадніца, моўчкі ўзяла Жарнасекаў партфель».

Адкуль узялася такая злосць і жорсткасць у гераіні, зусім неапраўданая этычна? Хіба не выказвала яна да Жарнасека больш чым сімпатыю? І раптам — рэзкая, абражальная для яго перамена. Яго проста выгналі не толькі без шкадавання, нават без элементарнай далікатнасці, зусім не падумалі пра яго душэўны стан і перажыванні.

Сваёй жорсткасці Вера Паўлаўна, вядома, не ўсведамляе. Каб хто сказаў ёй, што яна жорсткая, то пакрыўдзілася б і не паверыла б. Гэтая рыса яе характару ідзе, відаць, ад нізкага духоўнага ўзроўню, ад недастаткова развітых этычных уяўленняў.

Што за жорсткасцю гераіні праглядвае эгаізм, няма ніякага сумнення. Але чым ён тлумачыцца? Ці не боязню? Яна сама давяла свае ўзаемаадносіны з Жарнасекам да такой блізкасці, калі трэба было рабіць рашучы крок, і сама ж спалохалася гэтага кроку, крута павярнула назад, пакрыўдзіўшы і абразіўшы Жарнасека. Ці не пабаялася яна страціць ужо набытае, хоць яно і не зусім яе ўнутрана задавальняе? Але ж можа быць і горш...

Такім чынам, Вера Паўлаўна адначасова і горнецца да Жарнасека і баіцца прайграць. Гэта мяшчанскі жыццёвы прынцып. І форма разрыву з Жарнасекам — мяшчанскі эгаістычны сродак засцерагчы ўласны наладжаны дабрабыт, пагрозу якому сама ж і стварыла. Пагуляўшы з Жарнасекам у каханне ці, ярнамсі, стварыўшы ілюзію шматабяцаючай прыхільнасці, яна свайго дасягла: яе заляцанні не прапалі дарма. І гэта лесціць яе самалюбству, робіць яе жыццё, як ёй здаецца, больш цікавым. Каханне для яе — толькі «разрыўка».

КАЛІ Б Вера Паўлаўна аказалася здатная на сапраўднае вялікае пачуццё, ёй удалося б уцячы ад непрыкаянасці, сур'ёзна, у сутнасці змяніць сваё жыццё. Але ў тым то і справа, што яна няздатная. Ёй бракуе духоўнай самастойнасці. Залішне яна прывыкла рабіць так, як усе. Успомнім школьную гісторыю з таемным вучнёўскім гуртком — «саюзам рыцараў без плашча і кінжала». Спачатку Вера Паўлаўна разумее, што гэты саюз — «звычайная забаўка дзяцей, якія прагнуць рамантыкі і таямнічасці». Але некаторым настаўнікам выгадна, каб надаць гісторыі з гуртком сур'ёзны ход, асудзіць дзіцячую забаву як нешта злачынае. Пад уздзеяннем іншых Вера Паўлаўна пасля доўгай упартасці ўсё ж паддаецца націску і крывадушна прызнае, што вучні зарганізаваліся з нядобрымі мэтамі.

Маючы схільнасць рабіць так, «як усе», не маючы аб'ектыўных крытэрыяў у сваіх паводзінах, Вера Паўлаўна і ў інтымным жыцці вырашае праблемы, «як усе», як шмат хто іншы з герояў рамана. Як і яны, яна шукае душэўнага прыстанішча ў лёгкім флірце, змушаючы сябе паверыць, што гэта вялікае каханне.

Ганяецца за прывідам сапраўднага кахання старшыня калгаса Васько. Ён цішком сустракаецца з дзяўчынай — маладым заатэхнікам. Яго не спыняе нават тое, што ад рэўнасці псіхічна захворвае жонка. У шмат каго з герояў знаходзіцца ў запасе новая ці даўняя сімпатыя, ад якой чакаюць, што ў пэўны момант яна здолее — ці гэта толькі будзе здавацца? — зняць з душы цяжар непрыкаянасці. Часам здаецца, што прагай таемнага, забароненага кахання захоплены ўсе людзі. Вось невялікая сцэнка на курортнай станцыі: «На лавачцы, прыхінуўшыся адно да аднаго, сядзелі мужчына з жанчынай, а ля іх сіратліва стаялі два чамаданы, зусім розныя, каб належаць адной сям'і».

Калі прытварацца, то прытварацца! Хутка Вера Паўлаўна — вядома ж, з-за хваробы — апынулася на Каўказе разам з... Жарнасекам. Пачынаецца новы тур любоўнай гульні, вельмі падобны на першы, хоць гераіня і прызнаецца, што за «тое сваё падарожжа ў купэ, за той свой учынак ёй было сорамна». І то добра. Але дзіўна іншае. Вера Паўлаўна зноў паўтарае сябе. Яна часта сустракаецца з Жарнасекам, гэтак жа какетнічае, ходзіць з ім на прагулкі, п'е віно, гаворыць яму кампліменты. На гэты раз, захоплены яе прыгажосцю і абаяльнасцю, Жарнасек прызнаецца адкрыта: «Я кахаю вас». І што ж чуе ў адказ? «Вера Паўлаўна спынілася, павярнулася да яго тварам: «Ніколі, чуеце, ніколі не кажыце мне пра каханне. І наогул мы больш не будзем сустракацца». Вось табе і маеш!

Як чалавек далікатны, Жарнасек зноў просіць прабачэння. І вось характэрная рэакцыя Веры Паўлаўны: «Не, не, — перапыніла яна яго, — не трэба. Я не хачу слухаць. Не прымушайце мяне пакутваць». І хоць бы малейшы зрух у душы ад таго, што іншыя пакутуюць. Яна быццам і не здагадваецца пра гэта, бо, каб здагадацца, трэба... кахаць.

А было ж тут, на Каўказе: «Жарнасек паглядзеў на Веру Паўлаўну. Іх позіркі сустрэліся. «Гавары, гавары, мне ўсё роўна, што ты кажаш, бо мне падабаецца твой голас», — сказалі яму вочы Веры Паўлаўны».

Каб доўга не разважаць, чаму Вера Паўлаўна зноў паводзіць сябе жорстка, ці не лепей прывесці эпізод, дзе так дакладна выяўляецца яе характар: «Адлегласць, якую Вера Паўлаўна адчувала інтуіцыяй, а не розумам, перастала існаваць. Ёй захацелася зрабіць крок, каб адразу пераступіць цераз нізіну і пасёлак на тую другую гару, з лысым схілам, а адтуль яшчэ далей. Але як толькі паявілася гэтае неадольнае жаданне, Вера Паўлаўна адчула, што па спіне пабеглі мурашкі, а ў скроні закалоў страх... Яна прысела на кукішкі, а потым прылегла на траву. У галаве адразу перастала кружыцца».

«Прысесці на кукішкі», прыгнуцца, сцяцца, калі страшна ад уласных жаданняў — гэта жыццёвая манера, якая мацнейшая за самую гераіню. Яна толькі тое і робіць, што «прысядае», калі наступаюць рашучыя моманты.

Нарэшце яны зноў сустракаюцца. «Вера Паўлаўна павярнулася да яго, паглядзела яму ў вочы, і тады нешта штурхнула іх адно да другога». І зноў жорсткасць. Вера Паўлаўна абвяшчае Жарнасеку, што едзе дамоў і забараняе яму праводзіць яе.

У канцы рамана Вера Паўлаўна пакідае Сяргея Сяргеевіча, але толькі пасля таго, як ён ад пабочных людзей даведваецца пра яе паводзіны. А перад гэтым, з прыездам дамоў, было адкрыццё: «Хлусіць не так ужо і цяжка, як здавалася». Неяк не верыцца, што разрыў з мужам у гераіні сур'ёзны. Так і думаецца, што гэта чарговае «прысяданне». А можа і яна пойдзе да Жарнасека — раз такое здарылася? Тады ёй давядзецца імітаваць у жыцці з ім ужо не закаханасць, а само каханне. Яна прыйдзе да таго, чаго заслугоўвае. Імітаванае каханне не можа прывесці чалавека ў новы душэўны стан. Ён зможа толькі перайсці з аднаго круга ў аналагічны другі — і зноў пачнецца тое самае. Магчыма нават, што Вера Паўлаўна страціць і некаторыя з дадатных рыс, якія яшчэ маюцца ў яе характары, бо гульня ў каханне не ўзбагачае ўнутраны свет чалавека, а, наадварот, абмяжоўвае глыбокія пачуцці, так або інакш вымагае амаральнасці.

ЦІ ПРАВІЛЬНА зрабіў пісьменнік, што так падрабязна, як даследчык, прасачыў пэўны кавалак з жыцця сваёй гераіні, паказаў яе такой, якой яна ёсць, убачыўшы ў яе светаадчуванні рысы, несумяшчальныя з перадавымі імкненнямі нашага грамадства, з яго ідэаламі? Без заглыблення ў душэўны стан, без падрабязнага асвятлення галоўнага накірунку ўнутранага жыцця гераіні асуджэнне мяшчанства магло аказацца галаслоўным і непераканальным. Аўтар непрымірымы да вузкага светапогляду людзей, да тых сацыяльных рыс у іх паводзінах, якія складаюць аснову мяшчанства. Пісьменнік наносіць удар па мяшчанству ў самы нявыгадны для мяшчанства, падатлівы для нападу момант — у час яго «пераапранання» ў высакародства і прыстойнасць. У рамане «Непрыкаяны маладзік» раскрыта «пераапрананне» ў каханне. Але ж такім жа поспехам і такімі ж прыёмамі яно «пераапранаецца» ў грамадзянскасць і патрыятызм. Пісьменнік б'е па ім тады, калі яно не надзела яшчэ ўсіх сваіх доспехаў. Бо калі Вера Паўлаўна ўвойдзе канчаткова ў роль закаханай, вельмі цяжка будзе паказаць і даказаць, што гэта не каханне.

Этычны і грамадзянскі ідэал, увасоблены ў змесце твора, высокі і выразны. Пісьменнік заўважыў пагрозу душэўнай непрыкаянасці, убачыў і раскрыў няплённыя, бездапаможныя, падманныя шляхі, праз якія некаторыя людзі спрабуюць пераадолець сваю непрыкаянасць. Паказаў іх марнасць. Непрыкаянасць абміне таго, хто ўмее жыць вялікімі імкненнямі.

ДВОЕ

Фотазамалёўкі Я. МЯЦЕЛІЦЫ.

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ РЭЖЫСЁРАЎ

адбылася днямі ў сталіцы Беларусі. На яе з'ехаліся ўсе рэжысёры тэатраў рэспублікі.

Канферэнцыю адкрыў міністр культуры БССР Ю. Міхневіч. Ён гаварыў пра вялікую адказнасць дзеячоў мастацтва перад партыяй і народам. Рэжысёр-асоба, рэжысёр-індывідуальнасць, які мае сваё бачанне і выразную ідэйную і мастацкую пазіцыю здольны на смелы пошук, — такім павінен быць чалавек, што ўзначальвае тэатр. І тады кожны калектыў будзе мець сваё непаўторнае аблічча, афішы не будуць дубліраваць адна адну, як гэта пакуль што здараецца ў абласных тэатрах. У нас ёсць сапраўдныя рэжысёрскія ўдачы, сказаў Ю. Міхневіч, якія па вартасцях былі ацэнены грамадскасцю і крытыкай. Але далёка яшчэ не поўна адлюстраваны ў спектаклях велічныя гераічныя здзяйсненні савецкага народа. Стварыць паўнакроўны вобраз нашага сучасніка, паказаць яго шматграннае жыццё, стваральную працу, шырокія далягляды — вось першаступенная задача тэатраў.

На канферэнцыі ўзніміліся пытанні, што асабліва хвалююць сёння тэатр: рэжысёрская задума і яе ўвасабленне, пластычны вобраз спектакля, скразное дзеянне і звышзадача спектакля, работа з акцёрам, пошукі сучаснага стылю і інш. З цікавымі змястоўнымі прамовамі выступілі галоўны рэжысёр тэатра імя Коласа С. Казіміроўскі, рэжысёр тэатра імя Купалы В. Раеўскі, галоўны рэжысёр Дзяржаўнага рускага тэатра БССР імя Горкага Ф. Шэйн, старшы выкладчык Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута А. Даброцін, галоўны рэжысёр Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі ў Бабруйску В. Каралько, загадчык кафедры акцёрскага майстэрства тэатральна-мастацкага інстытута Ул. Маланкін, прафесар школы-студыі МХАТ СССР В. Манюкоў і іншыя.

Падрабязную справаздачу з Рэспубліканскай канферэнцыі рэжысёраў чытайце ў наступным нумары нашай газеты.

ПРАЦЯГ БУДЗЕ?..

Вечар творчай справаздачы маладых акцёраў Рэспубліканскага тэатра юнага гледача імя 50-годдзя ЛКСМБ

Гэтае прадстаўленне ў тэатры юнага гледача было не зусім звычайным. Яно пачалося вясёлай песенькай-уступам усіх яго ўдзельнікаў. Дэманстравала сваё майстэрства моладзь тэатра. Адзін за адным былі паказаны ўрыўкі са спектакляў: «Прыгоды Бураціна», «Дай вады, калодзеж!», «Пэпі — Доўгая панчоха», «Несцерка», «Італьянская трагедыя» і іншых. Спачатку празмерна хвалюючыся і таму крышку скаванна, потым «разыграўшыся» як след, артысты закончылі вечар вясёлай і тэмпераментнай сцэнай з камедыі «Абрабаванне апоўначы».

Наш карэспандэнт узяў невялічкія інтэрв'ю ў прысутных у зале дзеячоў мастацтва.

— Л. Тарасава, якая падрыхтавала сённяшні вечар, яшчэ раз паказала сябе здольным рэжысёрам,—сказаў старшыня тэатральнай секцыі Дома мастацтваў народны артыст СССР З. Стома. — Прадстаўленне атрымалася цікавым, цэласным. Я думаю, яно нават мае права на далейшае самастойнае жыццё.

— Мне спадабаліся Ю. Палосіна, К. Доўнар, М. Патапчук, В. Турмовіч, Б. Піскуч, Л. Улашчанка, А. Кашпераў, Ул. Макараў і іншыя, — гаворыць заслужаная артыстка БССР Л. Шынко. — Зрэшты, тут цяжка вызначыць самых лепшых, таму што мы глядзелі не спектакль, а своеасаблівы канцэрт, дзе кожны мог праявіцца калі не зусім поўна, то дастаткова цікава.

Рэжысёр Акадэмічнага тэатра Янкі Купалы Б. Луцэнка зазначыў, што такія вечары могуць стаць арыгінальнай формай знаёмства з маладымі артыстамі розных тэатраў.

— Хацелася б, каб у будучым, — сказаў ён, — у такія канцэрты ўключаліся і самастойныя работы акцёраў — іх заяўкі на ролі, пра якія яны мараць.

СПЕКТАКЛЬ АДБЫЎСЯ. П'еса, якая мае сямідзесяцігадовую гісторыю тэатральных трактовак, зноў набыла сцэнічнае жыццё ў Брэсце. Тэатр звярнуўся да «Мяшчан» трэці раз: гэтая назва, дарэчы, была адной з першых на афішы калектыву, калі ён яшчэ пераносіў свае студэнцкія работы на прафесійныя падмосткі. Мабыць, і трупа, і яе мастацкае кіраўніцтва часамі адчуваюць патрэбу зноў і зноў уваходзіць у «свет Горкага», дзе так многа творчай спажывы для рэжысёрскіх шуканняў, для акцёрскага роздуму і паглыблення ў складаную чалавечую натуру. І на гэты раз пастаноўшчык Г. Волкаў таксама, на маю думку, ставіў перад тэатрам вельмі важныя педагагічныя мэты. Яны захапілі ўдзельнікаў спектакля. Большасць выканаўцаў роляў усімі сваімі паводзінамі пераконвае нас у праўдзе паказанага імі жыцця— на сцэне ёсць «дом Бяссеменавых».

Які ж ён у Брэсце?

Традыцыйны.

Я нават сказаў бы, што ў рэжысуры Г. Волкава заўважаеш нешта дэманстрацыйна агульнапрынятае. Пачынаючы з падкрэслена павагі да горкаўскіх рэмарак: калі аўтар падказаў, каб на сцэне быў цяжкі і няўклюдны буфет, то мы яго і бачым — цяжкі і няўклюдны, — як бачым і прадугледжаныя рэмаркай філадэндроны, стары і хворы гадзіннік у футарале чырвонага дрэва, куфар ля самай рампы (там, дзе павінна ўгадвацца «чацвёртая сцяна» бяссеменаўскага дома)... Разам з мастаком Ю. Ігліным і выканаўцамі роляў рэжысёр стварае надзвычай сумную і па-свойму ўстойлівую атмасферу дома, дзе гадамі, калі толькі не стагоддзямі, усё мае сваё месца і свой час, а жыццё зводзілася да «абрастання» рэчаў новымі рэчамі і людзей новымі сямейнымі сувязямі.

Зводзілася... Калісьці раней. А цяпер не тое. Чыгуначны машыніст Ніл і часовы жыхар у тутэйшым доме Цецераў парушылі, здавалася б, на вякі ўсталяваны парадак. Першы —учынкам: ён узяў за жонку Полю Пярчыхіну замест наканаванай яму галавой сямейства Таццяны Бяссеменавай. Другі — словамі, вострымі, як лязо брытвы, і гарачымі ад сваёй бязлітаснай праўдзівасці...

Даруйце, я пачынаю пераказваць змест хрэстаматыйна вядомай п'есы.

Так пастаўлены і спектакль. Без адкрыццяў і навацый... Ён дае яшчэ адну сцэнічную версію драме, якую амаль заўсёды тэатры чыталі і чытаюць так, як яна была прачытана ўпершыню Маскоўскім Мастацкім. Праўда, Г. Волкаў, відаць, знаёмы і з таўстаногаўскай трактоўкай «Мяшчан». Больш таго, ён падзяляе адносіны да п'есы і яе герояў ленінградскага рэжысёра-эксперыментатара. Таму ў зусім прывычны малюнак спектакля ў Брэсце ўнесены асобныя мастацкія акцэнты, якіх раней, да спектакля Г. Таўстаногава, тэатры пазбягалі наогул або ўводзілі вельмі асцярожна. Гаворка ідзе пра трактоўку вобразаў Ніла і старога Бяссеменава.

Артыст І. Мацкевіч у адпаведнасці з таўстаногаўскім намерам, прынятым і Г. Волкавым, як бы «здымае» з Ніла німб рамантычнага героя, ён і не збіраецца паказваць яго хоць бы трошкі падобным да ідэалу Полі, запазычанага ёю са сцэны мясцовага тэатра ў маленькім правінцыяльным горадзе, да дона Сезара дэ Базана. Яму даражэй быць Нілам зусім зямным: стомленым пасля чарговага рэйса па паравозе, галодным, няўрымслівым у сцвярджэнні свайго права быць незалежным ад Бяссеменавых і іх жыццёвага статута. Такі гэты персанаж і атрымаўся на сцэне—дзёрзка малады і здаровы целам і духам, ён ужо, як кажуць, фактам свайго існавання ў доме пераканананага ўласніка ўзрывае спакой прыціхшаных і насцярожаных сцен таго дома. Тэатр знарок не дае «мітынгаваць» Нілу, калі з яго вуснаў зрываюцца вядомыя афарызмы —«Правы не даюць, правы бяруць» або «Гаспадар той, хто працуе», бо гэты Ніл не ўпершыню, відаць, такім чынам абражае Бяссеменава, выклікаючы яго на спрэчку і нават на сварку.

Праўда, артыст і рэжысёр, знайшоўшы ўнутранае апраўданне псіхалагічным імпульсам героя, раптам нібы забываюцца пра сваю трактоўку, і тады І. Мацкевіч усё ж пачынае адчуваць пад сабой прыступкі трыбуны і гаворыць не так партнёрам, як нам, гледачам, пра гатоўнасць яго Ніла ўшчэнт разбіць «мудрую» мараль бяссеменаўшчыны: «Няма такога раскладу руху, які б не змяняўся!», «Я ведаю ... што я не асілак, а проста— сумленны, здаровы чалавек, і я ўсё-такі кажу: нічога! Наша возьме!..».

Застаецца ўражанне дваістае: быццам тэатр і спрабуе прытрымлівацца «таўстаногаўскай» трактоўкі Ніла, але акцёр здольны і на зусім адваротны паказ гэтага няпростага і ў аўтарскай задуме вобраза. Мабыць, І. Мацкевіч яшчэ прыслухоўваецца да самога сябе, імкнучыся адчуць натуральную плынь эмоцый і роздуму героя ў прапанаваным яму рэжысурай малюнку ролі. Ці не адсюль у яго Ніле ёсць рысы наогул бесцырымоннага чалавека, які ніколі і не шанаваў свайго выхавацеля Васіля Васілевіча Бяссеменава? Ці не таму артыст так часта бывае падкрэслена «нахабны» ў дыялогах з іншымі персанажамі спектакля? Спалучэнне традыцыйна-горкаўскага і нават хрэстаматыйнага Ніла з Нілам «ад Таўстаногава» пакуль што ў брэсцкім спектаклі не злілося ў адзіна магчымы ў гэтым спектаклі на гэтай сцэне тэатральны вобраз.

Барыс БУР'ЯН

ВОСТРАЎ БЯССЕМЕНАВЫХ

«МЯШЧАНЕ» М. ГОРКАГА Ў БРЭСЦКІМ ТЭАТРЫ ІМЯ ЛЕНІНСКАГА КАМСАМОЛА БЕЛАРУСІ

Кожны выхад на плацдарм бітвы Васіля Васілевіча — гэта і сапраўды працяг нейкага блукання па пакутах. Так іграе А. Логінаў. Зноў жа мы здагадваемся, што без уплыву ленінградскіх «Мяшчан» у пастаноўцы Г. Таўстаногава не абышлося. І ў Брэсце Бяссеменаў пакараны за сваю так паслядоўна і жорстка праводзімую філасофію зацятага мяшчанства. Калі ж дадаць да гэтага бліскучае з пункту гледжання акцёрскага мастацтва выкананне ролі Акуліны Іванаўны Бяссеменавай артысткай З. Курдзянок, якая ў кожную хвіліну сцэнічнага жыцця бывае то святлом, то ценем Бяссеменава-старэйшага, дык стане відавочным, што тэатр і ў інтэрпрэтацыі галоўнага аб'екта выкрыцця схіляўся да «таўстаногаўскай» варыяцыі. Зразумейце, маўляў, што і ён, стары Бяссеменаў, таксама чалавек, што і ў яго ёсць непахісныя перакананні, і ён шчыра плача, калі бачыць, як наладжаны рытм і ход жыцця разбураецца родным сынам, выхаванцам, нахлебнікам!..

Што ж, спачування такі Бяссеменаў не абуджае. Але і нянавісці таксама. Тэатр нібы запрашае нас зразумець і тых, і другіх у сутычках. Канфлікт здрабняецца, усе ціхія і ўсе адкрытыя прыгоды жыхароў дома Бяссеменавых набываюць гучанне звычайнай сваркі паміж бацькамі (Бяссеменавы) і дзецьмі (Ніл і яго аспроддзе). І пачынаеш гартаць зусім знаёмую гісторыю, дзе прыватныя падзеі так і застаюцца прыватнымі. Дом такіх Бяссеменавых выглядае востравам, на якім усталявалася сваё жыццё, хай сабе з гвалтоўнымі скандаламі, са слоўнымі пядынкамі, але ўсё ж родны і дарагі ўсім, хто знайшоў на ім сабе ўтульны або няўтульны куток.

Паўтараю, рэжысёр Г. Волкаў знайшоў унутраныя, духоўныя сувязі паміж усімі дзейнымі асобамі. Напрыклад, і па мізансцэнах, і па эмацыянальнай афарбоўцы Пётр Бяссеменаў (артыст М. Рэмізаў)—фігура хісткая; ён і кляне «востраў», на якім жыве, і вырвацца адсюль не можа. У вуснах выканаўцы ролі выказванні героя пра агідныя для яго грамадскія абавязкі і пра той жа абрыдлы буфет у доме гучаць аднолькава— на мяжы істэрычнага выбуху. Ён мітусіцца, лётае па ўсіх пакоях дома больш за ўсіх іншых. І вельмі часта яго рука трапляе на плячо бацькі. Пётр крыўдуе на Васіля Васілевіча, калі той вярзе старасвеччыну, але ён і шкадуе, спачувае старому. Паміж імі нітка, якая не абарвецца ніколі. Гэта М. Рэмізаў іграе дакладна. Калі сочыш за тым, як Алена Крыўцова «адбірае» такога Пятра ад Бяссеменава, бачыш, што і ў сферы нітымнага жыцця ён капітулянт, схільны хаваць істоту свайго характару за красамоўствам: Бяссеменаў, Бяссеменаў...

Па-творчы сталее маладая артыстка Т. Волкава, і гэта заўважаеш у тым, як яна арганічна жыве ў ролі Таццяны Бяссеменавай, асабліва ў першай частцы спектакля. Верыш, што яна школьная настаўніца, якой служба не дае задавальнення. Яна сапраўды кахае Ніла, спадзеючыся, што гэтае каханне выведзе яе з «вострава Бяссеменава» або пераменіць яго статут.

ГЭТА ТАКСАМА ПРЫЗВАННЕ

У гэтага каржакаватага, круглавідага чалавека, загадчыка трупы Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра, Міхаіла Фёдаравіча Жука былі, як за ўсіх людзей на свеце, свае радасці і няўдачы ў рабоце. Але куды б яго ні кідаў лёс, ён заўсёды захоўваў трапяткую любоў да сцэны.

...Позняя восень 1942 года. Вялікія, напаўразваленыя фашысцкімі бомбамі і снарадамі складскія памяшканні на беразе Волгі. Тут бывалыя воіны Сталінградскага фронту сустракалі папаўненне з Сібіры. Для іх адразу ж быў арганізаваны канцэрт самадзейнага ансамбля «Усмешка». На пустых патронных скрынках стаяў галоўны герой праграмы — Валя Баранкін. Пад дружны смех ён расказваў аб сваіх шпітальных прыгодах. У гэтай ролі зухаватага вясёлага хлопца выступаў старшы сяржант Міхаіл Жук.

За доўгія гады Вялікай Айчыннай вайны Міхаіл Жук многа разоў удзельнічаў у кровапралітных баях з фашыстамі. Бачыў смерць і гераічныя подзвігі сваіх сяброў-аднапалчан, пад варожым абстрэлам вёў антыфашысцкія перадачы і прымаў актыўны ўдзел у армейскай мастацкай самадзейнасці.

Пасля вайны Міхаіл Жук вярнуўся ў родны Бабруйск, дзе пачынаў сцэнічную дзейнасць. А хутка пераехаў у Гродна ў толькі што ўтвораны абласны драматычны тэатр. Тут ён працуе па сённяшні дзень. Роўна 25 гадоў.

Тут раскрыліся яго арганізатарскія здольнасці — спачатку памочніка рэжысёра, а пазней — загадчыка трупы. А быць загадчыкам трупы — справа нялёгкая: трэба планаваць работу акцёраў, кантраляваць падрыхтоўку тэхнічных цэхаў да рэпетыцый і спектакляў, весці ўлік загрузкі творчага складу, ды і наогул быць гатовым да любых нечаканасцей, якіх так многа ў жыцці тэатра. Часта даводзіцца выконваць абавязкі памочніка рэжысёра на выязных спектаклях, дапамагаць рабочым сцэны, кантраляваць рэквізітараў, электрыкаў, пераўвасабляцца ў адміністратара.

Але нягледзячы на загружанасць, Міхаіл Жук выступае і як акцёр. Гледачы Гродна і вобласці памятаюць яго ў ролях: Татарына ў «На дне» М. Горкага, дэмабілізаванага воіна Агарнова ў

Шкада толькі, што рэжысёр вельмі позна дазваляе такой Таццяне ўступіць у духоўны паядынак з Поляй. Мабыць, таму ў другой палове спектакля Т. Волкавай даводзіцца іграць адно толькі расчараванне Таццяны, якая на самагубства ідзе, здаецца, толькі з-за таго, што Ніл абразіў яе, сказаўшы злосна: «Падслухвала? Падглядвала?» Атрымліваецца, што як раз гэты дакор і стаў штуршком да таццянінага ўчынку.

Магчыма, паядынак паміж Таццянай і Поляй таму і не адбываецца, што рэжысёр і артыстка Р. Семічава старанна і паслядоўна (як бы курсівам вылучаючы) сочаць за гучаннем аднаго матыву ў ролі Полі: яна выглядае на сцэне толькі непасрэднай і цнатлівай. І знешняя манера паводзін, і душэўны настрой персанажа падначалены адзінай задачы — жыць ян мага цішэй. Аб'ект захаплення для Ніла і Цецерава, яна выглядае на сцэне на дзіва прымітыўнай асобай, цнатлівай і манатоннай у гэтай цнатлівасці. Да таго ж яшчэ мастак па касцюмах Ф. Назараў апрануў Полю ў белае, а Таццяну ў цёмнае, тым самым падкрэсліваючы і колерам прызначэнне і месца гэтых жанчын на палітры спектакля.

Маладая актрыса С. Ніканчык у ролі Алены Крыўцовай яшчэ толькі набліжаецца да разгадкі гэтага характару. Ёй замінае рабіць такое набліжэнне больш упэўнена адназначнае разуменне таго, чым жыве гэтая дваццацічатырохгадовая ўдава. Пакуль што застаецца ўражанне, нібы ўдаве хочацца «дабраць» таго, чаго не хапала ёй раней, калі яна была жонкай турэмнага чына. Выканаўца ролі паказвае яе гатовай да флірту амаль з кожным мужчынам у доме. Страчана пачуццё меры. Калі ж яшчэ дадаць, што С. Ніканчык не навучылася насіць стыльнае адзенне, суадносіць жэст са словам і ўнутраным станам персанажа, будзе відавочным, як многа прадстаіць зрабіць яшчэ і ёй, і рэжысёру, каб вобраз Алены Крыўцовай прагучаў па-горкаўску.

Сказаўшы аб тым, што рэжысёру яшчэ прадстаіць нешта зрабіць, каб удасканаліць мастацкае гучанне спектакля, я мушу закрануць і наступнае пытанне. Заклапочаны педагагічнымі мэтамі ў рабоце з акцёрамі, Г. Волкаў не прапанаваў ім арыгінальнай рэжысёрскай трактоўкі п'есы. «Мяшчане» ў Брэсце прачытаны так, як іх чыталі і сорак, і дзесяць гадоў назад. Тое, што трапіла ў гэтую кананічную тэатральную версію драмы «ад Таўстанога», глыбока артыстамі не ўспрынята. Таму, як я казаў вышэй, Ніл і сапраўды часам выглядае празмерна нахабным перад Бяссеменавым, пазбаўленым духоўнага такту ва ўзаемаадносінах з Таццянай. Таму стары мешчанін выступае пераважна гаспадаром вострава, які пільна стаіць на варце сваіх законаў і норм, бацькам у вялікай сям'і, дзе далёка не ўсе і не заўсёды ўмеюць наладзіць прыстойнае суіснаванне. Падзеі набываюць вузка хатні, камерны характар, знаёмы нам больш па «Дзецях Ванюшына» С. Найдзёнава, чым па «Мяшчанах» М. Горкага.

Адбываюцца сцэны з жыцця на «востраве Бяссеменавых», ізаляваным ад грамадскіх зрухаў таго часу. Сцэны калярытныя, драматычна вострыя, з павучальнай мараллю. У іх удзельнічаюць яркія індывідуальнасці. Пры гэтым, чым горш чалавек, тым больш горача ён апраўдвае сябе, тым хітрэйшы ён у барацьбе з праціўнікам і шкадуе аднаго сябе, а добрыя людзі далёка не ўсе здольныя на пратэст актыўны, на разрыў з домам, дзе можна задыхнуцца. Таму ўсіх жыхароў «вострава» ўспрымаеш як жанравыя фігуры (віртуозна сыграна нават эпізадычная роля Сцепаніды А. Качатковай), якія ілюструюць даўно знаёмы горкаўскі тэзіс пра варожасць усяму чалавечаму мяшчанству, і робіцца гэта па не менш даўно выпрацаваным пастановачным плане. Трупа брэсцкага тэатра і талент Г. Волкава абяцалі нешта большае. Самастойнага ж з'явілася вельмі мала, і ўсё ў дэталях. Новага слова не прагучала наогул.

А спектакль адбыўся. У ім ёсць акцёрскія ўдачы. Ён ясны па рэжысуры. І, скажу яшчэ раз, малаарыгінальны.

«Шчасці» П. Паўленкі, японскага афіцэра Фуруты ў драме «На тым баку» А. Баранава, бальшавіка-салдата Цярэшкіна ў інсцэніроўцы «Порт-Артур», сумленнага калгасніка Філімона ў «Сэрцы на далоні» І. Шамякіна і многія іншыя. А колькі разоў Міхаіл Фёдаравіч без адзінай рэпетыцыі тэрмінова замяняў раптам захварэўшых акцёраў!

Задоўга да з'яўлення акцёраў, рэжысёраў, мастакоў прыходзіць М. Жук у тэатр. Ён прэвярае, ці ўсё гатова для работы, каб роўна ў адзінаццаць націснуць на кнопку званка — час пачынаць рэпетыцыю.

Тэатр — яго жыццё. Справа, якой ён служыць.

Ул. ДЗЁМІН,
артыст абласнога тэатра.

Гродна.

БОГ, ЯКОМУ ЁН МОЛІЦЦА

М. ЦІШАЧКІН У РОЛІ ТАТЫ У СПЕКТАКЛІ «ЗАЦЮКАНЫ АПОСТАЛ» ДЗЯРЖАЎНАГА ДРАМАТЫЧНАГА ТЭАТРА імя ЯКУБА КОЛАСА

У КВАТЭРЫ, дзе ён жыве, тры паверхі. Ён уладкаваўся на трэцім. Побач з багамі — Будай і Хрыстом (калі ў чалавека два багі, дык адразу зразумела, што моліцца ён трэцяму). Побач з кніжнымі паліцамі, якія так вабяць Сына, а раней, відаць, вабілі яго. Ён жыве на трэцім...

У першай палове спектакля адсюль ён будзе весці ўсе свае размовы. Само сабой зразумела, што з трэцяга паверха далёка не ўсё відаць, але ўсё ж такі гарызонт крыху пашыраецца. У п'есе А. Макаёнка «Зацюканы апостал» у яго няма імя — проста Тата. Тата-чыноўнік, вобраз абагульнены. Рэжысёр спектакля ў Віцебску А. Смеляков і артыст М. Цішачкін змаглі раскрыць перад намі біяграфію чалавека, паказаць тую жыццёвую дарогу, ідучы па якой Тата страчваў індывідуальныя рысы. Дзякуючы другому плану, які ўвесь час нясе артыст, мы зусім рэальна ўяўляем сабе, як яго накіроўвалі, загартоўвалі, габлявалі, галілі, стрыглі пад агульны грабеньчык, пакуль ён не зрабіўся АДНЫМ З МНОГІХ. У спектаклі мы сустракаемся з Татам, калі ён ужо адзін з многіх. І нам давядзецца толькі быць сведкамі тых апошніх успышак, калі слабое адчуванне, што ён ледзь-ледзь асоба, страчваецца Татам.

Тата — Цішачкін у спектаклі віцяблян — ахвяра вар'яцкага бессэнсоўнага жыцця. І нам шкада яго. У спектаклі мінчан Тата — Мілаванаў, бадай, з тых, хто робіць жыццё невыносным, бо ён нахабнік, ілгун, прыстасаванец. (Шчыра нажучы, пасля яркай работы Мілаванава цяжка было ўявіць Тату іншым. Толькі таксама, здавалася, можа ён быць: самаўлюбёны і бяскрылы. Мяркуючы па рэцэнзіях на спектаклі ў іншых тэатрах, усе артысты — выканаўцы ролі Таты іграллі яго прыблізна такім. Таму асабліва прыемна было іншае, на маю думку, не менш цікавае прачытанне гэтага вобраза і ўсёй п'есы).

Першая сустрэча з Татам — ён сварыцца з Мамай. За статуэтку. Справа, канечне, не ў тым, што Тату падабаецца статуэтка, а Маме не падабаецца. Тут зусім іншае. Кідаючы адзін аднаму словы, якія гучаць як асуджэнне ці прынцыпе сучаснага мастацтва, яны спрачаюцца пра жыццё, таму што не могуць не спрачацца, таму што даўно не разумеюць адзін аднаго і — не паважаюць адзін аднаго.

— Гэта не посхудзь, а твор мастацтва, гэта работа аднаго з лепшых афрыканскіх разбпроў па дрэве...

Тата гаворыць гэтыя словы, а чуем мы зусім іншае — яму крыўдна і сумна, што ён павінен нешта тлумачыць жанчыне чужой, нялюбай, абмежаванай мяшчанцы. З вышыні свайго трэцяга паверха ён гэта добра разумее. Тата — Цішачкін гаворыць роўным голасам, без запалу, не крычыць, не злуецца, бо ведае наперад, чым усё скончыцца і як будзе потым...

А вось і «потым» настала. Пасля бойкі з двара вярнуўся Сын. І зноў нібыта Тата і Мама хочуць высветліць, хто з хлопчыкаў вінаваты, але на самай справе яны працягваюць сваю бясконцую спрэчку пра жыццё. І быццам бы спрачаючыся з правільнымі, але пустымі словамі Мамы, Тата, зноў-такі з вышыні трэцяга паверха, тлумачыць Сыну, што калі бог не дае месца пад сонцам, дык яго трэба ўзяць. «Сіла, брат, ёсць сіла. Яе павінны бачыць усе. Многа сілы — не трэба і розум». А што рабіць? Ён павінен ратаваць свайго хлопчыка. Той не павінен стаць такім, як ён. Адно з двух — або ты завалодаеш жыццём, або яно скруціць цябе. На нейкае імгненне Тата распраўляе плечы, яго стомлены твар з лупатымі вачыма ажывае. Ён асуджае гэтае жыццё, ён дазваляе сабе гэта зрабіць, каб потым, каторы ўжо раз, апраўдаць нічэмнае бессэнсоўнае існаванне.

Ну, што ж, здавалася б, зараз, калі Тата зрабіўся пасрэднасцю, адным з многіх, выпрабаванні для яго скончыліся. Ён — фасаваны стандартны тавар. З такіх, як ён, цяпер можна будаваць грамадства, дзяржаву. З такіх, як ён, атрымліваюцца выдатныя падаткаплацельшчыкі і выбаршчыкі. Справа зроблена.

Але не! Лёс падкідвае яму ўсё новыя і новыя выпрабаванні: а як ты будзеш паводзіць сябе, здзекуецца ён з Таты, калі на твайм шляху сустрэнецца яшчэ адна жанчына? Для Таты — Мілаванава яшчэ адна жанчына ў жыцці — з'ява зусім натуральная. Менавіта пра такую «курачку» ён і марыць. Для Таты — Цішачкіна і жанчына не радасць. Навошта яна яму — патрабавальная, бессаромная, цягне з яго грошы, прымушае «насіць» іншы твар. Усё гэта мы разумем з размовы, якую вядзе Тата — Цішачкін па тэлефоне. І хоць гаворыць ён ласкавыя словы, па яго рухах, выразе твару, па ўсёй постаці мы разумеем, што за імі.

— Птушачка... Рыбка японская.. Вустрычка французская...

За кожным словам — здзіўленне (няўжо я тані пашляк?), іранічная ўсмешка (божачка, як яна нічога не разумее!), асуджэнне (нельга, нельга так!) і.. апраўданне (усе так робяць, усе такія, а я што?). Тата гаворыць так, быццам прыслухоўваецца да самога сябе, быццам нешта хоча і не можа знайсці ў сабе. Так, не можа. Бо набліжаецца апошні маналог — апраўданне сябе, які ён будзе гаварыць з першага паверха. Ён будзе кідаць Сыну, які цяпер заняў пазіцыю на трэцім паверсе, словы жорсткія, страшныя... Першы раз за ўвесь спектакль Тата — Цішачкін закрычыць:

— Мая хлусня мяне корміць! Яна і цябе корміць! Яна ўсіх нас корміць. А паспрабаваў бы я гаварыць праўду, мяне б даўно выгналі вон. Маёй фірме не патрэбна праўда! Там патрэбны прыгожыя натхнёныя словы, якія б заклікалі, запрашалі, заваблівалі, прываблівалі... Голад навучыць цябе хлусіць...

Вось і ўсё. Тата перайшоў у наступленне — адзінае выйсце для тых, хто не мае рацыі. Пасля гэтых слоў Сын кінецца з трэцяга паверха, каб скончыць сама, губствам. І ў гэтыя імгненні Тата апошні раз паспее «пракруціць» у свядомасці сваё жыццё. Яшчэ адзін раз ён дазволіць сабе быць чалавекам — бо сэрца яго не вытрымае.

— А мы зараз яму тэлевізар уключым. Якраз прыйшоў час палітычнага каментатара, — гаворыць ён Сыну, ведаючы, як Сын цікавіцца гэтымі перадачамі і нібы дазваляючы яму жыць па-ранейшаму і забыцца на бацькавы словы.

Але калі Сын адмаўляецца — уздыхае з палёгкай: маўляў, дзякуй богу, вывеў Сына на сваю арбіту. Ён уладкуецца ў гэтым свеце. Будзе хлусіць, гаварыць напышлівыя словы і жыць! Жыць! Не, не жыць. Ёй выжыве... Як неналі выжыў Тата.

Тата — Цішачкін не прасталінейны вобраз, хаця падставы стварыць менавіта такі характар былі. Рэжысёр і артыст пайшлі ў глыбіню вобраза, знайшлі яго сацыяльныя вытокі, паказалі, як ва ўмовах капіталістычнага ладу гіне чалавечая асоба.

Я падзялілася ўражаннямі толькі пра адну ролю. Але сур'ёзная размова вартыя ўсе выканаўцы: Мама — Г. Маркіна, Дачка — С. Анружная, Сын — Б. Сяўко. Поспеху спектакля садзейнічае і мастак А. Салаўёў, дэкарацыі якога вельмі дакладна адпавядаюць усяму духу спектакля. Прыемна было зноў сустрэцца з рэжысёрам А. Смеляковым, для якога, як мне здалося, тэатр у Віцебску — яго тэатр.

Ірына ПІСЬМЕННАЯ.

ЯНА САГРАЕ СПЕКТАКЛЬ

Н. ГАЙДА У РОЛІ БАТМАНАВАЙ З АПЕРЭТЫ «ХАЛОПКА» У ТЭАТРЫ МУЗЫЧНАЙ КАМЕДЫІ БССР

ІРЫНА ў музычнай камедыі «Спявае «Жаваранак», Стэла ў «Вольным ветры», Лала ў «Каўказскай пляменніцы»... Здавалася, што Наталля Гайда створана для роляў сучаснага рэпертуару. Але пасля пастаноўкі «Баядэры» і «Халопкі» мы пераканаліся, што, выконваючы ролі жанчын, якіх аддзяляюць ад нас шмат дзесяцігоддзяў і нават стагоддзі, Гайда застаецца такой жа пераканаўчай, шчырай, вернай жыццёвай праўдзе.

Артыстка прыйшла ў мастацтва пасля доўгіх роздумаў і вагання. Яна працавала ў геалагічных партыях, вучылася ў юрыдычным інстытуце і, хоць марыла пра сцэну, доўга не рызыкавала паступаць у кансерваторыю. І толькі настойлівыя рэкамендацыі камісіі, якая праслухоўвала самадзейных артыстаў інстытута, падштурхнулі яе да гэтага кроку. І вось Свярдлоўская кансерваторыя скончана. Наталлі Вікцтараўне пашанцавала: у Мінску адкрыўся тэатр музычнай камедыі, і яе запрасілі сюды салісткай.

На спектаклі тэатра з'явілася ўжо нямала рэцэнзій у газетах і часопісах. Яны былі розныя, гэтыя рэцэнзіі. Але ў адным думкі крытыкаў сыходзіліся: кожная роля Гайды ацэньвалася як творчая ўдача. А роля Батманавай у выкананні маладой артысткі яшчэ раз пацвердзіла, што і ў аперэце можна вырашаць значныя, сацыяльна важкія праблемы — уся справа ў таленавітасці і прафесійнасці драматургічнага матэрыялу і выканаўцаў.

Наталля Гайда паказвае Батманаву не толькі як прывабную жанчыну, таленавітую артыстку. Гэта чалавек, чулы да чужога гора, мяккі і сардэчны і ў той жа час здольны на гнеўны пратэст супраць несправядлівасці, самадурства, прыгнёту. Гэтая рыса асабліва ярка раскрываецца ў другім акце, у сцэне з Кутайсавым (артыст Ю. Лазоўскі), дзе артыстка знаходзіць самыя розныя фарбы і адценні для характарыстыкі сваёй гераіні як у драматычных кавалках, так і ў вакале. «Нават у вакале Гайда ўмее знайсці ўнутраны падтэкст, а гэта рэдкая і надзвычай каштоўная якасць для спевака», — гаворыць кампазітар Юрый Семяняка, які добра ведае артыстку па сумеснай рабоце над камедыяй «Спявае «Жаваранак».

А колькі трапяткой пяшчоты, шчырай самаахвярнасці ў сцэнах сустрэч з Андрэем Туманскім (артыст Ю. Летаў). Батманава вяртаецца з Францыі і не ведае, што тут, у маёнтку Кутайсава, жыве той чалавек, які выратаваў ёй жыццё ў Парыжы і знік невядома куды. Ад першай хвалюючай сустрэчы да глыбокага сапраўднага кахання Батманава — Гайда на дзіва шчырая, пераканаўчая. І нават даведаўшыся, што яна робіцца прыгонкай, Батманава застаецца вернай свайму каханню. З глыбокім драматызмам праводзіць Гайда сваю ролю, сцвярджаючы права чалавека на шчасце.

Артыстка свабодна валодае голасам, чыстым, гнуткім, прыгожага тэмбру. Усе яе арыі і арыёза гучаць як споведзь сэрца. А ў дуэтах яе шчырасць дапамагае партнёрам адказваць ёй той жа шчырасцю і натуральнасцю.

Наталля Вікцтараўна адноўкава добра валодае ўсімі кампанентамі, неабходнымі для артысткі аперэты: спявае, гаворыць, рухаецца. Матроскую блузу Стэлы яна носіць з такой жа натуральнасцю, як і раскошнае адзенне Батманавай. Нават у сцэнах, дзе выступаюць артысты балета, Гайду не адрозніш ад іх — яна такая ж грацыёзная, лёгкая, пластычная. Яна саграе кожны спектакль. І справа не толькі ў прыродных здольнасцях, але і ў той сур'ёзнасці, патрабавальнасці, з якой яна ставіцца да сябе. Гэтая патрабавальнасць іншы раз дае ёй сілы адмовіцца ад вядучых партый, пра якія іншыя артысткі аперэты мараць усё жыццё. «У жыцці мне важней за ўсё праўда», — гаворыць адна з гераінь Гайды. Гэтыя словы могуць быць з поўным правам аднесены і да самой Наталлі Вікцтараўны, якая на дзіва арганічна адчувае прыроду музычнай камедыі ў лепшым сэнсе гэтага слова.

Усевалад Меерхольд гаварыў: «У тэатра ёсць адна дзіўная ўласцівасць: таленавітаму акцёру чамусьці заўсёды трапляецца разумны глядач». З першых кроках свайго сцэнічнага жыцця Наталлі Вікцтараўне пашанцавала — яна трапіла ў гэтую шчаслівую кагорту. Яна мае свайго ўважлівага, патрабавальнага, удзячнага гледача.

А. КАЗЛОЎ.

ПРЭМ'ЕРЫ НАРОДНЫХ

□ Спектаклем па п'есе асецінскага драматурга С. Кайтава «Сэрца маці» ў перакладзе і сцэнічнай рэдакцыі Ю. Чапурына адкрыўся новы сезон народнага тэатра гарадскога дома культуры Баранавіч. З кожнай новай работай сталее калектыў, расце акцёрскае майстэрства аматараў сцэны.

□ Па-свойму прачыталі п'есу А. Макаёнка «Трыбунал» Мазырскі і Слуцкі народныя тэатры. Рэжысёры М. Колас і І. Падляхоўскі знайшлі цікавае рашэнне спектакля, дакладныя дэталі, якія дапамаглі раскрыць цудоўныя характары савецкіх людзей.

□ П'еса М. Матукоўскага «Амністыя» ідзе на многіх прафесійных сцэнах нашай краіны. А нядаўна прэм'еру па гэтай п'есе паказаў Бабруйскі народны тэатр.

□ Артыстка народнага тэатра Л. Лаўрыновіч стварыла складаны вобраз галоўнай гераіні ў спектаклі «Мараль пані Дульскай» па п'есе Г. Запольскай, якім пачаў свой чарговы тэатральны сезон Краснапольскі народны тэатр.

ВУЧОНЫ, ДАРАДЧЫК, ДРУГ

АЛЯКСАНДРУ АЎЧАРЭНКУ — 50

Імя Аляксандра Іванавіча Аўчарэнкі шырока вядома ў савецкай шматнацыянальнай літаратурнай навуцы. І не толькі ў савецкай, але і ў сусветнай. Яго кнігі і артыкулы ў абарону ленінскага прынцыпу партыйнасці ў літаратуры, баявітасць і непрымірымасць у барацьбе за ўсталяванне сацыялістычнага рэалізму, супраць рознага роду непрыяцеляў і адкрытых ворагаў нашай літаратуры — заваявалі яму папулярнасць сярод крытыкаў і літаратуразнаўцаў многіх краін зямнога шара. На берагах Місісіпі, Рэйна і Тэмзы, ва універсітэтах і ў коледжах ЗША, ФРГ, Японіі, Англіі і іншых краін добра ведаюць прафесара А. Аўчарэнку, як дастойнага прадстаўніка Саюза пісьменнікаў СССР, высока эрудзіраванага спецыяліста, страснага публіцыста і палеміста.

Шырокае кола літаратурных і грамадскіх інтарэсаў А. Аўчарэнкі. У пастаянным полі яго чулага зроку знаходзяцца і руская класічная і сучасная літаратура, і літаратуры народаў СССР, і літаратуры зарубежных краін ва ўсёй іх жанравай разнастайнасці. Але, бадай, больш за ўсё за апошнія дваццаць гадоў ён зрабіў для вывучэння творчай спадчыны і пашырэння найбагацейшага вопыту вялікага рускага пісьменніка Максіма Горкага. Пяру А. Аўчарэнкі належаць кнігі «Аб станоўчым героі ў творчасці М. Горкага», «Публіцыстыка М. Горкага», «Раман-эпапея М. Горкага «Жыццё Кліма Самгіна», «М. Горкі і літаратурныя пошукі XX стагоддзя» і іншыя, якія сталі настольнымі дапаможнікамі настаўнікаў і студэнтаў, здабыткам шырокага кола сапраўдных знаўцаў таленту першага мастака сацыялістычнай Расіі.

На Украіне добра ведаюць артыкулы А. Аўчарэнкі аб класічнай і сучаснай украінскай літаратуры, аб творах М. Стэльмаха, А. Малышкі, М. Зарудная.

З асаблівым задавальненнем мне хацелася б адзначыць заслугі А. Аўчарэнкі перад беларускай літаратурай. Вось ужо некалькі гадоў ён пільна сочыць за развіццём беларускай прозы, выступае з артыкуламі і рэцэнзіямі аб творчасці беларусаў у цэнтральным друку, на пісьменніцкіх сходах і ў Савеце па беларускай літаратуры, якім ён кіруе з 1969 года, пасля смерці Я. Мазалькова.

Думкі і выказванні А. Аўчарэнкі аб творчасці І. Шамякіна, І. Мележа, І. Навуменкі, В. Быкава, М. Лобана, Я. Брыля, У. Карпава, А. Кулакоўскага вельмі змястоўныя, глыбокія і аб'ектыўныя, яны выказаны з вялікім разуменнем працэсаў, якія адбываюцца цяпер у беларускай прозе, з пачуццём таварыскай паваги і з належнай мерай прафесійнай патрабавальнасці да кожнага мастака. Плённа дапамагае А. Аўчарэнка і маладым пісьменнікам. У пэўнай меры менавіта яму мы абавязаны тым, што аповесць «Тартак» Івана Пташнікава і раман «Плач перапёлкі» Івана Чыгрынава, лепшыя творы апошніх гадоў аб Вялікай Айчыннай вайне на тэрыторыі Беларусі, своечасова, зараз жа пасля публікацыі на роднай мове былі падтрыманы А. Аўчарэнкам на пасяджэнні Савета па беларускай літаратуры ў снежні 1970 г. і неўзабаве надрукаваны ў часопісах «Новый мир» і «Дружба народов». Гэтаму трэба толькі радавацца.

Зусім нядаўна ў выдавецтве Масквскага універсітэта выйшла невялікая, але змястоўная кніга А. Аўчарэнкі «Сучасны беларускі раман». У ёй ён піша: «Дзесяць гадоў назад беларуская проза магутным рыўком выйшла на перадавы рубеж у літаратуры. У апошнія пяць гадоў яна замацавала гэту перамогу. Цяпер ёй трэба будзе зноў рушыць наперад. Для гэтага патрабуецца цвяроза ацаніць саае сілы і магчымасці».

Праўдзіва і правільна сказана! Так аб вялікай літаратуры можа гаварыць толькі яе вялікі друг і дарадчык, патрабавальны майстар крытычнага аналізу.

У дзень паўвекавога юбілею Аляксандра Іванавіча Аўчарэнкі мы, яго сябры і таварышы па пяры, ад душы жадаем яму шчаслівага даўгалецця, такой жа наступальнасці, баявітасці і пільнасці ў абароне нашых агульных ідэалаў, новых творчых здзяйсненняў на карысць усёй нашай савецкай шматнацыянальнай літаратуры.

Міхась ГАРБАЧОЎ.

З КАГОРТЫ СІНЯБЛУЗНІКАЎ

У час свайго адпачынку Аляксандр Майсеевіч Гурэвіч наведаў мясціны Курганскай вобласці, дзе ў канцы дваццатых—пачатку трыццатых гадоў прайшло яго юнацтва. Ён блукаў па новых вуліцах Кургана, праз адраснае бюро шукаў старых знаёмых. Пацягнула ў краязнаўчы музей. І там прачытаў: «Заснавальнікі сіняблузнікаў у нашым горадзе». Тут жа віселі партрэты Валянціна Коржава, Міхаіла Пугачова, Марыі Галавіной, Аляксандра Гурэвіча.

— А вы ведаеце пра далейшы лёс сіняблузнікаў? — спытаў Гурэвіч у дырэктара музея.

— Толькі пра некаторых.

— Пра Сашку Гурэвіча не чулі?

— Не.

Усхваляваны Аляксандр Майсеевіч дастаў з кішэні пашпарт.

— Дык вы і ёсць Сашка-музыкант?!

Так уваскрэсла ў памяці далёкае мінулае, усё, што прыяло сённяшняга лаўрэата Усесаюзнага фестывалю народных тэатраў Аляксандра Гурэвіча да самадзейнай сцэны.

Было гэта ў 1924 годзе. Сын местачковага каваля Сашка Гурэвіч сеў за школьную парту. Настаўніца Марфа Трафімаўна Баркоўская ў хударлявым хлапчуку ўбачыла здольнага вучня. Ён не толькі добра вучыўся, але меў і артыстычныя здольнасці. Часам на перапынку так удала «пакажа» папа ці рабіна, што ўсе аж жываты надрывалі ад рогату. І вось, калі школа рыхтавала вечар, прысвечаны васьмідзесяцігоддзю з дня смерці Івана Андрэевіча Крылова, Марфа Трафімаўна папрасіла Сашу:

— Хачу, каб клас паставіў інсцэніроўку па байцы «Квартэт». Малпа, Асёл, Казёл і Касалапы Мішка ёсць. А Салаўя не падбяру. Патрэбен пявучы тонкі голас. Ці не сыграеш ты?..

З таго часу і звязаў Саша Гурэвіч свой лёс з самадзейнай сцэнай. Праз год-два навучыўся іграць на піяніна. Сам, без настаўніка. І дапамагла тут выпадковасць. У мястэчку спыніўся атрад чырвонаармейцаў. Салдаты ставілі канцэрт. Саша, не бачачы з-за дарослых сцэны, стараўся хоць адным вухам улавіць гукі дзіўнага інструмента, які чырвонаармейцы прывезлі з сабой. Гукі чароўныя, пявучыя. Але як яны паяўляюцца?..

Усю ноч не спаў. Думаў: «Што за музыку прывезлі салдаты?»

Раніцай, калі яшчэ ўсе спалі, ён залез у клуб, на дыбачках падышоў да дзіўнай скрынкі. Асцярожна адчыніў вечка — са скрынкі вышчэрваліся даўжэзныя жоўтыя «зубы». Дакрануўся да гэтых «зубоў» — скрыня зайграла.

Чырвонаармейцы пайшлі далей, а піяніна так і засталося ў вёсцы. З той раніцы Саша кожны дзень наведваў клуб. Праз паўгода ён ужо ў дзве рукі падыгрываў самадзейным артыстам.

Праз два гады Сашавы бацькі пераехалі з вёскі Расосне ў Курган. Доўга хлапчук не мог прывыкнуць да новага месца. Змаркоціўся па сцэне. Але ў горадзе пайшлі чуткі пра сіняблузнікаў. З'явілася і аб'ява: «Адкрыты набор у камсамольскі калектыў сіняблузнікаў «Гайка». Звяртацца ў клуб прафсаюза савецкіх гандлёвых служачых».

Саша пайшоў у клуб. Там яго агледзелі, сказалі:

— Малы. Каб хоць іграць на чым-небудзь умеў...

— Я ўмею. На піяніна.

— А ну паспрабуй.

Адшукалі стары разбіты інструмент. Паслухалі. Прынялі. Але паслалі вучыцца ў прыватную музычную школу Алены Сцяпанаўны Ціхан. За год Гурэвіч засвоіў асновы музычнай граматы— вярнуўся ў клуб спецыялістам. У студзені 1928 года курганцы чыталі выпушчаную друкарскім спосабам афішу: «Слухай, член прафсаюза, у суботу выступае сіняя блуза «Гайка». Камсамольскі калектыў прафклуба саўгандальслужачых пад кіраўніцтвам В. Коржава ў складзе чатырнаццаці сіняблузнікаў». (Далей ішоў пералік прозвішчаў, у тым ліку і А. Гурэвіча).

Паведамлялася праграма. Унізе — лозунг: «Пока старый быт не умер, синяя блуза, расти свой юмор». Пачынаючы з дзевятага нумара афішы (люты 1928 г.) даваўся допіс: «Ля раяля А. Гурэвіч».

Сіняблузнікі ставілі канцэрты ў Кургане, сёлах. У разгары была калектывізацыя, таму тэме нараджэння новай вёскі, тэме барацьбы з кулаком прысвячаліся многія нумары — прыпеўкі, інтэрмедыі, песні. У раздзеле «Рыжская Русь» давалі бой белаэмігрантам. У 1932 г. Аляксандр Майсеевіч вярнуўся ў Беларусь. І дзе б ён ні быў, ніколі не пакідаў сцэны. Прайшлі гады. Гурэвіча афармілі на пенсію. Але не захацелася яму кідаць працу. Праўда, ідучы ў 1962 г. на Мінскі трактарны, даў сабе і жонцы Ганне Аляксандраўне зарок:

— Не буду больш на сцэну выходзіць — гады не тыя.

Сказаў — і не выцярпеў. Аднойчы, ідучы дадому, убачыў аб'яву: «Пры кавальскім корпусе арганізуецца гурток мастацкай самадзейнасці...» Сэрца страпянулася. Вярнуўся назад.

— Запішыце і мяне,— папрасіў ён камсорга Юру Званарова.

— А вы раней з якімнебудзь нумарам выступалі? — спытаў Юра. Замест адказу Аляксандр Майсеевіч узяў у рукі акардэон і зайграў папуры на тэмы беларускіх народных песень. Потым пачаў «паказваць» дзеда Нічыпара з аперэты Аляксандрава «Вяселле ў Малінаўцы».

—О, такія нам патрэбны, — узрадаваўся Званароў.

Пад кіраўніцтвам Аляксандра Майсеевіча быў пастаўлен урывак з «Вяселля ў Малінаўцы». Сам выступаў у ролі дзеда Нічыпара. У канцэрце акампаніраваў на баяне салістам і хору.

Артыст Аляксей Мікалаевіч Бяляеў прыйшоў у калектыў у 1964 годзе. Пры ім як галоўным рэжысёры Гурэвіч асвоіў ролю ўрача Логінава ў спектаклі па п'есе Б. Гарбатава «Юнацтва бацькоў».

У 1967 годзе на Усесаюзным фестывалі, прысвечаным 50-годдзю Савецкай улады, народны тэатр МТЗ выступіў са спектаклем па п'есе Ю. Прынцава «Дзевятая сімфонія», за што яму было прысвоена званне лаўрэата. Дыплом лаўрэата быў уручан і А. Гурэвічу — за выкананне ролі ўрача Паўлоўскага.

Званне лаўрэата рэспубліканскага конкурсу, прысвечанага 50-годдзю БССР, Аляксандр Майсеевіч атрымаў за ўдзел у спектаклі па п'есе П. Васілеўскага «Год 1917» — тады Гурэвіч іграў ролю фабрыканта Мысніцкага.

Апроч удзелу ў спектаклях, Гурэвіч з'яўляецца пастаянным канцэртмайстрам у канцэртах самадзейных артыстаў трактарнага завода. І дзе б ён ні выступаў, яго сустракаюць з цеплынёй і сардэчнасцю. Тэрміст кавальскага цэха Мінскага трактарнага завода, былы сіняблузнік Аляксандр Майсеевіч Гурэвіч застаецца ў страі.

Б. МАНЦЭВІЧ.

СЛАЎНАМУ ЗЕМЛЯКУ

Невысокі даўгі драўляны будынак. Фарбаваныя сцены, ганак. Сёння тут размяшчаецца Радашковіцкая бальніца. Чатыры дзесяцігоддзі таму назад у гэтым доме збіраліся людзі, якія паставілі мэтай свайго жыцця вызваленне роднага краю ад панскага панавання, ад нацыянальнага і сацыяльнага прыгнёту. Людзей гэтых аб'ядноўвала палымяная воля і асабістая абаяльнасць гаспадара дома — вучонага-лінгвіста, перакладчыка, які ведаў 16 моваў, грамадскага дзеяча Браніслава Тарашкевіча.

21 студзеня сюды сабраліся жыхары Радашковіч, каб адкрыць мемарыяльную дошку на доме, дзе восем год жыў і працаваў іх славуты зямляк. Мітынг адкрыў сакратар РК КПБ В. Ляшковіч. З цёплымі словамі пра Браніслава Тарашкевіча выступілі ўрач К. Васюк і дырэктар сярэдняй школы Я. Ермаковіч. Сваімі ўспамінамі пра творчую і грамадскую дзейнасць выдатнага вучонага падзялілася былая сяброўка яго жыцця Вера Андрэеўна.

Спадае белая заслона, мемарыяльная дошка адкрыта.

● ПАДЗЕІ ● ФАКТЫ ● НАВІНЫ ●

□ У Жлобіне па ініцыятыве райкома камсамола арганізаваны клуб творчай моладзі «Маяк». На яго пасяджэннях настаўнікі, медыкі, культработнікі, інжынеры праводзяць конкурсы на лепшага спевака, чытальніка, танцора.

М. Янчанка.

□ Творчы вечар народнага артыста СССР Я. Палосіна адбыўся ў клубе санаторыя «Нясвіж». Артыст выступіў з чытаннем твораў М. Шолахава і А. Твардоўскага.

П. Бараноўскі.

□ Народны драматычны калектыў Растоўскага раённага дома культуры Яраслаўскай вобласці рыхтуе да 50-годдзя СССР спектакль па п'есе Андрэя Макаёнка «Трыбунал».

А. Стадуб.

□ У Віцебскай абласной бібліятэцы імя Леніна экспануюцца выстаўкі «У сузор'і савецкіх рэспублік», «Вершы беларускіх паэтаў і пісьменнікаў», «Песні народаў СССР».

М. Фёдараў.

НА БЛАКІТНЫМ ЭКРАНЕ

З ТВОРЧЫМ ЗАПАЛАМ

Карабель адправіўся ў плаванне вакол свету. Ён перасякае моры і акіяны, заходзіць у далёкія порты. На ім ёсць і матросы, і пасажыры. Але гэта незвычайны карабель. Яго груз — песні. І плыве ён не на хвалях мора, а па хвалях эфіру. А яго матросы і пасажыры — удзельнікі розных мастацкіх калектываў Гомельшчыны. Так пабудавана адна з перадач маладзёжнай рэдакцыі Гомельскай студыі тэлебачання, у якой прагучалі песні народаў свету.

Усе перадачы рэдакцыі (акрамя спартыўных) аб'яднаны ў цыкл «Неспакойныя сэрцы». Тут і рэпартажы з новабудоўляў вобласці і ўслаўленне пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва, ваенна - патрыятычныя перадачы і абмеркаванне студэнцкіх навуковых работ, дыспуты і разважанні пра самае галоўнае ў жыцці. Рэдакцыя арганізуе і літаратурныя перадачы — інсцэніроўкі апавяданняў, дзе закранаюцца хвалюючыя, надзённыя маральна-этычныя пытанні.

Вельмі папулярнымі ў вобласці сталі арганізаваныя рэдакцыяй турніры-спаборніцтвы (пазней ініцыятыву гамяльчан падхапіла і маладзёжная рэдакцыя рэспубліканскага тэлебачання). Спаборніцтвы самыя розныя: аратых і паэтаў, шафёраў і кінааматараў і нават жартаўлівы конкурс жаніхоў і нявест, на якім адзнаку за сервіроўку стала і якасць прыгатаваных страў ставіла аўтарытэтнае журы —муж і жонка, якія адсвяткавалі залатое вяселле.



Літаратурна-музычныя кампазіцыі «Хатынь» і «Вянок Багдановіча», творы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Кандрата Крапівы, Янкі Брыля, Уладзіміра Корбана, Ніла Гілевіча, Эдуарда Валасевіча, Генадзя Бураўкіна і іншых пісьменнікаў уключаюць у сваю праграму ўдзельнікі Тэатра чытальніка, які існуе пры Мінскім педагагічным інстытуце імя Максіма Горкага. Кіруе гэтым калектывам старшы выкладчык Андрэй Калада.

Самадзейныя артысты не раз выступалі перад слухачамі г. п. Мар'іна Горка, станцыі Аляхновічы, Загорскай сельскай школы Мінскай вобласці, перад настаўнікамі мінскіх школ.

Зараз калектыў рыхтуе праграму, прысвечаную 90-годдзю з дня нараджэння народных песняроў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа.

На гэтым здымку вы бачыце фрагмент з літаратурна-музычнай кампазіцыі «Хатынь».

Фота Ул. КРУКА.

ГУТУЗА Ў СССР

У СТУДЗЕНІ 1972 года Рэнату Гутуза споўнілася 60 гадоў. Яго творчы шлях поўны пошукаў і перамог, поўны драматычных падзей, няспыннай барацьбы і бліскучых здзяйсненняў. Аднаго ў ім няма: здрады сваім прынцыпам, адступлення ад сваіх ідэалаў. Вернасць ідэям камунізма, высокае разуменне адказнасці мастака — вось што вылучае Гутуза ў першыя рады прагрэсіўных дзеячоў свету.

Гутуза сфарміраваўся як мастак яшчэ ў 30-я гады. Ужо тады яго творчасць была рэзка апазіцыйнай да пануючага, афіцыйнага мастацтва, насіла яўны антыфашысцкі характар. У гады сусветнай вайны Гутуза ў радах байцоў Супраціўлення са зброяй у руках абараняў свабоду і незалежнасць Італіі. І пасля вайны ён застаўся байцом, але ўжо на другім фронце — на фронце мастацтва.

«Я заўсёды мару пра жыванне, які быў бы палымяным крыкам, выяўленнем гневу, любві, справядлівасці, што гучала б на вуліцах і плошчах...» Гэтыя словы мастака можна паставіць эпіграфам да ўсёй яго творчасці.

Творчасць Гутуза вядома далёка за межамі Італіі. Ён даўно ўжо стаў мастаком з сусветным імем. Яго работы ёсць у буйнейшых музеях свету — у Нью-Йорку, Лондане, Дрэздэне, Вене.

Савецкім людзям творчасць Гутуза даўно і добра знаёмая. У савецкіх музеях — найбольшая за межамі Італіі калекцыя яго работ, на рускай мове выйшла некалькі кніг, прысвечаных творчасці італьянскага мастака: перакладзена капітальная манаграфія Джопа Берджэра, выдадзены альбом з рэпрадукцыямі большасці яго твораў; творчасці Гутуза прысвечаны раздзелы ў агульных працах па сучасным італьянскім мастацтве.

У 1961 годзе адбылася выстаўка твораў Гутуза, якая стала важнай падзеяй у мастацкім жыцці СССР. У Маскве, Ленінградзе, Новасібірску, — усюды яна прыцягвала мноства гледачоў. У адной толькі Маскве гэту выстаўку наведала больш як 100 тысяч чалавек.

Яркі, шчодры, лічы, ры талент мастака не мог не прывабіць сэрцы гледачоў: Гутуза стаў вельмі папулярны ў Савецкім Саюзе. Гэта адзначыў і ён сам, калі ў 1961 годзе наведаў СССР у сувязі са сваёй выстаўкай. «Што датычыць мяне асабіста,— заявіў ён у інтэрв'ю,— дык асаблівую радасць прынесла мне мая выстаўка. Яе наведалі 100 тысяч чалавек. Факт красамоўны, небывалы ў маім жыцці. Я адчуў кантакт з народам, з савецкай публікай, і гэта мяне глыбока ўсхвалявала. Такая ўвага і любоў да работы мастака напамінаюць пра яго абавязак і адказнасць перад народам».

Савецкія музеі, як ужо сказана, маюць добрую калекцыю твораў Гутуза. Гісторыя гэтай калекцыі — жывое сведчанне сапраўды сяброўскіх сувязей паміж мастаком-камуністам і Савецкай краінай.

Пачатак калекцыі быў пакладзены ў 1949 годзе, калі Гутуза за прыслаў карціну «Парабкі Калабрыі» ў падарунак савецкаму народу. У 1957 годзе два вялікія малюнкі былі ў ліку калектыўнага падарунка прагрэсіўных італьянскіх мастакоў маскоўскаму Музею выяўленчых мастацтваў. У 1961 годзе з выстаўкі Гутуза былі набыты такія шэдэўры, як «Партрэт Рока з сынам», «Натоўп», «Чалавек, які пераходзіць плошчу». Але лепшую карціну — «Рока з патэфонам» — Гутуза падарыў. «Я люблю Рока,— сказаў мастак,— я палюбіў савецкіх людзей, і мне хацелася падарыць вам менавіта гэту карціну».

Такім чынам, калекцыя савецкіх музеяў мае двайную каштоўнасць — з аднаго боку, як сведчанне дружбы, з другога — як збор першакласных твораў, якія даюць уяўленне аб розных этапах творчай эвалюцыі мастака.

Карціна «Парабкі Калабрыі» звязана з работай Гутуза над славутым палатном «Заняцце ялавых зямель у Сыцыліі». Гэта адчуваецца і ў сюжэтным матыве, і ў кампазіцыйным рашэнні, і ў самой абагульненай, крыху ўмоўнай манеры выяўлення. Але калі ў вялікай карціне адлюстраваўся неўтаймаваны, няспынны рух мас, дык у «Парабках Калабрыі» дадзены вялікі прыватны эпізод гэтай барацьбы. Пераможаныя, але не зламаныя парабкі нібы працягваюць свой гераічны марш. Скаваныя адным ланцугом, яны ідуць проста на гледача, уяўляючы сабой адзіную, маналітную групу. Твары іх мала індывідуалізаваны. Гутуза не ўдаецца ў псіхалагічныя тонкасці: галоўнае для яго — паказаць адзінства гэтых людзей, іх салідарнасць, іх волю да барацьбы.

Аднак Гутуза можа быць і знаўцам чалавечай душы, умее раскрываць праз нямногія дэталі самую сутнасць чалавечага характару. Гэта адносіцца да цыкла жанравых партрэтаў 1956—1960 гг. Цэнтральнымі творамі гэтага цыкла з'яўляюцца два партрэты Рока Каталана, маладога калабрыйскага парабка, які ў пошуках заробку пакінуў родныя мясціны.

Лёс Рока ў нейкай меры тыповы для беднякоў поўдня Італіі. Гэта тыповасць адбілася і ў партрэтах. Перад намі горкая аповесць аб душэўным багацці, не патрэбным нікому ў свеце капіталізму, аб трагедыі чалавека, адарванага ад роднай глебы, аб адзіноце і спеючых сілах пратэсту.

У «Партрэце Рока з сынам» (Эрмітаж) Гутуза звяртаецца да адвечнай тэмы моцнага і добрага чалавека, які абараняе слабую істоту. З беражлівай пяшчотай абдымаюць натруджаныя цяжкія рукі кволае цельца дзіцяці, нібы імкнучыся прыкрыць, аберагчы яго. Дзіця спіць, а бацька насцярожана ўзіраецца ў далячынь, і ў вачах яго з трагічным зломам броваў застыла трывога і грознае пытанне: «Як можна дапусціць, каб было дрэнна дзіцяці?» Сам каларыт карціны здаецца трывожным, мяцежным: ён пабудаваны на кантрасце яркіх насычаных тонаў (у процілегласць роўнаму, халаднаватаму каларыту больш ранніх карцін).

«Рока з патэфонам». Гэта, безумоўна, адзін з лепшых твораў Гутуза па сіле і глыбіні адлюстравання.

Палатно мае і іншую назву: «Нядзеля калабрыйскага рабочага ў Рыме». У ім з дзівоснай сілай і прастатой выказана пачуццё адзіноты чалавека, адарванага ад радзімы.

У Эрмітажы захоўваецца яшчэ адзін твор 60-х гадоў — «Натоўп», ён крыху адрозніваецца па манеры ад партрэтаў Рока. Гэта манументальная шматфігурная кампазіцыя. Выканана яна вугалем на паперы, наклеенай на палатно, і толькі дзе-нідзе пройдзена маслам. Мастак свядома выкарыстоўвае ў манументальнай кампазіцыі бегласць накіду, скорапіс замалёўкі, каб вастрэй перадаць своеасаблівае адчуванне руху і мільгання незнаёмых твараў. «Натоўп» з яго дзівосным рашэннем масавай сцэны, сапраўды унікальны ў сучасным мастацтве.

У Музеі выяўленчых мастацтваў знаходзіцца і адна з карцін-спадарожнікаў «Натоўпу» — «Чалавек, які пераходзіць плошчу». З надзвычай вострым, амаль фізічным адчуваннем жэсту перадае Гутуза хаду чалавека, апанаванага думамі, які нічога не заўважае вакол. Людная плошча для яго пустынная, ён засяроджаны ў сабе, здаецца нават, што ён вядзе нейкую спрэчку з самім сабой, выражае нешта вельмі важнае. Таму такія цяжкія яго крокі, нібы ступае ён не па роўным бруку, а па ўздыбленай дзікай зямлі.

Такія шэдэўры Гутуза, якія паступілі ў Эрмітаж і Музей выяўленчых мастацтваў з выстаўкі 1961 года. Пазней, у 1966 годзе, маскоўскі музей набыў экспрэсіўны партрэт Тальяці, які выступае на мітынгу,— вобраз народнага трыбуна. У 1970 годзе Гутуза ў гонар ленінскага юбілею напісаў і прынёс у падарунак савецкаму народу яшчэ адну карціну «У космас» — партрэт Юрыя Гагарына ў кабіне касмічнага карабля. Галава юнака ў шлёме, якая выступае з блакітнага зяння, успрымаецца як сімвал, як гімн мужнасці савецкага чалавека, што скарыў космас.

Сяброўскія сувязі савецкіх людзей і вялікага італьянскага мастака глыбокія і шчырыя. Гэта добра выказаў сам Гутуза ў сваёй прамове пры ўручэнні яму ў 1963 годзе дыплома ганаровага члена Акадэміі мастацтваў СССР: «Савецкі Саюз абараніў жыццёвасць і цэласнасць асноўных каштоўнасцей чалавека... У справядлівай барацьбе за сапраўды гуманнае мастацтва сацыялізм — адзіная магчымасць, адзіная перспектыва развіцця новага мастацтва, звязанага з сучасным чалавекам, яго праблемамі, яго жыццём».

Савецкія гледачы палюбілі Гутуза, высока цэняць яго і савецкія мастакі. З нагоды 60-годдзя выдатнага мастака Італіі савецкія людзі жадаюць Рэнату Гутуза новых вялікіх поспехаў у жыцці і творчай працы.

Варвара ТУРАВА,
кандыдат мастацтвазнаўства.
(АДН).

Большасць запрошаных на перадачы — людзі, якія выступаюць па тэлебачанні ўпершыню. Работнікі рэдакцый імкнуцца прыцягваць да работы як мага больш удзельнікаў, лічаць, што перадачы, якія не «зарэпеціраваны» канчаткова, у якіх ёсць элемент імправізацыі, асабліва прыцягваюць гледачоў, бо робяць іх саўдзельнікамі таго, што адбываецца на экране.

І хоць гэта тоіць у сабе розныя небяспечныя нечаканасці (хто ведае, да якой меры можа разгубіцца неспрактыкаваны чалавек?), гомельскія тэлежурналісты не адмаўляюцца ад такой формы перадач, якую лічаць арганічна ўласцівай тэлебачанню. Пастаянны пошук, імкненне да таго, каб перадачы былі дзейснымі, прыцягвалі шырокую аўдыторыю гледачоў, вызначаюць работу як старшага рэдактара В. Калчуновай, так і яе калег: Л. Строкавай, Л. Шастаковай, Г. Мартынавай, М. Сапранковай.

Журналістыка — неспакойная прафесія, тэлежурналістыка — удвая. Акрамя той энергіі і ведаў, якімі павінен валодаць кожны журналіст, работнік тэлебачання павінен мець пэўныя тэхнічныя веды, неабходныя для дакладнай арганізацыі перадач. Віка Калчунова таксама свабодна валодае фотаапаратам, як і пішучай машынкай, з выстаўкі ў Манрэалі яна прывезла для тэлебачання свой фільм, у выпадку неабходнасці можа замяніць аператара ля тэлекамеры, добрыя галасавыя дадзеныя дазваляюць ёй непасрэдна ўдзельнічаць у перадачах як дыктару і каментатару.

У гэтай рэдакцыі працуюць сумленна, самааддана, натхнёна. Таму тут частыя ўдачы. Многа здольных юнакоў і дзяўчат з Гомельшчыны ўдзельнічалі ў перадачы «Ало, мы шукаем таленты», былі сярод іх і пераможцы. І ўзнагародай гомельскім тэлежурналістам быў прыезд да іх першай канцэртнай брыгады з удзельнікаў усесаюзнай перадачы. Іх выступленне на суперфасфатным заводзе трансліравалася на ўсю краіну.

А рэдакцыя і далей шукае новыя формы, новыя рубрыкі, новыя шляхі да сэрцаў гледачоў.

Святлана КЛІМКОВІЧ.

«Груз» гэтага карабля — песня...

НА ШЛЯХУ ДА СТАЛАСЦІ

У КАНЦЫ мінулага года ўбачыў свет новы зборнік прозы Анатоля Кудраўца. Літаратурнае імя яго добра знаёма чытачу. Дэбютаваў пісьменнік шэрагам цікавых апавяданняў, галоўны герой якіх быў надзелены сапраўднай чалавечнасцю, спагадлівасцю, шчырым спачуваннем людзям, страсным імкненнем зразумець іх. І гэта, думаецца, у першую чаргу, звярнула на сябе ўвагу крытыкі. Вызначыла поспех першай кніжкі пісьменніка «На зялёнай дарозе». Заўважана была яшчэ адна адметная акалічнасць: моцная сувязь аўтара «з родным светам», сувязь з вясковым жыццём, праўдзівае і глыбокае адлюстраванне якога, відаць, стала надзённай творчай задачай А. Кудраўца. Героі апавяданняў уразілі непасрэднасцю паводзін, прастатой, шчырасцю ўзаемаадносін, нейкай першароднай дабратой да зямлі-карміцелькі, да людзей. І якія б праблемы ні вырашаліся ў творы пісьменніка—сацыяльныя, маральна-этычныя —ён заўсёды застаецца адданым праўдзе жыцця, у цэнтры ўвагі заўсёды стаіць чалавек з яго складаным характарам, псіхікай. Нездарма ж таленавітасць першых апавяданняў А. Кудраўца адзначыў вельмі прыязнай рэцэнзіяй Янка Брыль.

Чарговая кніга пісьменніка сведчыць, што ён не губляе сувязі з роднымі мясцінамі, яны па-ранейшаму жывяць аўтара, даюць дастаткова багаты матэрыял для пераўтварэння яго, як пісаў Кузьма Чорны, «у новыя якасці»—у сапраўднае мастацтва. І гэта заканамерна. Пісьменнік захоўвае і развівае ў творах думкі, настрої, асабліва блізкія яму, піша, адчуваючы пакутлівую неабходнасць расказаць пра жыццё, якое добра ведае з дзіцячых гадоў, якое пільна назірае і цяпер, наведваючы бацькоўскі кут.

Знаёмячыся з творамі новай кнігі, нельга не прыкмеціць, што ўвага пісьменніка засяроджваецца, галоўным чынам, на маральна-этычных праблемах. Менавіта ў гэтым кірунку дасягае ён найбольшага поспеху, раскрываючы характары сваіх герояў пераважна праз адносіны іх да кахання. Гэтай вечнай, традыцыйнай у літаратуры тэме прысвечаны ў пэўным сэнсе і аповесць «Раданіца», і апавяданні «Елачка», і «Холад на пачатку вясны». Мы напаткаем тут і наіўнае, чыстае і светлае ў сваёй дзіцячай непасрэднасці, пачуццё хлапчука Кастуся да партызанкі Тані («... ён яшчэ раз рашыў, што будзе любіць толькі Таню. Яна такая добрая, яна прыносіць Вову малако, і ў яе ў чамаданчыку ляжыць сапраўдны наган...»), і суровае і пакутлівае, страчанае па ўласнай віне каханне Мірона, і вялікае, шчырае каханне Івана Купцова і Веры, каханне, да якога яны ішлі вельмі доўга, нялёгкай дарогай... Карацей, аўтар малюе нам знаёмыя перыпетыі кахання—шчаслівага і нешчаслівага. І гэта, відаць, не вельмі б уразіла чытача, калі б пісьменнік не здолеў убачыць нешта адметнае ў жыцці і пачуццях герояў, паказаць вялікае чалавечае пачуццё не абстрактна, а ў цеснай сувязі з сацыяльным быццём, на фоне паўсядзённага паўнакроўнага жыцця.

Аповесць «Раданіца» прываблівае надзвычай светлым лірычным настроем, той атмасферай зычлівасці і сардэчнасці, якая існуе паміж галоўным героем і яго землякамі. Вылучаецца твор простым, але добра скампанаваным сюжэтам. Інжынер Іван Купцоў едзе з горада ў адведкі ў родную вёску Буднеў, каб на даўняму і мудраму звычаю раданіцы схадзіць на могілкі і памянуць добрым словам памерлых сваякоў. І па дарозе, і ў самой вёсцы, і на могілках ён сустракаецца з аднавяскоўцамі. І гэтыя сустрэчы абуджаюць жывыя ўспаміны аб мінулым. Ён думкамі вяртаецца ў пражытае і перажытае, у сваё юнацтва. Прыгадваецца многае—і ціхае, яшчэ не зразуметае да канца ім самім, цнатлівае каханне да Веры, і трагічны момант смерці бацькі, і шмат якія перажыванні, у якіх адлюстравалася людская горыч з нагоды розных падзей. І вось ужо апавяданне вядзецца адначасова—і пра сённяшняе, і пра мінулае вёскі Буднева. Але экскурс у мінулае ніколькі не перашкаджае лірычнай плыні, не замаруджвае яе, не адрывае ад сённяшняга дня, наадварот, яшчэ мацней падкрэслівае ў герої рысы нашага сучасніка. Шматлікія філасофскія і лірычныя разважанні героя, яго роздум над з'явамі жыцця цэментуюць мастацкае палатно аповесці, паглыбляюць яе змястоўнасць.

Чытаючы пра раданіцу, думаеш не толькі над тым, як аўтар хораша малюе гэтае традыцыйнае народнае свята,—сочыш за цікавасцю і важнасцю думак...

«...ён (Іван Купцоў.—**Я.К.**) любіў раданіцу, гэтыя калектыўныя помінкі. Гэта было як свята. Людзі цішэлі, лагаднелі, з разуменнем і спагадай глядзелі адзін на другога. Здаецца, яны пачыналі бачыць, што ўсе сваркі, якія часам не давалі спакою нармальнаму жыццю, псавалі шмат крыві і нерваў,— нішто ў параўнанні з тым, дзеля чаго яны сабраліся тут, і таму рабіліся ветлівымі, дабрачымі.

Могілкі стаялі недалёка ад сяла...»

Так ужо спрадвеку на зямлі—жыццё і смерць побач. І прыгадваючы смерць бацькі, і думаючы аб старой маці, якая дажывае апошнія свае гады ў вёсцы, нарэшце, уваскрашаючы ў памяці ўсіх тых, каго ведаў і любіў і хто ўжо вечным сном спіць на могілках, аўтар нібы знарок акцэнтуе ўвагу на думцы: у чым сапраўдны сэнс жыцця, як трэба жыць, як кахаць, каб і цябе калі-небудзь успомнілі звычлівым словам людзі. І не толькі на могілках... Можна ж пражыць доўгае жыццё, сумнае, бескарысліва-пустое, такое, як у Вавілы Пухціка, які ўсё мерае адной меркай—грашыма... Можна пражыць яшчэ горш, яшчэ жудасней—як здраднік Байда, былы паліцай, што адседзеў у турме, вярнуўся ў Буднеў жывыздаровы, але якому да самага скону не даруюць вяскоўцы... Можна, ды ці варта, ці да твару чалавеку? Ёсць жа другое жыццё, прыгожае і вялікае. Гэта жыццё шчырага на сэрца, светлага на думкі працаўніка, сумленнага чалавека. Такое, якое было ў бацькі Івана Купцова, што заўчасна абарвалася на працы ў лесапільні. Нездарма ж са шчымлівым болем і заўсёдным смуткам носіць у сэрцы дарагі вобраз бацькі Іван Купцоў, помніць, як запавет, бацькавы словы, напоўненыя глыбокім сэнсам: «Трэба спяшыць жыць, а не—дык і на што жыць». І ён, Лявон, жыў на зямлі, як мае быць. Ён любіў працу, любіў тых, з кім працаваў, любіў сваіх дзяцей, кахаў жонку і ўмеў радавацца ўсяму жывому—і зязюлі, і набухлым бутончыкам яблыневых кветак увесну... Гэтыя чалавечыя якасці бацькі перайшлі да сына. Яны, бадай, толькі ўзмацніліся ў характары Івана Купцова, набылі шырэйшыя адценні. Міжволі захапляешся гэтым маладым чалавекам—добрым і чулым, разумным і спагадлівым. І ўжо не выклікае здзіўлення яго чыстае каханне да Веры: так, ён здатны на **такое** каханне, другога ў яго быць не можа Ён пранёс ад самага юнацтва гэтае цнатлівае пачуццё, праз усю сваю маладосць, нават сам не здагадваючыся, што гэта... Магчыма, як чытаем у аповесці, на пачатку юнацкае пачуццё было толькі мроістай «марай аб каханні». Але марай шчырай, рэальнай, сапраўднай, якая ўпотай развівалася, сталела, калі можна так сказаць, разам з героем. І таму Івана Купцова не можа спыніць на гэтым шляху да вялікага кахання ніякая перашкода, нават тое, што Вера была замужам, што яе на вёсцы пагардліва называюць «раззвядзёнкай». Вядома, пісьменнік не спрашчае складанасцей ва ўзаемаадносінах паміж Іванам і Верай: паміж імі, як сведчыць аўтар, пэўны час стаяла «нешта такое, што не давала ім адчуць сябе вольна, непасрэдна» і перашкаджала каханню. Але недзе ў падтэксце праходзіць выразная думка, што і за асабістае шчасце трэба змагацца, цярпліва, настойліва шукаць яго, а знайшоўшы аднойчы—не губляць, усяляк аберагаць. І калі Іван Купцоў у канцы аповесці з радасным здзіўленнем прызнаецца сабе, што ён незвычайна шчаслівы збліжэннем з Верай, што яшчэ «...**такога** з ім ніколі не было», «каб чалавек адразу стаў такім **сваім**», блізкім і зразумелым, сапраўды родным, мы верым яму, верым яго гарачаму каханню, бо верым аўтару, які вельмі тактоўна і разам з тым надзвычай эмацыянальна намаляваў нам гісторыю кахання маладых людзей.

Аповесць «Раданіца» ўражвае, будзіць думку, прымушае нас задумацца над многімі важнымі жыццёвымі пытаннямі. І ў гэтым яе несумненная вартасць. З прыемнасцю зазначаем, што тыя людзі, з якімі пазнаёміў нас аўтар, — прываблівa-простыя добрыя і праўдзівыя, у іх паводзінах, размовах няма і намёку на нейкую позу або ненатуральнасць. Такі і настаўнік мясцовай школы Іван Амельянавіч, якога непакоіць складанасць выхавання дзяцей у сучасных умовах, такая і руплівая Алёкса—Іванава маці, заклапочаная лёсам свайго сына.. Ёй прысвечана нямала пранікнёных слоў у творы. Нельга, напрыклад, без хвалявання чытаць радкі пра сустрэчу сына з маці: «Блісне святло, і вось ужо ён абнімае яе, цёплую ад печы, маленькую, бездапаможна зажмураную ад яркага святла, у спехам надзетай прасторнай сукенцы, адчувае шурпатасць яе разагрэтай сном мяккай шчакі і пакатасць вузкіх, прыгорбленых плячэй...»

Падобных паэтычных мясцін, прасякнутых замілаванасцю і пяшчотай да блізкіх, да роднага краю, у аповесці многа. І каларытныя вобразы вяскоўцаў, і дакладная мова твора сведчыць аб несумненным майстэрстве пісьменніка. Ён валодае пэўным дарам па-мастацку раскрыць характары герояў, псіхалагічнатонка абгрунтаваць іх учынкі, умела звязаць інтымнае з грамадскім.

Але часам, хоць і рэдка, чытаючы твор, ловіш сябе на прыкрай думцы: гэта ўжо—з большай ці з меншай эмацыянальнай дакладнасцю і непасрэднасцю — недзе было сказана, гэта ўжо чытаў раней... Мажліва нават у апавяданнях таго ж А. Кудраўца. Паўтарэнне асобных бытавых сітуацый, фактаў—з'ява ўвогуле непажаданая, нават небяспечная для пісьменніка, асабліва для здольнага. Душэўна абжыты ў іншых творах матэрыял не павінен абмяжоўваць аўтара, быць перашкодай на шляху яго творчага развіцця, на шляху асваення новых пластоў рэчаіснасці.

Ёсць падставы спадзявацца, што пасля кнігі «Раданіца» А. Кудравец, удумлівы і назіральны пісьменнік, не спыніцца на дасягнутым, значна пашырыць дыяпазон тэм, блізкіх яго сэрцу, важных сваёй надзённасцю для людзей. Гэтага вымагае час, гэтага вымагае логіка развіцця таленту.

Яўген КАРШУКОЎ.

Анатоль Кудравец. «Раданіца». Аповесць і апавяданні. Выдавецтва «Беларусь». Мінск, 1971.

ВАЧЫМА ДЗЯЎЧЫНКІ

Новая кніжка аўтара — новыя героі, новыя падзеі, новыя з'явы. З такімі думкамі возьме юны чытач другую кніжку Клаўдзіі Каліны «Забароненая песня» (яе першая кніжка «Хлопчык-пакідайчык» выйшла летась) і, адгарнуўшы старонку, адразу ж зацікавіцца раздзелам «Чароўнае шкельца».

Якія ж чары мае тое каляровае шкельца? Праз яго трое «Марысіных унукаў» — Кася, Васіль і Міхасік, якія сядзяць на печы, што займае «амаль палову хаты», глядзяць на свет за вокнамі, і ён ім здаецца зусім інакшым.

Чаму іх называюць Марысінымі ўнукамі, дзе ж бацькі? Тата з мамай старэйшага грошай на карову: бабка з восені выправіла іх у заработкі, а сама адна даглядае ўнукаў.

Так аўтар з першых старонак уводзіць свайго юнага чытача ў жыццё сялян Заходняй Беларусі да верасня 1939 года.

Нудна і самотна дзецям у хаце. З якою зайздрасцю паглядае Васіль раніцай праз дзірачку-праталіну, прахуканую ў намёрзлай шыбе, на дзяцей, што ідуць у школу за пяць вёрст. Яму таксама надышлі гады вучыцца, ды няма абутку: бабка сама ашчаджае кожны злоты на карову і не дазваляе сыну і нявестцы траціць грошы на што-небудзь іншае.

Карова-карміцелька больш патрэбна і для хваравітага Міхаські, і для ўсёй Белановічавай сям'і, чым тая навука Васілю, лічыць бабуля. А панскім уладам хочацца найхутчэй паланізаваць беларусаў, яны не бяруць пад увагу беднасці і галечы: хлопчык павінен хадзіць у польскую школу, а інакш—штраф. Бабка Марыся згодна спрасці ванзэлак бялюткай воўны ў аддзяку старасце, які прыносіць другое папярэджанне, абы той не вымагаў немагчымага. Вось купяць карову, палягчэе ім жыць, і Васіль тады вучыцца пойдзе, абавязкова пойдзе.

А пакуль што Васілю трэба бавіць час у хаце разам з меншымі братам і сястрычкай. Слухаць бабчыны казкі ды праўдзівыя здарэнні з яе жыцця. Ну што, здаецца, можна расказаць пра стары куфар, што стаіць у кутку хаты, на якім ляжыць, параніўшы галаву ў час дамалотак панскага збожжа, Касін бацька? Аказваецца, можна. Куфар мае сваю гісторыю. Бабка Марыся расказвае, як вандравала з ім бежанкай пад час першай сусветнай вайны і як у гэтым куфры выратавала чыгуначніка ад махноўцаў.

Амаль кожны раздзел аповесці (а іх больш за сорак) уяўляе сабою маленькае апавяданне, звязанае агульнай ідэяй твора, агульнымі героямі. Таму і інтрыгуе кніга чытача: што ж будзе далей?

А далей падзеі выходзяць за сцены Белановічавай хаты. Чытач бачыць, якое змаганне беднаты з багацеямі ідзе ў Макранах, як заможнік Зубовіч дапамагае паліцыянту Халяўку асачыць і злавіць Данілу Змітрука. Таго Данілу, што арганізоўвае беднату на барацьбу з панамі за лепшае жыццё, за родную мову, за права спяваць забаронены «Інтэрнацыянал».

Пазней скатаванага, выпушчанага з турмы па хваробе Данілу адпусцяць дахаты, але і хворы ён не перастане весці змаганне з панскай уладай да скону дзён. Пахаванне Змітрука вылілася ў магутную дэманстрацыю: выйшлі не толькі макранцы, але з суседніх вёсак беднякі. Паліцыянты не наважыліся перашкодзіць арганізаванаму пахаванню, хоць і ведалі, каго хавалі людзі, хоць і бачылі, што «на белай кашулі нябожчыка палымнела чырвоная стужка».

Пра ўсё гэта расказвае дзяўчынка Кася нібыта спакойна, але колькі ў тым спакоі гневу і драматызму!

Шмат дабраты і нянавісці можа ўмяшчаць у сабе дзіцячае сэрца. Вось чаму «крадзеж» мёду Касяй і Васілём у кулака Зубовіча лічыш праўмерным, калі чытаеш твор. Не сабе на ласунак адкалупвае Васіль зацукраваны нектар, залезшы з Касяй праз гарышча ў Змітрукову хату. (Гэту хату стараста заарандаваў у Данілавай жонкі тады, калі Змітрука пасадзілі ў турму, а жанчыне не было чым плаціць падатку). Мёд патрэбен на лекі іх сяброўцы-школьніцы, хворай Хане, а купіць Мэндаль, яе бацька, не можа: «няма за што, бо ён дарагі». І дзве чулыя дзіцячыя душы ратуюць трэцюю.

Аднойчы ў школе на перапынку Ванда Чарнецкая, камендантава дачка, пакрыўдзіла Касю Белановіч. Настаўнік высвятляе, хто зрабіў гэта, і ў невялічкай худзенькай Ханы хапіла смеласці падняць руку, устаць і расказаць перад усім класам настаўніку праўду.

— Чарнецкая, папрасі ў Касі прабачэння, — загадаў настаўнік, выявіўшы вінаватых.

Не паслухалася Ванда пана Янкоўскага.

— Ніколі не папрашу ў гэтай мужычкі прабачэння! У гэтай хамкі, — схапіла яна свой партфель і выбегла з класа. Чаму ж не паслухалася настаўніка Ванда? Бо з малых гадоў адчувала сваю перавагу над вучнямі-беднякамі і ведала, што ёсць каму заступіцца за яе. Неўзабаве камендант і кіраўнік школы дамагліся свайго: Янкоўскі пакідае клас. Чалавечнаму настаўніку, які лічыць усіх вучняў роўнымі — няма месца ў такой школе.

Маленькі, але яскравы эпізод навучання ў санацыйнай Польшчы. Гэта ж класавая няроўнасць добра паказана ў раздзеле «Панскі бокс і мужыцкія кулакі».

Заканчваецца кніга ўступленнем савецкіх войск у Макраны восенню 1939 года. Праўда, у апошніх двух раздзелах аўтар абмяжоўваецца скарагаворкай.

Напісана аповесць з душэўнай цеплынёй, гэтаму яшчэ дапамагае форма падачы ад першай асобы.

Закрываеш кнігу і хочацца спытаць у аўтара:

— А які ж далей:шы лёс гэтых цудоўных юных герояў?

Відаць, прыйдзецца Каліне расказаць пра іх. А пакуль можна сказаць адно: вучні сярэдняга і старэйшага ўзросту атрымалі яшчэ адну цікавую кніжку.

Алесь ПАЛЬЧЭЎСКІ.

Клаўдзія Каліна. «Забароненая песня». Аповесць. Выдавецтва «Беларусь». Мінск, 1971.

А КАРЫСЦЬ МАГЛА Б БЫЦЬ БОЛЬШАЯ

ЛЕТАСЬ ў выдавецтве «Народная асвета» выйшаў школьны гістарычны слоўнік «Тэрміны, імёны, даты». Задача яго, як сцвярджаецца ў слове «Да чытача», дапамагчы «вучням лепш засвоіць асноўныя паняцці, імёны і даты, што вывучаюцца на ўроках гісторыі ў V—X класах сярэдняй школы». Складаецца слоўнік з трох раздзелаў. У першым растлумачваецца 440 гістарычных тэрмінаў, з якімі сутыкаюцца вучні пры вывучэнні школьнага курсу гісторыі. У другім раздзеле сабраны кароткія звесткі пра дзяржаўных, партыйных, ваенных дзеячоў, вядомых людзей культуры, навукі і мастацтва розных народаў. Трэці раздзел складаюць храналагічныя і сінхранічныя табліцы важнейшых падзей сусветнай гісторыі.

Такі слоўнік у нашай рэспубліцы выдаецца ўпершыню, і таму яго выхад у свет трэба толькі вітаць. На вялікі жаль, ён выклікае шэраг сур'ёзных крытычных заўваг, якія тычацца ўсіх трох раздзелаў, а найперш—другога.

На тытульным лісце кнігі стаіць прозвішча яе аўтара: Ю. М. Суворaў (менавіта аўтара, а не складальніка). Значыць, слоўнік трэба разглядаць як самастойную, арыгінальную навуковую працу? Але ж нават пры беглым азнаямленні з кнігай заўважаеш, што большасць артыкулаў першага раздзела — гэта вытрымкі з артыкулаў «Малой Советской Энциклопедии» і «Большой Советской Энциклопедии», перакладзеныя (дарэчы, не заўсёды пісьменна) на беларускую мову. Нагадаем некалькі прыкладаў.

«АБ'ЯДНАНЫЯ НАЦЫІ — тэрмін, якім прынята было называць дзяржавы, што ў перыяд другой сусветнай вайны 1939—1945 гг. уваходзілі ў антыфашысцкую кааліцыю і падпісавалі стварэнне ў 1945 г. Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН)».

Гэты артыкул без аніякіх змен узяты з «МСЭ».

Ну, а як жа паступае аўтар з больш шырокімі артыкуламі і тлумачэннямі? Тут ён карыстаецца выбарачнымі сказамі з тых жа энцыклапедый. Чытаем, напрыклад:

«ГУСІТЫ—удзельнікі антыфеадальнага, нацыянальна-вызваленчага і антыкаталіцкага руху ў Чэхіі (першая палавіна XV ст.). Назву атрымалі па імю Яна Гуса. Унутры гусіцкага руху склаліся дзве плыні: умераная (чашнікі) і радыкальная (табарыты). Гусіцкі рух прывёў да аслаблення пазіцый каталіцкай царквы і нямецкіх феадалаў у Чэхіі, аказаў вялікі ўплыў на наступную гісторыю чэшскага народа, садзейнічаў распаўсюджванню рэфармацыйных ідэй у Еўропе».

Тут Ю. Суворaў выкарыстаў артыкул з «МСЭ»—«Гусіцкія войны», шляхам выбаркі паасобных сказаў.

Яшчэ прыклад. Параўнаем артыкулы «Дваровыя людзі» ў слоўніку Ю. Суворава і ў «МСЭ».

«ДВАРОВЫЯ ЛЮДЗІ — катэгорыя прыгонных сялян, пазбаўленых зямельных надзелаў у Расіі з канца XVII ст. да 1861 г. Большасць дваровых людзей жылі ў панскіх дварах амаль у рабскім становішчы».

«ДВОРОВЫЕ ЛЮДИ — категория крепостного населения, существовавшая в России с конца 17 в. до отмены крепостного права (1861). Д.л.—это крепостные крестьяне, лишенные земельных наделов. Большинство Д.л. жило в господских дворах, находилось почти в рабском положении», 1 г. д.

Як бачым, творчай працы Ю. Суворава тут, шчыра кажучы, не шмат.

Але гэта яшчэ паўбяды—у сэнсе вартасці слоўніка. Гэтыя калькаваныя артыкулы ўсё ж даюць вучням пэўнае ўяўленне пра гістарычныя тэрміны. Куды горшая справа з другім раздзелам—з раздзелам імёнаў.

Мы разумеем, што аўтар кіраваўся пры падрыхтоўцы слоўніка школьнай праграмай, і таму, натуральна, ён не мог уключыць у яго імёны ўсіх, нават самых выдатных дзеячоў культуры, навукі і мастацтва. І ўсё ж...

Неяк дзіўна, што ў слоўніку няма імёнаў М. Ісакоўскага, М. Рыльскага, С. Канёнкава, Л. Украінкі, Р. Амундсена, Ш. Пецёфі, Ш. Руставелі і многіх іншых імёнаў, якія абавязкова павінны быць у шырокім ужытку школьнікаў. Гэта тым больш відавочна, што многія імёны ў слоўніку здаюцца не абавязковымі.

Але найбольшае недаўменне выклікае тое, як прадстаўлены ў слоўніку дзеячы навукі, культуры і мастацтва нашага народа. У ім мы не знаходзім звестак пра народных паэтаў і пісьменнікаў Беларусі П. Броўку, А. Куляшова, К. Крапіву, М. Танка, М. Лынькова, забыты тут К. Чорны, М. Клімковіч (аўтар нашага Дзяржаўнага гімна), П. Глебка, П. Галавач, Я. Маўр, М. Чарот і іншыя выдатныя майстры слова. Няма ў слоўніку імёнаў народных мастакоў рэспублікі З. Азгура, І. Ахрэмчыка і А. Бембеля, народных артыстаў СССР Л. Александроўскай, І. Жыновіча, Л. Ржэцкай, Р. Шырмы. Зусім забыты беларускія савецкія вучоныя, многія партыйныя і дзяржаўныя дзеячы, героі Вялікай Айчыннай вайны. У прыватнасці, няма ў слоўніку імёнаў Ул. Галубка, А. Чарвякова, В. Харужай, М. Шмырова (Бацькі Міная) і многіх іншых слаўных сыноў і дачок беларускага народа.

А чаго варты некаторыя нататкі! Пра Янку Купалу ў слоўніку сказана: «КУПАЛА Я. (1882—1942 гг.)—беларускі савецкі паэт, аўтар многіх вершаў і паэм». Амаль тое ж самае сказана і пра другога нашага песняра: «КОЛАС Я. (1882—1956 гг.)—беларускі савецкі пісьменнік, аўтар многіх вершаў, паэм («Новая зямля», «Хата рыбака» і інш.), аповесці «Дрыгва», рамана «На ростанях».

Міжволі пачынаеш думаць, што гэтыя звесткі аўтар узяў нават ужо не з «МСЭ», а з адрыўнога календара. Чаго варта адно гэтае: «Хата рыбака»! Аўтару нават няўцям, што паэма Якуба Коласа называецца «Рыбакова хата»!

У слоўніку ўказваюцца толькі прозвішчы, без імён і імён па бацьку. Думаецца, што гэта таксама недагляд аўтара і рэдакцыі (дарэчы, слоўнік выйшаў пад рэдакцыяй члена-карэспандэнта Акадэміі педагагічных навук СССР, доктара гістарычных навук, прафесара Л. С. Абецадарскага). Не задаволіць школьнікаў і настаўнікаў і скупасць іншых звестак, у прыватнасці, адсутнасць дат нараджэння і смерці вядомых свету людзей.

Акрамя гэтага, слоўнік пазбаўлены спецыфічнай для такіх выданняў лаканічнасці, не мае агульнапрынятых скарачэнняў...

Школьны гістарычны слоўнік павінен быў бы мець трывалую навуковую аснову, якая не дапускае выпадковасцей і відавочных пралікаў.

С. ШУШКЕВІЧ.

ЗМЯСТОЎНЫ ПАДРУЧНІК

Няма патрэбы даказваць, якое вялікае значэнне мае кніга ў жыцці савецкага чалавека, якая пачэсная і адказная роля рэдактара ў выдавецкім працэсе, у выпуску дабраякаснай кніжнай прадукцыі. Аб гэтым яскрава сведчыць хаця б апошняя дыскусія, праведзеная на старонках «Литературной газеты». Таму выхад у свет новай працы прафесара М. М. Сікорскага, аўтара шматлікіх даследаванняў у галіне кнігазнаўства і рэдагавання, трэба лічыць вельмі патрэбным і своечасовым.

Кніга выдадзена як падручнік для студэнтаў рэдактарскіх факультэтаў паліграфічных інстытутаў і рэдакцыйна-выдавецкіх аддзяленняў факультэтаў журналістыкі універсітэтаў. Аднак яна будзе не ў меншай меры карыснай таксама для практычных работнікаў рэдакцый газет і часопісаў, выдавецтваў і службаў навукова-тэхнічнай інфармацыі.

Кніга М. Сікорскага адлюстроўвае сучасны стан кнігазнаўчай навукі. У ёй абагулены шматгадовы вопыт рэдактарскай работы аўтара, выкарыстаны ўсе важнейшыя публікацыі па тэорыі і практыцы рэдагавання, новыя дакументы, якія характарызуюць работу кніжных выдавецтваў.

Вызначаючы метадалагічныя асновы рэдагавання ў савецкіх выдавецтвах, аўтар у першую чаргу падкрэслівае яго ідэалагічны, палітычны аспект. Друк, навука, мастацтва і літаратура ва ўмовах сацыялістычнай рэчаіснасці падпарадкаваны вялікай і высакароднай задачы — будаўніцтву камуністычнага грамадства. Рэдагаванне, як працэс, як форма работы і культурна-творчай практыкі, таксама служыць гэтай мэце.

У кнізе падрабязна і ўсебакова характарызуецца значэнне рэдактарскай і літаратурнай дзейнасці У. І. Леніна для тэорыі і практыкі савецкага рэдагавання, значэнне рэдактарскага вопыту рускіх пісьменнікаў-класікаў, вопыту М. Горкага і іншых савецкіх пісьменнікаў. Падкрэсліваючы, што рэдагаванне — справа партыйная, аўтар разглядае ў гэтых раздзелах такія важныя пытанні, як папулярнасць выкладу, адносіны рэдактара да працы аўтара, да яго індывідуальнасці, асаблівасці працы над мовай і стылем і г. д.

Шмат карыснага і цікавага матэрыялу знойдзе чытач у раздзелах, прысвечаных характарыстыцы выдавецкага працэсу ў цэлым і ролі ў ім рэдактара.

Рэдагаванне рукапісу — складаны і шматгранны працэс, які ахоплівае ўвесь комплекс пытанняў, звязаных са зместам і формай твора. Аўтар падручніка вельмі пераканаўча даводзіць, што патрабаванне адзінства формы і зместу — гэта важнейшы крытэрый ацэнкі ЛЮБОГА літаратурнага твора (не толькі мастацкага). Яно ў першую чаргу звязана з адпаведнасцю моўных і стылістычных сродкаў, якія выкарыстоўвае аўтар, тэме і зместу кнігі.

Вельмі актуальна гучаць разважанні аўтара кнігі аб умяшанні рэдактара ў рукапіс, аб прынцыповасці рэдактара, аб рэдактарскай этыцы.

Кніга М. Сікорскага, як і належыць падручніку, напісана яснай і выразнай моваю, фармулёўкі і вывады ў ёй сціслыя і дакладныя. Кніга мае стройную кампазіцыю, не перагружана ілюстрацыйным матэрыялам, яна — сапраўды змястоўнае і глыбокае даследаванне.

М. ЦІКОЦКІ,
дацэнт, загадчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання БДУ імя У. І. Леніна.

М. Сікорскі. «Творыя і практыка рэдагавання». На рускай мове. Выдавецтва «Высшая школа», М, 1971.

ГАВОРЫЦЬ РОДНАЯ ЗЯМЛЯ

Беларускія геаграфічныя назвы — пэўная частка лексічнага багацця роднай мовы. Таму зусім натуральна, што выдавецтва «Навука і тэхніка» выпусціла ў свет кнігу Я. Яшкіна «Беларускія геаграфічныя назвы». У працы на асцове сучасных і архіўных матэрыялаў падаюцца мясцовыя беларускія геаграфічныя назвы, якія вызначаюць марфалогію зямлі, гідралагічныя асаблівасці вадаёмаў, раслінныя асацыяцыі і ландшафт. Аўтар упершыню спрабуе сістэматызаваць і абагульніць багаты матэрыял геаграфічных назваў Беларусі, прасачыць іх гісторыю. Укладаючы слоўнік, Я. Яшкін думаў стварыць па магчымасці поўны даведнік апелятыўнай лексікі. Сабраны матэрыял з розных месц Беларусі паказвае, што вялікая колькасць геаграфічных назваў мае агульнабеларускае пашырэнне, частка займае акрэсленыя раёны, а паасобныя ўжываюцца толькі ў пэўных мясцінах.

У кнізе адлюстравана і старабеларуская лексіка. Шырока разглядаецца аўтарам утварэнне геаграфічных назваў ад пэўных прыродных умоў, асаблівасцей мясцовасці, расліннасці. Напрыклад: «навіна́», — у некаторых раёнах так называюць поле на месцы расцяробу або ўзаранай сенажаці. Але ёсць і назвы вёсак: Навіны (Навагрудскі раён), Навінка (Гомельскі раён), урочышчы Навінка (Слаўгарадскі раён).

У слоўніку прыводзіцца мноства змястоўнай і вобразнай беларускай лексікі, якая яшчэ не трапіла ў мастацкую літаратуру і не запатавана ў слоўніках. Вядома, без глыбокага вывучэння гаворак, сінанімікі народнай мовы, без адбору найбольш трапнага і змястоўнага слова нельга ўзбагачаць і літаратурную мову. Напрыклад, звычайна мы ўжо прывыклі да выразу «відаць, як на далоні», маючы на ўвазе віднае з усіх бакоў, адкрытае, высокае месца. А колькі ў адным толькі Слаўгарадскім раёне маем сінонімаў для абазначэння гэтага геаграфічнага аб'екта (відо́цы, лабо́к, лысаго́р, кол, далонь, тычок, вока, званіца, маяк, відо́ліца)!

Ці, напрыклад, да літаратурнага слова «выган» (абгароджаная дарога, месца каля населенага пункта, дзе пастух збірае статак, блізкі выпас) занатаваны лексічныя сінонімы: «пята́к», «кружа́ла», «вуго́н», «па́жа», «на́паля», «на́паль», «паста», «паства», «пасі́нне», «пасе́ба», «пашо́ба», «пашчо́ба», «пашчава́нне», «поле». Літаратурнае «выгін» (кругавы заварот ракі, калена) мае сінонімы: «за́вараць», «захі́н», «кручо́к», «выгіна́стасць», «лучо́к», «за́хісць», «вы́гіб».

Адна з каштоўнасцей працы Я. Яшкіна ў тым, што ён не толькі называе тую ці іншую геаграфічную назву, акрэслівае яе дакладнае абазначэнне, але па магчымасці шырока паказвае другія сінанімічныя словы.

У слоўніку маецца шмат геаграфічных адзінак, якія па сваім марфалагічным афармленні не супадаюць з літаратурнай будовай, хоць яны абазначаюць адзін і той жа геаграфічны аб'ект.

Кніга Я. Яшкіна «Беларускія геаграфічныя назвы» — яшчэ адно сведчанне пра багацце і невычарпальнасць народнай беларускай лексікі, пра словаўтваральныя сродкі, якія з'яўляюцца паказчыкам разнастайнасці і шматграннасці беларускай лексікі.

Кожная мова, у тым ліку і беларуская, развіваецца, узбагачаецца, папаўняючы свой лексічны склад новымі словамі. Адначасова некаторая частка слоў траціць сваю прадуктыўнасць ва ўжыванні і з цягам часу знікае, забываецца, альбо набывае зусім іншую семантыку, зусім іншую сэнсавую афарбоўку першапачатковага значэння. Гэты працэс вельмі яскрава відаць на прыкладзе геаграфічных назваў, якія найбольш устойліва захоўваюць сваё існаванне ў лексічнай сістэме мовы, з'яўляюцца помнікамі жыцця і побыту чалавека ў мінулым. Вось чаму добра, што аўтар, адначасова з сучаснай дыялектнай лексікай, шырока прыводзіць старабеларускія геаграфічныя назвы, захаваныя ў наш час. Вось некаторыя з іх: весь (населены пункт), ме́ста (частка горада, якая знаходзілася за сцяной замка, горад, мястэчка), дзядзі́нец (замчышча, дзе быў палац, панскі замак), дзядзі́на (дзедаўскае ўладанне, спадчынны маёнтак, паазямельная ўласнасць), плац (зямельны ўчастак у горадзе), пра́га (агароджа з жэрдзя з варотамі ў канцы вёскі, брама, веспічкі).

Праца Я. Яшкіна «Беларускія геаграфічныя назвы» — першая ў нашай літаратуры сістэматызуе вялікі тапанімічны матэрыял, сабраны на тэрыторыі Беларусі. Каштоўнасць яе бясспрэчная: яна будзе карысна і для географа, і для тапаніміста, у той ці іншай ступені можа быць выкарыстана і чытачамі іншых спецыяльнасцей.

Тым не менш у працы ёсць і недахопы. Думаецца, што аўтар зразумеў сваю задачу вельмі шырока і пры адборы матэрыялу для слоўніка змясціў многа назваў, якія не маюць непасрэднага дачынення ні да тапанімікі, ні да гідралогіі. Многія назвы могуць быць аб'яднаны, таму што яны, па сутнасці, абазначаюць адны і тыя ж геаграфічныя аб'екты.

Не заўсёды даюцца дакладныя тлумачэнні значэння геаграфічных назваў, а некаторыя зусім не тлумачацца. Напрыклад, «гарэ́шнік», «дзел», «гурда́н» і іншыя. Матэрыял для слоўніка збіраўся на ўсёй тэрыторыі Беларусі, гэта значыць, з усіх беларускіх гаворак. Вельмі добра было б таксама паставіць у кожнай геаграфічнай назве націск, таму што чытач не заўсёды можа правільна вымаўляць словы з рознымі дыялектнымі асаблівасцямі. Патрэбна адзначыць, што няма суразмернасці ў адборы матэрыялу па раёнах. Чамусьці ў найбольшай колькасці трапілі на старонкі назвы Слаўгарадскага раёна.

Аднак адзначаныя недахопы ні ў якім разе не зніжаюць каштоўнасці патрэбнай і карыснай працы.

М. СТЭЛЬМАХ.

У НАС У ГАСЦЯХ

Два тыдні ў сталіцы Беларусі знаходзіўся ленінградскі паэт Сяргей Макараў. Ён аўтар некалькіх паэтычных кніжак, шмат займаецца перакладамі з іншых братніх літаратур. Мэта яго прыезду ў Мінск—пазнаёміцца з маладой беларускай паэзіяй, падрыхтаваць падборку вершаў беларускіх паэтаў для часопіса «Аврора».

Наведаўшы рэдакцыю штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва», Сяргей Макараў пазнаёміў нас са сваімі вершамі. Некаторыя з іх мы прапануем вашай увазе ў перакладах Уладзіміра Наўлава.

Сяргей МАКАРАЎ

АЙЧЫНЕ

Ад Белага мора
Да Чорнага мора,
Айчына,
Ты выпіла
Горачка-гора.
Тваёй
Шматпакутлівай долі
Зрадні
І белыя ночы,
І чорныя дні.
Ды ратная слава твая,
Як быліна,
З палёў куліковых
Дайшла да Берліна.
Айчына,
Спаўна ты карала
Разбой!
...Жыццё маё ўсё—
Гэта
Стрэча з табой.

НЯЎДАЧА

Гэта ж сорам такі!
Нечаканы і поўны...
Месяц, зоры пабляклі
У небе бясхмарным...
Так,
Ён сёння
У хор
Не прыняты царкоўны.
Што ж,
Магчыма, і праўда
Шаляпін бяздарны?
Ноч, бяссонная ноч.
Зацяжная, нібыта зіма.
Ды надыйдзе світанак
І радасць разбудзіць,—
Быццам песня,
Якое пакуль што няма,
Быццам песня,
Якая усё-такі будзе!

ЛЯ РАКІ

Скончыўся выстужань,
сцяліся льды,—
Трэснулі глыбіны
чэрствай вады!
Ранневясенню—
пашана, прастор!
Знізу марозіць,
а зверху затор.
Стары селянін—
над ракою стаіць,
Прыжмурвае вочы,
і памяць бяжыць.
Халодныя пырскі
сігаюць з вады
Да познеасення
яго барады...

Экслібрысы работы Я. Ціхановіча.

ІСТОТНАЯ ГРАНЬ ТАЛЕНТУ

ЖЫВАПІСЦУ і графіку Яўгену Мікалаевічу Ціхановічу споўнілася 60 гадоў. Выхаванец Віцебскага мастацкага тэхнікума, член Саюза мастакоў БССР з часу яго заснавання, ён актыўна выступаў на выстаўках яшчэ ў перадваенныя гады.

Дыяпазон творчых пошукаў Яўгена Ціхановіча шырокі — ад манументальнага жывапісу да акварэлі, ад работы ў скульптуры і ў тэатры да кніжнай ілюстрацыі і станковай графікі. Шырока вядомы яго жывапісныя работы — перадваенны яшчэ «Партрэт лётчыка», пасляваенныя «Партызаны ў разведцы» і многія іншыя палотны.

Працуе Яўген Ціхановіч многа. Дастаткова сказаць, што персанальная выстаўка яго работ у Мінску 1963 года ўключала больш двухсот экспанатаў. Лепшыя з яго твораў неаднаразова паказваліся ў Маскве, у братніх рэспубліках краіны і за межамі СССР.

А ў апошнія гады мастак захапіўся так званай малой графікай — працаю ў галіне экслібрыса. І гэта — не выпадковае захапленне, не часовая нейкая перабежка ў «суседні» графічны цэх. Можна сказаць, што гэта істотны напрамак творчасці мастака.

Вось і цяпер у яго майстэрні можна пабачыць многа новых кніжных знакаў, іх чарнавых адбіткаў, эскізаў, распрацовак. А большасць створаных ім экслібрысаў разбегліся, як кажуць, па свеце.

Можа быць, каму здасца, што экслібрыс — гэта, маўляў, пэўная даніна пэўнай модзе. Не, роскві́т сучаснага беларускага экслібрыса — не даніна модзе, а прыкмета ўсведамлення ўсёй значнасці гэтай формы графікі для прапаганды прыгожага, для выказвання высакародных пачуццяў і значных ідэй. Усё, залежыць, як гаворыцца, ад пункту гледжання. А ў Яўгена Ціхановіча пункт гледжання на экслібрыс ясны.

У 1967 годзе ён выканаў першы экслібрыс у тэхніцы лінагравюры. За кароткі час ім створана больш ста экслібрысаў, арыгінальных па выкананні, цікавых па змесце. Не перастаючы працаваць у жывапісе, актывізаваўшыся ў галіне акварэлі, мастак стаў у той жа час адным з вядучых мастакоў беларускага экслібрыса.

Не так даўно, напрыклад, адбылася цікавая персанальная выстаўка экслібрысаў Яўгена Ціхановіча ў Магілёве. Так, сапраўды, экслібрыс — толькі адна грань ягонага таленту. Але — сёння можна ўжо смела сказаць — грань характэрная.

Маленькія эстампы такса́ма з усёй відавочнасцю сведчаць, што мастак трывала стаіць на рэалістычных пазіцыях, валодае выразным малюнкам, вынаходлівы ў кампаноўцы разнастайных сюжэтаў. І гэтыя яго маленькія графічныя лісты нясуць вялікую эстэтычную асалоду.

У кніжных знаках Яўгена Ціхановіча — матывы беларускага фальклору, нацыянальная арнаментыка, пейзажы роднага краю, разнастайныя праявы роднай культуры.

Мы любуемся мініяцюрнымі партрэтамі і Георгія Скарыны, і Янкі Купалы, і Якуба Коласа. У тэматыцы экслібрысаў мастака знайшло адлюстраванне гераічнае мінулае беларускага народа — сялянскае паўстанне пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага, гераічныя подзвігі партызан у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна мастак выканаў экслібрысы на ленінскую тэматыку для бібліятэк. Серыя знакаў прысвечана мастаком вялікім рускім пісьменнікам. Шмат цікавага ў экслібрысах Яўгена Ціхановіча для польскіх і нямецкіх сяброў з тэматыкай развіцця культуры і мастацтва Польшчы і Германіі.

За адзін толькі 1970 год мастак выканаў паўсотні кніжных знакаў. Лепшыя яго экслібрысы экспанаваліся на сусветнай выстаўцы ЭКСПО-70. Дванаццаць знакаў былі ўдастоены гонару быць паказанымі на першай Усесаюзнай выстаўцы экслібрыса ў Маскве.

Ленінград, Кіеў, Тула, Краснаярск, Адэса, Мінск, Магілёў — вось толькі частка «геаграфіі» кніжных знакаў Яўгена Ціхановіча, гэтых маленькіх паўпрэдаў нашай беларускай савецкай культуры.

Так, яны нясуць багатую і разнастайную інфармацыю ў свет пра родны край, пра родную культуру, гэтыя маленькія эстампы.

І вельмі радасна, што мастак, поўны сіл і творчай энергіі, так сур'ёзна ставіцца да гэтага роду зброі. Вельмі радасна, што ў яго багата новых творчых задум, звязаных з экслібрысам.

Цяпер, калі вы чытаеце гэтыя радкі,— можаце не сумняваццa: нараджаецца ў майстэрні мастака новы кніжны знак.

Некаторыя з яго новых экслібрысаў прапаную ўвазе чытачоў «Літаратуры і мастацтва». Спадзяюся, што яны спадабаюцца ім.

Н. ВЕЛІКАНАЎ.

Да 350-годдзя з дня нараджэння вялікага французскага драматурга Жана-Батыста Мальера народны тэатр мімікі і жэста Рэспубліканскага палаца культуры таварыства глухіх падрыхтаваў яго камедыю «Хітрыкі Скапэна». Рэжысёр-пастаноўшчык — заслужаная артыстка БССР Ю. Арончык. У галоўных ролях — швачка Дома мадэляў Л. Талмачова, канструктар аўтазавода А. Марошкін, мадэльшчык МТЗ А. Плужнікаў, фармоўшчык аўтазавода А. Хлёстаў і інш.

На здымку — сцэна са спектакля.

Фота Ул. ТКАЧЭНКІ.

ШТО пішуць ПРА НАС

«ЧАРОЎНАЯ ПРОЗА БЕЛАРУСАЎ»

Пад назвай «Буслы над балотамі» ў Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы выйшла ў свет анталогія беларускіх апавяданняў пад рэдакцыяй і з каментарыямі Норберта Рандава.

Адгукаючыся на выхад кнігі, літаратурны дадатак да газеты «Нойес Дойчланд» змясціў артыкул Эбергарда Гільшара «Чароўная проза беларусаў». Аўтар, у прыватнасці, піша:

«Томас Ман аднойчы сказаў: «Напэўна, першае і, бадай, адзінае патрабаванне да апавядальніка заключаецца ў тым, каб яго апавяданне было цікавым». У анталогіі, якая ляжыць перад намі, гэтае патрабаванне выканана ў шырокім сэнсе слова. У ёй прадстаўлены каля трыццаці аўтараў, творы якіх па-рознаму раскрываюць агульнасць іх светапогляду. Апавяданні прываблiваюць, захапляюць чытача, выклікаюць цікавасць. Мы пазнаём своеасаблівасць беларускай нацыянальнай літаратуры, якой у нас да гэтага часу надавалася недастаткова ўвагі.

Творчасць беларусаў зачароўвае народнай паэзіяй, вобразнасцю, шырокім паказам вясковага жыцця... Якуб Колас выяўляе тут сябе майстрам псіхалагічных сюрпрызаў, насычаных элементамі і камізму, і драматычнай вастрыні... Сярод твораў аб другой сусветнай вайне асаблівай увагі заслугоўвае сваімі напружанымі сюжэтамі проза Васіля Быкава.

Розныя тэмпераменты аўтараў, разнастайнасць мастацкіх сродкаў і праблематыкі — асноўная вартасць анталогіі. У ёй улічаны густ любога чытача...

Зноў і зноў тут усё гаворыць аб любві да мовы, да чалавека, да Радзімы».

Г. ЮШКЕВІЧ.

ПРА МАСТАЦТВА БРЭСТА

Артыкул на гэтую тэму змясціў польскі штотыднёвік «Камэна», які выходзіць у Любліне. Улетку там была наладжана выстаўка больш чым ста прац брэсцкіх мастакоў. «Экспазіцыя, —гаворыцца ў артыкуле,— прадстаўляла асноўныя кірункі творчых інтарэсаў мастакоў з-за Буга і яшчэ раз пераканала нас у моцных сувязях гэтага мастацтва з гісторыяй і сучасным жыццём грамадства».

У артыкуле разгледжаны працы І. Фяцісава, П. Данеліі, У. Каральчука, І. Рудчыка, М. Клімава, І. Крупскага.

ВОДГУК БРАЦІСЛАЎСКАЙ ГАЗЕТЫ

Славацкая газета «Праўда» змясціла рэцэнзію на апублікаваную ў часопісе «Неман» аповесць Ілы Ражкова «Чалавек з легенды» пра партызанскую дзейнасць Кірылы Арлоўскага. У рэцэнзіі падкрэсліваецца, што строга дакументальная аповесць з'яўляецца і белетрыстычнай.

У ПОЛЬСКІМ ЗБОРНІКУ

Польскі Дзяржаўны выдавецкі інстытут выпусціў зборнік выбраных апавяданняў савецкіх пісьменнікаў, дзе змешчаны апавяданні Валянціна Тараса «Дзіўная смерць» у перакладзе Ежы Фарына і Міхаіла Кацюшэнкі «Тыгрыца Кацька» ў перакладзе Вацлавы Камарніцкай.

...Адпойчы па сенажаці з боку Барысак прыехалі машыны з вайскоўцамі, пераправіліся цераз рэчку і спыніліся на полі, пад цяністай сцяной лесу.

Потым бор ля Арлянкі зараіўся людзьмі, якія гаварылі па-руску. Мітусіліся, як мурашкі. У хуткім часе сярод соснаў і ядлоўцу выраслі палаткі, задымелі палявыя кухні. Пачуўся стук сякер. У мяккую зямлю глыбока ўразаліся шырокія аўтамабільныя шыны.

Вестка пра гэта прыйшла ў Равіскі. Да Васі як, які цяпер больш трымаўся дому, прыбег Грышка з прапановай пабачыць гэта ўласнымі вачыма.

— Вы мужчына, гэта зусім іншае, жанчына — далікатнейшая, ёй трэба болей выгод.

— Нашы савецкія жанчыны загартаваныя.

Нягледзячы на гэтыя запэўненні Сашы, чым бліжэй было да поўдня, тым яна болей хвалявалася: ці спадабаюцца госці Равіскі і яе звычайная старая хата?

Урэшце на царкоўнай горцы паказаліся вазы, за якімі пільна сачылі збітыя ў чародку бабы.

На падводзе Камінскіх сядзела хударлявая кабета. З-пад страхі коратка астрыжаных льняных, як быццам пасыпаных попелам валасоў, уважліва глядзелі праніклівыя, блакітныя вочы. На каленях яна трымала хлопчыка, такога падобнага да Сашкі, што памыліцца было немагчыма — яго сын.

Камінскі без затрымкі павярнуў у свой двор.

— Дзень добры, дзень добры! Муж узрадуецца. Добра, што шчасліва прыехалі,— паспешліва гаварыла Камінская, каб схаваць збянтэжанасць, бо думала, што жонка Сашы павінна была выглядаць больш дарослай.

А вось дзіця было такое, якім яна яго ўяўляла. Яно ўсміхнулася ёй і даверліва працягнула ручкі. Жанчына ўзяла яго далікатна, прытуліла да грудзей і пацалавала як унучка.

— Хадзі, маленечкі, да бабы, хадзі,— паўтарала яна расчулена.

Варанцова звесіла з воза абутыя ў палатняныя туфлі ногі і спрытна саскочыла па зямлю.

Толькі цяпер Камінская ўпэўнілася, што кватарантка зусім не такая малая, як ёй здавалася, і не такая хударлявая.

— А чаму ты адразу не прывёз яе рэчы? — сказала Камінская да мужа.

Камінскі скрывіўся і, паказваючы канцом біча на невялічкі драўляны куфэрак, што ляжаў на саломе ў канцы воза, сказаў па-руску:

— Это всё.

Па твары маладой жанчыны, якая зразумела, пра што гаворка, праплыў гарачы румянец.

Камінская адкрыла рот, як быццам хацела нешта сказаць, але змаўчала, баючыся, каб не вырвалася яное-небудзь неразважлівае слова.

Але, уласна кажучы, яна і так нічога не сказала б, таму што разбрахаўся Барбос, які таксама захацеў падкрэсліць свой удзел у прывітаннях.

Дзіця спужалася і скрывілася ад плачу.

Ложак, культавы столік вярнуліся на свае месцы ў пакоі, а ўвечары Камінскія ледзь не пасварыліся паміж сабой.

Мужа беднасць кватарантаў здзівіла, а жонка гатова была абараняць іх нават, каб яны свайго ўласнага чыгунка не мелі.

— Маладыя, яшчэ абжыцца не паспелі,— гаварыла яна гарачым шэптам.

Перад вачыма стаяў яе ж уласны прыезд да мужа на возе, на якім найвялікшым скарбам была пярына, што з ласкі дала мачыха, хоць пер'е для яе наскубла яшчэ нябожчыца маці.

Хто ведае, магчыма гэтай рускай таксама не было каму даць пасаг. Можа, і яна сірата, але гэтага муж, відаць, не разумее.

— Беднасць — не ганьба.

— Ды і не слава...

— Ты, Аляксей, заўжды так: калі белае, то ты — чорнае, і наадварот. Няма ў цябе сэрца да людзей.

— Ды спі ты ўжо, не балабонь.

Пасля таго, як рускія абжыліся ў гарадку, а іх сем'і ў вёсках, у Равісках зрабілася весела, як ніколі раней. Дастаткова было, каб на захадзе сонца Федзя-Цырульнік сеў на парозе сваёй хаціны і запілікаў на гармоніку, як да яго цягнуліся маладыя і старыя, мясцовыя і рускія. Увесь яго разгароджаны і парослы буйнай травой двор запаўняла гаманлівая грамада.

І на Васю гук гармоніка дзейнічаў, як шпора на каня. Ён кідаў усё і часта, не чакаючы нават вячэры, імчаўся туды, не зважаючы на злосныя заўвагі бацькі наўздагон.

Маці ж, па натуры больш кампанейская за бацьку, не гаварыла нічога, яна заўжды разумела сына. Часам хлопцу нават думалася, што гэта радуе яе. Магчыма, таму, што верхаводзіў у Федзі-Цырульніка не хто іншы, як і кватарант.

Варанцоў па-за домам і службай выглядаў, як гарэзлівы юнак. Ён загадваў называць себя Сашам і гаварыць, на «ты». Старыя равісчане яшчэ з царскіх часоў прывыклі звяртацца адзін да аднаго па-бацьку і не маглі з гэтым згадзіцца. Але маладым такое падабалася, і неўзабаве яны былі з Сашкам пасябравалі. Акрамя таго, усе вельмі любілі яго за жарты. Вася ж падкупіў Сашку тым, што захапляўся яго сілай і расхвальваў яе перад усімі...

...Вясёлыя гутаркі былі толькі часткаю нікім не складзенай праграмы сустрэч у Федзі, самае галоўнае — спевы. Далёка і шырока пад летнім, зорным небам гучалі беларускія і рускія песні. Іх часта спявалі да поўначы. Вася саромеўся, не прымаў у спевах удзелу. Седзячы збоку, ён прагна прыслухоўваўся да моцнага і звонкага голасу Вольгі. Часам, калі яна брала высокую ноту, аж заплюшчваў вочы, заміраў. Тады адсюль са смехам крычалі:

— Бачыце, які мядзведзь — заснуў! Мішка прачніся, яшчэ ж не зіма!

Але вось аднойчы Вольга не з'явілася на зборышча і потым цэлы дзень яе не было. Аказалася, што моцна захварэла яе маці.

— Чаму не пазавеш Харытоніху? — спытаў Вася.

— Была шаптуха, пашаптала, дзесяць яек узяла і пайшла, а мама як плакала, так і плача,— Вольга адказала ціха, каб не чула маці.

— Тут патрэбен доктар,— нясмела прамармытаў Вася.

— Таго са Страбляў ужо няма, а з Бельска ні адзін не прыедзе, далёка,— сказала сумна Вольга.

— Паслухай, Волечка. А калі б я папрасіў Сашку, каб ён прывёз рускага доктара з Гарадка?

— Вася, а ты б сапраўды папрасіў? — спытала дзяўчына з радасным недаверам.

— Чаму ж бы і не?

Саша пасля першых Васіных слоў зразумеў у чым справа. Доктар у той жа дзень выслухаў хворую, прыпісаў неабходныя лекі.

Прыняўшы парашкі, хворая заснула.

Пасля адыходу абодвух рускіх (Сашка суправаджаў лекара), Вольга, якая да апошняй хвіліны не верыла, што ён прыйдзе, зрабілася да Васі вельмі ласкавай. Яна звярталася да яго «Васечка», і паддалася ўгаворам схадзіць на хвіліну да Федзі. Самае ж галоўнае ў тым, што яна дазволіла яму праводзіць сябе ў абодва бакі.

Вася так быў узрушаны, што не мог вымавіць слова. Ён задаволены, як не лящеў побач з ёю. Яна ўяўлялася яму яшчэ прыгажэйшай, чым звычайна, цібыта зрабілася прыгажэйшай дзяўчынай у вёсцы.

— Волечка, я для цябе зраблю ўсё, што толькі захочаш.

Вольга тут жа стала сур'ёзнай.

— Мне нічога не трэба,— паспешліва сказала яна і паскорыла крокі, бо яны ўжо былі блізка ад Максімюкоў.

Яна не хацела, каб іх бачылі разам.

Гэта яго не ўсхвалявала. Ён ведаў, што яна, быццам красавіцкая пагода — калі дождж, калі сонца.

Але да Федзі Вася ўжо не вярнуўся, хацеў быць адзін, каб яшчэ раз перажыць у думках усё. Кожнае слова і кожны жэст дзяўчыны, якая ўсё мацней западала ў яго сэрца.

Марыя ШУЛЕЦКАЯ

ЯНЫ ПРЫЙШЛІ З УСХОДУ

Раман польскай пісьменніцы Марыі Шулецкай «Стаптаная зямля» — расказ пра жыхароў беларускай вёскі Равіскі, што на Беласточчыне, дзе да вайны дзейнічала ячэйка камуністычнай партыі. У часе вайны гэтую вёску напаткаў лёс, як нашу Хатынь,— яна была ўшчэнт знішчана фашысцкімі захопнікамі.

Пра задуму рамана пісьменніца гаворыць наступнае:

«Чаму я, варшавянка, пішу пра Беласточчыну?

Бо гэта — мая любоў з «першага погляду». Летам 1956 года паехала я збіраць матэрыялы для рэпартажу пра вёску Равіскі, якая ў павеце Бельск Падляскі. Меркавала, што гэта будзе толькі чарговая журналісцкая паездка. Між тым, па дарозе ўжо зачаравала мяне сумная прыгажосць гэтай зямлі, а на месцы — і людзі, незвычайна шчырыя і добразычлівыя.

З вуснаў чатырнаццацігадовай дзяўчынкі пачула я жахлівую гісторыю гэтай вёскі і яе ваколіц. Потым гэта пацвердзілі дарослыя, і вось так з'явіўся рэпартаж «Аня Матэнька расказвае». Але, не зважаючы, што ён быў даволі вялікі і больш «літаратурны» за ўсе іншыя, якія я напісала, у мяне застаўся нейкі наспакой і творчае незадавальненне.

Змагалася я з гэтым пачуццём паўгода, ажно аднойчы зразумела, уявіла сабе, што не пазбаўлюся яго, пакуль не напішу на гэтую тэму чагосьці больш сур'ёзнага»...

Прапануем увазе чытачоў урывак з рамана ў перакладзе П. Стэфановіча.

Пайшлі яны нібыта на раку па рыбу для хворай Максімючыхі, загадзя ведаючы, што рака яшчэ дыхае вясеннім холадам і пустэчай.

Вярнуліся з навіной, што савецкія салдаты будуюць сабе ў лесе пастаянныя кватэры — «Красный Городок»: вялізныя зямлянкі, склады, нават лазню, да якой ваду правялі па трубах з рэчкі.

Камандзіры, што на першы позірк нічым не адрозніваліся ад звычайных салдатаў, размясціліся ў мужыкоў з суседніх вёсак. У Камінскіх пасяліўся старшы лейтэнант Аляксандр Сцяпанавіч Варанцоў, каржакаваты, невысокі, з шырокім татарскім тварам, рыжаваты і блакітнавокі, як звычайна рускія. Ён асабліва прыйшоўся да спадобы Камінскай, галоўным чынам — сваім гумарам.

— Афіцэр, а зусім як чалавек,— гаварыла яна суседкам, здзіўленая і ўзрадаваная.

У іншых хатах людзі, якія помнілі, як пры Польшчы звычайны паліцэйскі задзіраў нос і загадваў нізка кланяцца, не маглі надзівіцца, чаму савецкія афіцэры такія простыя і сардэчныя.

Праз некалькі тыдняў пачалі прыязджаць да вайскоўцаў сем'і. Варанцоў чакаў жонку Надзю і сына Андрэя.

Да іх прыезду Камінская навяла ў хаце і ў двары як не велікодны парадак. З прызначанага Варанцовай пакою выкінула стары, сточаны шашалем ложак і культавы столік, выпаравала лугам падлогу і паставіла малады фікус.

Камінскі, разлаваны, што ў сенакос мусіць ехаць у Бельск на станцыю па кватарантку і яе рэчы, глядзеў на гэта спадылба і бурчаў на жонку, каб лепей заняла поўным пустазелля агародам.

— Тым, з чаго хлеб ясі,— закончыў ён сваёй улюбёнай прымаўкай.

— Едзь, едзь, не марудзь! — падганяла яго Камінская.

Напярэдадні яна спрабавала выпытаць у Сашы пра густы і звычаі жонкі.

Скеміўшы, у чым справа, Саша расмяяўся і сказаў:

— Мая Надзя — просты чалавек, клопатаў вам з ёй не будзе.

— Гарадская ды вучоная, як жа ёй тут жыць з намі? — непакоілася гаспадыня.

— А вось я жыву, і мне тут добра, як у роднай маці.

Сашкі, што памыліцца было немагчыма — яго сын.

Камінскі без затрымкі павярнуў у свой двор.

— Дзень добры, дзень добры! Муж узрадуецца. Добра, што шчасліва прыехалі,— паспешліва гаварыла Камінская, каб схаваць збянтэжанасць, бо думала, што жонка Сашы павінна была выглядаць больш дарослай.

А вось дзіця было такое, якім яна яго ўяўляла. Яно ўсміхнулася ёй і даверліва працягнула ручкі. Жанчына ўзяла яго далікатна, прытуліла да грудзей і пацалавала як унучка.

— Хадзі, маленечкі, да бабы, хадзі,— паўтарала яна расчулена.

Варанцова звесіла з воза абутыя ў палатняныя туфлі ногі і спрытна саскочыла па зямлю.

Толькі цяпер Камінская ўпэўнілася, што кватарантка зусім не такая малая, як ёй здавалася, і не такая хударлявая.

— А чаму ты адразу не прывёз яе рэчы? — сказала Камінская да мужа.

Камінскі скрывіўся і, паказваючы канцом біча на невялічкі драўляны куфэрак, што ляжаў на саломе ў канцы воза, сказаў па-руску:

— Это всё.

Па твары маладой жанчыны, якая зразумела, пра што гаворка, праплыў гарачы румянец.

Камінская адкрыла рот, як быццам хацела нешта сказаць, але змаўчала, баючыся, каб не вырвалася яное-небудзь неразважлівае слова.

Але, уласна кажучы, яна і так нічога не сказала б, таму што разбрахаўся Барбос, які таксама захацеў падкрэсліць свой удзел у прывітаннях.

Дзіця спужалася і скрывілася ад плачу.

Ложак, культавы столік вярнуліся на свае месцы ў пакоі, а ўвечары Камінскія ледзь не пасварыліся паміж сабой.

Мужа беднасць кватарантаў здзівіла, а жонка гатова была абараняць іх нават, каб яны свайго ўласнага чыгунка не мелі.

— Маладыя, яшчэ абжыцца не паспелі,— гаварыла яна гарачым шэптам.

Перад вачыма стаяў яе ж уласны прыезд да мужа на возе, на якім найвялікшым скарбам была пярына, што з ласкі дала мачыха, хоць пер'е для яе наскубла яшчэ нябожчыца маці.

Хто ведае, магчыма гэтай рускай таксама не было каму даць пасаг. Можа, і яна сірата, але гэтага муж, відаць, не разумее.

— Беднасць — не ганьба.

— Ды і не слава...

— Ты, Аляксей, заўжды так: калі белае, то ты — чорнае, і наадварот. Няма ў цябе сэрца да людзей.

— Ды спі ты ўжо, не балабонь.

Пасля таго, як рускія абжыліся ў гарадку, а іх сем'і ў вёсках, у Равісках зрабілася весела, як ніколі раней. Дастаткова было, каб на захадзе сонца Федзя-Цырульнік сеў на парозе сваёй хаціны і запілікаў на гармоніку, як да яго цягнуліся маладыя і старыя, мясцовыя і рускія. Увесь яго разгароджаны і парослы буйнай травой двор запаўняла гаманлівая грамада.

І на Васю гук гармоніка дзейнічаў, як шпора на каня. Ён кідаў усё і часта, не чакаючы нават вячэры, імчаўся туды, не зважаючы на злосныя заўвагі бацькі наўздагон.

Маці ж, па натуры больш кампанейская за бацьку, не гаварыла нічога, яна заўжды разумела сына. Часам хлопцу нават думалася, што гэта радуе яе. Магчыма, таму, што верхаводзіў у Федзі-Цырульніка не хто іншы, як і кватарант.

Варанцоў па-за домам і службай выглядаў, як гарэзлівы юнак. Ён загадваў называць себя Сашам і гаварыць, на «ты». Старыя равісчане яшчэ з царскіх часоў прывыклі звяртацца адзін да аднаго па-бацьку і не маглі з гэтым згадзіцца. Але маладым такое падабалася, і неўзабаве яны былі з Сашкам пасябравалі. Акрамя таго, усе вельмі любілі яго за жарты. Вася ж падкупіў Сашку тым, што захапляўся яго сілай і расхвальваў яе перад усімі...

...Вясёлыя гутаркі былі толькі часткаю нікім не складзенай праграмы сустрэч у Федзі, самае галоўнае — спевы. Далёка і шырока пад летнім, зорным небам гучалі беларускія і рускія песні. Іх часта спявалі да поўначы. Вася саромеўся, не прымаў у спевах удзелу. Седзячы збоку, ён прагна прыслухоўваўся да моцнага і звонкага голасу Вольгі. Часам, калі яна брала высокую ноту, аж заплюшчваў вочы, заміраў. Тады адсюль са смехам крычалі:

— Бачыце, які мядзведзь — заснуў! Мішка прачніся, яшчэ ж не зіма!

Але вось аднойчы Вольга не з'явілася на зборышча і потым цэлы дзень яе не было. Аказалася, што моцна захварэла яе маці.

— Чаму не пазавеш Харытоніху? — спытаў Вася.

— Была шаптуха, пашаптала, дзесяць яек узяла і пайшла, а мама як плакала, так і плача,— Вольга адказала ціха, каб не чула маці.

— Тут патрэбен доктар,— нясмела прамармытаў Вася.

— Таго са Страбляў ужо няма, а з Бельска ні адзін не прыедзе, далёка,— сказала сумна Вольга.

— Паслухай, Волечка. А калі б я папрасіў Сашку, каб ён прывёз рускага доктара з Гарадка?

— Вася, а ты б сапраўды папрасіў? — спытала дзяўчына з радасным недаверам.

— Чаму ж бы і не?

Саша пасля першых Васіных слоў зразумеў у чым справа. Доктар у той жа дзень выслухаў хворую, прыпісаў неабходныя лекі.

Прыняўшы парашкі, хворая заснула.

Пасля адыходу абодвух рускіх (Сашка суправаджаў лекара), Вольга, якая да апошняй хвіліны не верыла, што ён прыйдзе, зрабілася да Васі вельмі ласкавай. Яна звярталася да яго «Васечка», і паддалася ўгаворам схадзіць на хвіліну да Федзі. Самае ж галоўнае ў тым, што яна дазволіла яму праводзіць сябе ў абодва бакі.

Вася так быў узрушаны, што не мог вымавіць слова. Ён задаволены, як не лящеў побач з ёю. Яна ўяўлялася яму яшчэ прыгажэйшай, чым звычайна, цібыта зрабілася прыгажэйшай дзяўчынай у вёсцы.

— Волечка, я для цябе зраблю ўсё, што толькі захочаш.

Вольга тут жа стала сур'ёзнай.

— Мне нічога не трэба,— паспешліва сказала яна і паскорыла крокі, бо яны ўжо былі блізка ад Максімюкоў.

Яна не хацела, каб іх бачылі разам.

Гэта яго не ўсхвалявала. Ён ведаў, што яна, быццам красавіцкая пагода — калі дождж, калі сонца.

Але да Федзі Вася ўжо не вярнуўся, хацеў быць адзін, каб яшчэ раз перажыць у думках усё. Кожнае слова і кожны жэст дзяўчыны, якая ўсё мацней западала ў яго сэрца.

СУСТРЭЧА З БАЙЦАМІ ПАРАДКУ

Пазаўчора клуб Саюза пісьменнікаў БССР выглядаў незвычайна — яго запоўнілі людзі ў міліцэйскіх мундзірах, работнікі Міністэрства ўнутраных спраў рэспублікі. І хоць былі даклады і выступленні, усё ж атмасфера спаткання была далёкай ад афіцыйнасці. Гэта быў сяброўскі вечар людзей, для якіх аднолькава блізкімі сталі маральныя праблемы сучаснасці, пытанні выхавання грамадзяніна.

Вечар адкрыў пісьменнік Аляксандр Міронаў. Ён гаварыў пра адлюстраванне гэтай высакароднай тэмы ў творчасці нашых пісьменнікаў, пра ўдзел іх у конкурсе «Мая міліцыя». Пра гістарычны шлях органаў міліцыі і іх паўсядзённую гераічную працу расказаў міністр унутраных спраў рэспублікі А. Клімаўской.

А потым выступалі прадстаўнікі розных «спецыяльнасцяў» міліцыі — кіруючыя работнікі Міністэрства В. Піскароў, А. Грыгор'еў, Ю. Шабуневіч, В. Азерскі, В. Сасім, У. Кудаленкін, І. Лашанкоў, У. Курачкін, Б. Дзяргай.

Пісьменнікі падарылі работнікам Міністэрства ўнутраных спраў бібліятэчку сваіх кніг. А ў заключэнне вечара прысутныя з прыемнасцю пазнаёміліся з мастацкай самадзейнасцю міліцыі.

У НАШЫМ ДОМЕ — МУЗЫЧНАЕ СВЯТА

За акном мароз, а ў калідорах Мінскай музычнай школы — нібы расцвіла вясна. Маладосць, натхненне, усхваляванасць сышліся разам і напоўнілі залу незвычайным пачуццём аднаўлення, узрушанасці, якое прыходзіць з вясной. Сёння ў гэтым доме — свята. Свята талентаў, свята музыкі.

Раз у чатыры гады ў Мінск з'язджаюцца музыканты і спевакі з усёй рэспублікі, каб прыняць удзел у конкурсе выканаўцаў. Сёлета іх 59. Гэта навучэнцы Брэсцкага і Віцебскага музычных вучылішчаў, студэнты кансерваторыі, вучні Мінскай спецыяльнай музычнай школы, салісты філармоніі, харавой капэлы БССР, артысты аркестра Беларускага радыё і тэлебачання. Рэспубліканскі конкурс — гэта толькі першая прыступка на шляху да міжрэспубліканскага ў Вільнюсе. У лістападзе ж адбудзецца міжнародны конкурс піяністаў у Мінску.

Майстэрства выканання піяністаў, скрыпачоў, віяланчэлістаў будзе ацэньваць журы, якое ўзначальваюць вядомыя музыканты краіны: прафесар Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі Я. Мільштэйн (конкурс піяністаў), народная артыстка СССР Л. Александроўская (конкурс вакалістаў), дацэнт Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі Т. Гайдамовіч (конкурс скрыпачоў і віяланчэлістаў).

Вось што яны гавораць:

Л. АЛЕКСАНДРОЎСКАЯ:

— Гэты конкурс — праверка і зацвярджэнне нашай нацыянальнай, нашай савецкай музычнай культуры. У той жа час ён з'явіцца праверкай духоўных сіл, умення дастойна трымаць сябе ў час выпрабаванняў, пераадольваць цяжкасці. Гэта цяжкі, але адказны крок на вялікім шляху. Няхай ён будзе плённым.

Тут жа, у зале музычнай школы адбылася жараб'ёўка. А вечарам у зале філармоніі пачаліся канцэрты. Агляд музыкантаў-выканаўцаў працягнецца з 25 студзеня да 5 лютага.

Я. МІЛЬШТЭЙН:

— Што можна сказаць у самым пачатку конкурсу? Тое, што ён з'явіцца добрай школай для ўсіх выканаўцаў. І нягледзячы на тое, што мы павінны адабраць толькі трох самых лепшых, па ім не будзе пераможаных. Удзел у конкурсе — гэта крок у вялікае майстэрства.

Т. ГАЙДАМОВІЧ:

— Нідзе так не мужнее талент, як у барацьбе. А конкурс — гэта барацьба. Гэта адпачынак, якое можна параўнаць толькі з тым, якое прыходзіць да нас вясной. Магу запэўніць, што журы конкурсу будзе аб'ектыўным, добрым і ўважлівым.

ВЯСЁЛАЯ ТРАСЯНКА

ЖАРТЫ, ГУМАРЭСКІ, ПАРОДЫІ, ЭПІГРАМЫ, ШАРЖЫ

Рыгор ЯЎСЕЕЎ

ПАЗВАНОЧНІК

Я ў начальніка — памочнік,
І ў яго ёсць пазваночнік,
І ў мяне ёсць пазваночнік.
Ды ў Пятровіча, браткі,
Пазваночнік не такі.
Націраў яму не раз
Пазваночнік,
Плечы,
Таз...
Ці у душ ён, ці на пляж —
З ім заўжды раблю вяаж.
Пазваночнік, верце мне,
У яго куды мацней!
Пазваночнік — клічнік нібы.
Не заўважылі вы хіба?
А ў мяне, нібы пытальнік,
Дужа гнецца пазваночнік,
Малайчына наш начальнік,
Галава!
А я —памочнік..,

АДНОЙЧЫ АПАЎНОЧЫ

Да суседкі пад акно аднойчы
Падышоў гармонік апаўночы.
Заліваўся,
Пеў ён галасіста,
То самотна крыху,
То ўрачыста.
Падышла гітара, а за ёю...
Выйшла і Агата з чапялою.

Дробнае хуліганства

З АПАВЯДАННЯЎ ДЗЕДА НІЧЫПАРА

НАДОЕЧЫ мне стукнуў сёмы дзесятак. Пажыў, як бачыце, на белым свеце даволі, шмат чаго бачыў, здараліся і смешныя гісторыі на вяку, і недарэчныя; ды ўсё сыходзіла з рук, а тут на табе—дробнае хуліганства прыпісалі... Крыўдна старому чалавеку насіць паганую мянушку—хуліган. І каб хоць у чым вінаваты быў. Вось памяркуйце самі.

Павёз я з жонкай Агатай кабанчыка на рынак. Пастаяў мо з гадзіну, і купец падвярнуўся — Панас Нупрэеў з суседняй вёскі. Доўга не таргуючыся, мы стукнулі па руках — ды ў шынок, цьфу ты, у закусачную. Сядзім, балакаем. І тут Агата прышёрлася.

— Ах ты, стары блазен, каб ты смалы напіўся, — пераступіўшы парог, пачала яна мяне спавядаць.

— Чаго ты заводзішся, старая качарэжка, — агрызнуўся я, — Панас вось магарыч паставіў.

— Ведаю я твае магарычы, — напірала яна, — прапойца горкі. Пайшлі, машына чакае.

— Іду, іду, толькі перастань спавядаць.

Агата нагамзіла, пагамзіла і знікла, а мы з Панасам спакойна працягвалі сваю справу.

Надвячоркам, калі сонца можна дастаць качаргой, вывалілі мы з шынка, ну, з закусачнай. Кірмашная плошча апусцела.

Усе паехалі. Балазе, спадарожка падвярнулася. Хведар Сымонішын труну забіраў — памёр стары Адась, сусед мой, добры быў чалавек. Галаснуў я і палез у кузаў — у кабіне сядзела нейкая маладзіца, дастаў капшук, закурыў.

І толькі выехалі за горад, задурболіў дождж. Я, доўга не раздумваючы, шась у труну, накрыўся. А што ж мокнуць? Чую, машына адзін раз спынілася, другі, трэці. Відаць, Хведар падбірае людзей. Паляжаў я мо з паўгадзіны, потым падняў вечка, працягнуў руку і спытаў:

— Што, дождж перастаў?

— А, божухны! — закрычаў хтосьці.

Бабы, нібы козы, кінуліся на ўцёкі з машыны... А мне за дробнае хуліганства далі пятнаццаць сутак. А які ж я хуліган, людзі добрыя?

Запісаў
В. ГРЫНКЕВІЧ.

КАЛЮЧЫЯ РАДКІ

«ДОБРЫ ЛЕКТАР»

На пытанне адказаў:
Я не ведаю, маўляў...
Добры лектар,
Толькі вось
Так адказвае ён
Скрозь.

ГЕРОЙ

— Глядзі, які ён стаў смяльчак!
З ім жа гаворыць важная пярсона...
— А ён з усімі так,
Калі ля тэлефона.

М. НАВІЦКІ.

ПАПЛАВОК

Патрабаваў ён глыбіні,
А ў самога яе... ні-ні.

Г. ЗАХАРЭНКА.

СПАЧУВАННЕ

Прыехалі пажарнікі тады,
Як галавешкі ўжо адны дымілі,
Паспачувалі: «Не было б бяды,
Каб нам наперад пазванілі».

М. КУЛІНКОВІЧ.

Станіслаў ШУШКЕВІЧ

А ЎЖО ЦЁМНА СТАЛА Ў ЛЕСЕ

Я хадзіла мшыстым лесам
Памаленечку,
І знайшла на пні старэнькім
Грыб-апенечку.

Ды куды ж мне яго несці!
З кім параіцца!
А ўжо цёмна стала ў лесе,
Бо змяркаецца.

Прыйдзі, мілы! Прыйдзі, родны,
На паляначку,
Падняслі мой кош дадому,
Аж да ганачку.

Я ж хадзіла мшыстым лесам,
Ды стамілася,
Без цябе, мой родны, любы,
Заблудзілася.

МІМАХОДЗЬ

П. ШЫБУТ.

Гаварыў трапна, але неўпапад.

□

На голым полі добра растуць футбалісты.

□

Трэба мець не абы які талент, каб сыграць у спектаклі ролю дурня.

□

Атэіст да жонкі: «Анёл ты мой нябесны!»

Ул. РУДЗІНСКІ

Бегуну забаранілі выступаць у спаборніцтвах — захварэў на манію праследавання.

□

Генерал любую сваю лінію лічыў генеральнай.

□

«Каб табе пуста было!» — часам найлепшае пажаданне аматару даміно.

С. КУХАРЧУК

Лаканічнасць — сястра таленту. Дык чаму ж так мала творцаў хоча быць у сваяцтве з талентам?

□

Іншы раз і лісу аказваюць мядзведжую паслугу.

М. ШЛЯФЕР

Мемуарысту не шанцавала: успомніць — забудуць, забудзе — успомняць.

□

Вершы маладога паэта былі настолькі баязыя і задзірлівыя, што ў рэдакцыі іх сустрэлі ў штыкі.

□

Ёсць прафесіі, для авалодання якімі трэба нястомна працаваць над сабой. Напрыклад, электраманцёр.

□

Ежа са слановай косці.

І. БАРКОЎ

Такі быў прагны, што нават шкадаваў солі на чужую рану.

□

Ад злосці дурняў яго ўратавала тое, што прыкінуўся ёлупам.

А. ПРАНІШНІКАЎ

Геніем чалавек можа і не быць. А геній — чалавекам?

Р. ЛАЗУРКІН

У рамане было столькі прафесіяналізмаў, што яго рэкамендавалі вучэбным дапаможнікам для прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў.

□

Да гаруча-змазачных матэрыялаў адносіў і гарэлку, яна можа гарэць і часам падмазваць.

меган

Здарэнне

ПЕРШЫ РАЗ жаночы голас на другім канцы провада сказаў мне:

— На жаль, сёння нічога не выйдзе. Мы сустрэцца не зможам.

— Не зможам, — паўтарыў я аўтаматычна. — Гэта нейкае непаразуменне.

— Зусім не, — адказала жанчына. — Сёння я сапраўды не магу.

— Не, дык не, — згадзіўся я.

Гэта прагучала, мабыць, даволі холадна, бо голас у трубцы нібыта крыху занепакоіўся.

— Не крыўдуйце без прычыны, — сказала жанчына. — Я пазваню праз пару дзён і ўсё вытлумачу.

— Сумняваюся, — адказаў я, бо мне здавалася мала праўдападобным, каб паміж намі магла адбыцца наступная гутарка. Аднак я памыліўся. Праз тыдзень яна зноў мне пазваніла.

— Мне страшэнна непрыемна, — сказала яна, — але так здарылася, што, на жаль...

— Сустрэціца мы не зможам, — адгадаў я.

— Не зможам, — сказала жанчына. — Толькі не бярыце гэтага блізка да сэрца.

Я паабяцаў захаваць спакой і на гэтым гутарка скончылася.

Трэцяя размова мяне здзівіла і ўразіла.

— Учора было цудоўна, — сказаў голас. — Але сёння ўвечары я не прыйду. Ты злуешся?

— Не, — адказаў я, суцяшаючы яе. Мы былі ўжо на ты, і я меў права меркаваць, што нас звязвае нешта большае, чым простае знаёмства. Пасля некалькіх тэлефонных званкоў я ў гэтым ужо не сумняваўся. Яна была лаканічная, але некалькі разоў вымусіла мяне нават пачырванець. Я зрабіў для сябе вывад, што дзякуючы пашкоджанаму тэлефону нас спалучаюць нейкія дзівосныя сувязі. Апарат злучаў мяне з ёй толькі тады, калі ў яе не было часу, а калі ў яе быў час, то злучаў з нумарам патрэбным ёй. Аднак гэта пачынала мяне нерваваць. Апошні званок мяне абрадаваў.

— Мне трэба пяць тысяч злотых, — сказала яна. — Ты можаш мне іх даць?

— Вядома, — адказаў я. — З найвялікшай прыемнасцю.

— Дык я зараз жа буду ў цябе.

Я паклаў трубку і хвіліну пятнаццаць сядзеў вельмі задаволены.

І раптам над дзвярыма зазваніў званок.

З польскай пераклаў
Уладзіслаў СТРУМІЛА.

По тэхнічных умовах унутраныя восем старонак газеты друкуюцца і выпускаюцца асобна ад васьмі знешніх. Атрымаўшы або набыўшы газету, укладзіце ўнутраныя аркушы ў знешнія.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Адрас рэдакцыі: Мінск, вул. Захарэва, 19.

Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі—33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—33-25-25, адказнага сакратара—33-44-04, аддзела літаратуры—33-22-04, аддзела тэатра, кіно і музыкі—33-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-24-62, аддзела публіцыстыкі — 33-24-62, аддзела культуры—33-21-33, выдавецтва —32-22-19, бухгалтэрыі—32-15-87.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Л. Я. ПРОКША.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, А. С. ГРАЧАНІКАЎ, Ю. П. ГРЫГОР'ЕЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

20 Індэкс 63856 АТ 01541